Проф. Др. Я. СТАНКЕВІЧ

ПАДРУЧНІК
КРЫВІЦКАЕ (БЕЛАРУСКАЕ) МОВЫ

ГРАМАТЫКА, ПРАВАПІС, УКЛАДАНЬНІ

ПРЫТАРНАВАНЫЯ ВУЧЫЦЦА Ў ШКОЛЕ Й ДОМА

ЧАСЬЦЬ І—ІІІ.

KRIVIAN (WHITERUTHENIAN) GRAMMAR

РЭҐЕНСБУРҐ 1947

Др. Я. СТАНКЕВІЧ

ПАДРУЧНІК
КРЫВІЦКАЕ (БЕЛАРУСКАЕ) МОВЫ

ГРАМАТЫКА, ПРАВАПІС, УКЛАДАНЬНІ

ПРЫТАРНАВАНЫЯ ВУЧЫЦЦА Ў ШКОЛЕ Й ДОМА

ЧАСЬЦЬ I—III.

KRIVIAN (WHITERUTHENIAN) GRAMMAR

1946

Permitted by UNRRA Team 120

Технічними засобами Видавничої С-ки „Українське Слово“

Druck: Mittelbayerische Zeitung, Regensburg

ЧАСЬЦЬ I.

СКЛАДЫ, ГУКІ Й ЛІТАРЫ

RAŽDZIEŁ I.

§ 1. Kiryličnaja abecada

Łaciničnyja litary. Prykłady.	Кірылічныя літары. Прыклады.
a	а
o	о
b baba	б баба
d do!	д до!
k	к
v voka	в вока
a vada	а вада
(suhuk +) ia biada	я бяда
ja jada	я яда
m jama	м яма
s sad	с сад
ś kośka, kaśba	сь коська, касьба
š koš	ш кош
r rak	р рак
t kot	т кот
n nos	н нос
ń koń	нь конь
h had, hod	г гад, год
l bol, bolka	ль боль, болька
ł koł	л кол
p šapka	п шапка
c caca, pac	ц цаца, пац
ć baćka	ць бацька
č čad, čapiała	ч чад, чапяла
e cep, cebar	э цэп, цэбар
(suhuk +) ie ciesta	е цеста
je jedki, jem	е едкі, ем
ch chata	х хата
i bić	і біць
j boj	й бой
y syn	ы сын
o moda, nos	о мода, нос

(suhuk +)	io miod, nios	ё мёд, нёс
	jo jon, jość	ё ён, ёсьць
	u dub	у дуб
(suhuk +)	iu ciućka	ю цюцька
	ju juška	ю юшка
	ŭ staŭ, doŭh	ў стаў, доўг
	z zara	з зара
	ź raźmin	зь разьмін
	ž žyta	ж жыта
	dz dzyn!	дз дзын!
	dž chadžu	дж хаджу
	g	ґ
	f	ф

§ 2. Гукі й літары.

У кажным слове ё гукі, прыкладам, у слове **рука** чатыры гукі — р-у-к-а. Дзеля абазначаньня гукаў на пісьме прыдуманы апрычоныя значкі, званыя л і т а р а м і. Усі літары, ужываныя ў якой мове, складаюць альфабэт або абэцаду тае мовы.

У Крывічаў ёсьцека дзьве абэцады: свая крывіцкая, званая яшчэ кірыліцаю, і абэцада лацінічная. Лацінічная абэцада ўзята з мовы лацінскае і прытарнавана да гукаў мовы крывіцкае, дзеля таго яна завецца **крывіцкай лацініцаю.** А кірыліца — гэта гістарычная абэцада крывіцкая.

Кірылічная абэцада з парадку.

Літары друкаваныя малыя:	вялікія:	Літары друкаваныя малыя:	вялікія:
а	А	з	З
я	Я	дз	ДЗ
б	Б	ж	Ж
в	В	дж	ДЖ
ґ	Ґ	і	І
г	Г	й	Й
х	Х	ы	Ы
д	Д	к	К
э	Э	л	Л
е	Е	м	М

н	Н	у	У
о	О	ў	Ў
ё	Ё	ю	Ю
п	П	ф	Ф
р	Р	ц	Ц
с	С	ч	Ч
ш	Ш	ь	Ь
т	Т		

Лацінічная абэцада з парадку.

Літары друкаваныя малыя:	Літары друкаваныя вялікія:	Літары друкаваныя малыя:	Літары друкаваныя вялікія:
a	A	n	N
b	B	ń	Ń
c	C	o	O
ć	Ć	p	P
č	Č	r	R
d	D	s	S
e	E	ś	Ś
f	F	š	Š
g	G	t	T
h	H	u	U
ch	CH	ŭ	Ŭ
i	I	v	V
j	J	z	Z
y	Y	dz	DZ
k	K	ź	Ź
l	L	dź	DŹ
ł	Ł	ž	Ž
m	M	dž	DŽ

§ **3.** Гукі **дз** й **дж** абазначаюцца дзьвюма літарамі.

Перапішы й падчыркні гук **дз**.

У нядзелю дзеці пайшлі ў лес. Дзядзька папеpазаўся дзягай. Дзёмка й Дзяніс дзерлі карэньне. Дзевяць ды адзін будзе дзесяць. Багаты дзівіцца, чым мізарак жывіцца, а бедны сьмяецца,

дзе ў багатага дзяецца. Дзяцюкі ладзілі ігрышча. Дзік вядзецца ў лесе. Дзяўчаты былі ў садзе. Дзядуля садзіў ігрушу.

Перапішы й падчыркні гук **дж.**

Раджу вам вучыцца. Гляджу, ці ўсё ўладжана. У гародчыку пасаджаны краскі. Не перашкаджайце людзём у рабоце. Я не заблуджу ў лесе. Сад абгароджаны тынам. Наймітка на год згоджана. Памідоры рассаджаны на грады.

Выяжджае сын Даніла ды на Русь на вайну. Конь уежджаны. Бражджолка бражджыць. У краме прадавалі дрожджы. Сёлета лета дажджлівае. Дажджавая вада мяккая. Ідзі, ідзі, дожджу, я навару брожджу.

Прыдумай і напішы колькі проказяў, або 5 словаў із гукам **дж.**

РАЗЬДЗЕЛ II.

Гукі й склады.

§4. Склады. Словы дзеляцца на склады. Гэтак, у слове »вада« два склады — **ва - да,** у слове »галава« тры склады — **га - ла - ва,** у слове »верацяно« чатыры склады — **ве - ра - ця - но.** Есьцека й словы з адным складам, прыкладам, дом, стол. Склад вымаўляецца адным дыхам. Слова, маючае адзін склад, завецца аднаскладным, два склады — двускладным, тры склады — трыскладным і шмат (многа) складоў — шматскладным, або многаскладным.

§ 5. Гукі. Склады, а значыцца й словы, можам падзяліць на гукі. Гэтак, у слове »нага« чатыры гукі — н - а - г - а, у слове »рот« — 3 гукі, »на!« мае два гукі, »г - а?« — таксама два гукі, **а** — адзін гук.

Самагукі. Адныя гукі можам лёгка цягнуць, пяяць, гэта будуць: а, э, о, у, ы, і. Таковыя гукі завуцца самагукамі.

Паўсамагукі. Гукі **ў** (роў) і **й** (лой) завуцца паўсамагукамі.

Сугукі. Усе засталыя гукі — б, в, ґ, г, х, д, з, дз, ж, дж, к, л, м, н, п, р, с, ш, т, ф, ц, ч — завуцца сугукамі. Іх без самагукаў пяяць нельга.

У складзе бывае адзін самагук і адзін ці балей сугукаў. У некаторых складох побач із самагукам, а рэдчас (часамі) із

адным і балей сугукамі, бывае паўсамагук (ой, рой, доўг). Кольki ў слове самагукаў, толькі ў ім і складоў.

Паўсамагукі **й, ў** тым розьняцца ад самагукаў, што ня тварць складу. Дзеля таго **й, ў** яшчэ завуцца нескладатворнымі.

Перапішы й падчыркні самагукі аднэй рыскаю, а паўсамагукі дзьвюма рыскамі.

Каток із пятушком і ліска.

Жыў каток із пятушком. Пайшоў каток на ўловы, а пятушка заставіў пільнаваць дому. Пятушок стаў пець. Лісічка прыйшла хусьце мыць пад акно. Яна сказала: »Хораша пяеш, але я глушка на лева вушка, прыляці бліжэй«. Пятушок прыляцеў. Тады ліска схапіла яго і пабегла. А пятушок пеў: »Каток - браток, мяне ліска ймчыць, па хмызьнічку, па бярэзьнічку, па высокіх горах, па лісіх норах«.

Перапішы й падчыркні сугукі рыскаю.

Дзедка з бабкай і воўк.

Жыў дзедка. Было ў яго пяць авечачак, шосты бычэчак, курка рабушка і сучка зьвяружка. Прыйшоў да іх воўк пад акно і хораша пеў:

— Пяць, пяць авечачак, шосты бычэчак, курка рабушка і сучка зьвяружка.

— Хораша пяе — дзедка сказаў — дай яму адну авечачку.

Воўк занёс яе ў лом і кінуў.

§ 6. Перанос слова.

Перапішы гэтую песьню, падзяліўшы ў ёй словы на склады. Вось гэтак: Ку - ка - ва - ла і г. д.

Кукавала зязюля ў садочку,
Ой рана-раненька ў садочку,
Прыклаўшы галоўку к лісточку:
— Хто-ж маё гнязьдзечка разаўець,
Хто-ж мае яечкі пабярэць?!

Плакала дзеванька ў сьвятліцы,
Прылажыўшы галоўку к сьцяніцы:
— Хто-ж маю косаньку расплящець,
Хто-х мае уплёты пабярэць?!

Калі цэлае слова не зьмяшчаецца ў вадным радку, дык

часьць яго пераносяць у новы радок. Пераносячы ставяць гэткі значок - пераносу. Пераносяць толькі цэлыя склады, значыцца, ня можна часьць гукаў складу пакінуць, а другую часьць складу перанесьці.

Калі між самагукаў ё адзін сугук, дык яго пераносяць у новы радок, прыкладам: ка - за. Калі ё між самагукаў два сугукі побач, дык адзін пакідаюць, а другі пераносяць, прыкладам: коз-ка. Калі між самагукаў ё адзін паўсамагук **(ў, й)**, а другі сугук, дык паўсамагук пакідаюць, а сугук пераносяць, прыкладам: **лаў - ка, шый - ка.**

Перапішы, разьбіўшы на склады, як на перанос.

На адным дубе зязюля,
На другім дубе другая.
Была ў суседа дачушка,
А у другога — другая.

Адна была ухвалёна,
Другая была зганёна.
Да зганёнай сватоўе,
Да хвалёнай нікога.

Стала ўхвалёна плакаці,
На свае дары ґледзячы:
— Ой дары, дары, дарэнькі,
Абрусы мае бяленькі,
Дзе я вас падзену?

§ 7. Цьвярдыя й мяккія сугукі.

Сугукі бываюць цьвярдыя й мяккія. Прыкладам, у слове **вось** сугук **в** цьвярды, а **с** мяккі, у слове **дзень** абодва сугукі **дз** і **н** мяккія. Часта тый самы сугук, залежна ад месца ў слове, бывае раз цьвярды, а другі раз мяккі. Прыкладам: **лаза (з** — сугук цьвярды), ў **лазе (з** — сугук мяккі).

Перапішы й падчыркні мяккія сугукі.

Ляцела куна з бору ў дуброву
К сакалу на размову.
— Мне ў бары добра, мне ў бары добра,
У дуброўцы ляпей будзе:
У бары шышкі — пакалю ножкі,
У дуброўцы мякчэй будзе.
— Аддай мяне, мамачка, за міленькага:
Мне ў мамкі добра, мне ў мамкі добра,
У мілага ляпей будзе:
У мамкі ключы пад паясочкам,
У мілага на прабоі.

§ 8. Мяккі ь.

Перапішы й падчыркні **літару,** што стаіць на пісьме просьле мяккіх сугукаў.

Сабака грыз косьць. Майстра прадаў вось. Коська, коська! — крычэў Іванька. Конь парваў супонь. Карусь вучыцца. Вось мы й дома! Пронька й Ходзька чытаюць. Дрэнь гэны конь. Бацька даў абаранку. Адам прадаў мазь. Гаспадынька вара страву. Слонь дужы. Пастух вырваў карэнь. Ах, ты забудзька! Прыйшоў да нас будзька. У Гапонькі два браты. Марыська з Гануськай дома. Дастань вугаль ізь ямкі. Гаспадар пачаў садзьбу бульбы. Вар булькае ў гаршку.

Просьле мяккога сугуку пішацца **ь** мяккі знак. **ь** знак паказуе, што стаячы перад ім сугук трэба вымавіць мякка. Сам **ь** ніякага гуку не абазначае.

§ 9. Сугукі перад і.

Перапішы й падчыркні **гук,** што стаіць на пісьме просьле мяккога сугуку.

Ручнік вісіць на кручку. Трысьнік высокі вырас. Разьнік зарэзаў барана. Возьнік вазіў муку. Зьмітра хітрэйшы за Сьпірыду. Звон хораша зьвініць. Мама сінькай сіне. Аніська піша.

Перад **і** заўсёды стаіць мяккі сугук.

§ 10. Сугукі перад я, е, ё, ю.

Перапішы й падчыркні самагук, што стаіць на пісьме па мяккім сугуку.

У мяне была дзядзіна. За грошы ўсюдах харошы. У пятніцу заходзе да мяне Панасюк. Дзямід быў сьветкай на судзе. Гаспадар пайшоў вячэраць. Каровы ходзяць на канюшыне. Месяц схаваўся за хмарку. Сядня сонечны дзень. Венікам мятуць хату.

Літара **я** абазначае гук **а**, перад каторым стаіць мяккі сугук.

Літара [redacted] абазначае гук **э**, перад каторым стаіць мяккі сугук.

Таксама літары **ё** й **ю** абазначаюць гукі **о** й **у**, перад каторымі стаяць мяккія сугукі

Перапішы й падчыркні літары **я, е, ё, ю** з папярэднімі мяккімі сугукамі.

Каню далі сена. Ведзьмы няма на сьвеце. Бяз дуды ходзяць ногі ня туды. На пасеццы авёс родзе. Дзяжа накрыта векам. Ве-

расень — восенскі месяц. Хвядося сястра Пятрусёва. Ні сьцяты, ні павешаны. Той соня, хто доўга сьпіць. Ня вер каню ў дарозе. Сьнежань — зімовы месяц. За ўторы падняў бочку. Ходзе бай па сьцяне. Не пагаснуць зоркі ў небе.

Калі пішуцца **я, е, ё, ю,** а калі **ь,** каб паказаць мякчыню сугукаў? **Я, е, ё, ю** пішуцца тады, калі мяккі сугук стаіць перад самагукам **а, э, о, у.**

Мяккі знак пішацца тады, калі мяккі сугук стаіць на канцы слова **(столь),** або перад іншым сугукам **(дулька).**

§ **11.** Склад **ја** абазначаем аднэй літараю **я (яма).** Склад **јэ** абазначаем аднэй літараю **е (ем).** Склад **јо** абазначаем аднэй літараю **ё (ёсьць).** Склад **ју** абазначаем аднэй літарай **ю (юшка).**

Перапішы й падчыркні склады, у якіх ёсьць **ја, јэ, јо, ју.**

Янук корме ягняткі. Зь ячменю робяць прыварак. Не па Юрку шапка. Янка й Язэп добрыя дзяцюкі. Ядзьвіга прадзець. Раньняя птушка зубкі цярэбе, а позьняя вочкі трэ. Што душа мае, тым і прыймае. Ня ўсе ягады ядомыя. Соя сытная еміна. Калі маеш гаруд жыта — будуйся. Баба Еўка, дзед Тамаш паехалі на кірмаш. Быў зьезд. Хто ня еў ракоў — такоў, хто пад'еў ракоў — такоў. Смачная яечня із скваркамі. Маёвыя жукі шкодныя.

Значыцца, літары **я, е, ё, ю** маюць дваякае значаньне: адзін раз яны абазначаюць мякчыню сугуку перд **а, э, о, у,** а другі раз абазначаюць склады **ја, јэ, јо, ју.**

Перапішы й зьвярні ўвагу, як вымаўляецца **і,** стаячае ў слове па самагуку.

Бабуля баіла байкі. Ішоў бай па сьцяне, ці баіць, ці не? Раіна ўмее шмат байкаў. Хто поле трое, тый хлеб крое. Палікар напаіў коні. Свой із сваім біся, вадзься, а чужы не мяшайся. Пяі свае песьні. Зямец злавіў два раі пшчолаў. Аніся падаіла каровы.

і, стаячае ў слове па самагуку, мае перад сабою **ј,** значыцца, вымаўляецца **јі (пајіць).** Звычайна таксама **і** стаячае на пачатку слова вымаўляецца як **јі (іх, іншы, іскра, ікра, імя, ігра, ігрышча, імкненьне** вымаўляюцца гэтак: **јіх, јіншы, јіскра, јікра, јімя, јігра, јігрышча, јімкненьне).**

§ 12. Гукі і, й.

Гук і ёсьць, прыкладам, у слове **міса, піла** і пад. Гук і твора склад. Гук **й** ёсьць у такіх словах, як **край рой** і пад. Гук **й** складу ня твора.

а) Напішы подле прыкладу і падчыркні нескладатворнае **й.**

Я гукаю — ты гукай
Я гуляю — ты
Я дыхаю — ты
Я зьбіраю — ты
Я дзьмухаю — ты
Я кідаю — ты
Я кірую — ты
Я маю — ты
Я наймаю — ты
Я нюхаю — ты
Я слухаю — ты
Я чытаю — ты

б) Перапішы, падзялі словы на склады і падчыркні **й** нескладатворнае.

Мама купіла бойку. У бойцы б'ём масла. Войска зьвярнулася з вайны. На ройстру стаяла вада. Пастух пагнаў статак на вадапой. Упусьцілі ў вулей рой пшчолаў. Укрой — ня ўдой. Тата купіў лейцы. Павей, павей, ветру! Кінь прад сабой — знойдзеш за сабой.

§ 13. Гукі у, ў.

Гук у твора склад і вымаўляецца працяжна. Прыклады: **дуб, сук, магу.**

Гук ў вымаўляецца каротка. Ен складу ня твора; дзеля таго завецца **нескладатворным.** Прыклады: **роў, кроў, поўны. ў** стаіць на канцы слова **(стаў)** або па самагуку перад сугукам **(траўка).**

а) Перапішы й падчыркні **ў** нескладатворнае.

Татка пайшоў дамоў. Ен цяперка ля дому. У дуброве шмат дубоў. Ля дубу была сьвіньня. Наламі сукоў. На суку сядзела варона. Работнік строс пяць кулёў. Мы гукалі аб сябру. У таварысьцьве было шмат сяброў.

б) Трэба таксама адрозьневаць **ў** нескладатворнае ад **в. в стаіць толькі перад самагукам.**

Перапішы й падчыркні **ў** нескладатворнае дзьвюма рыскамі і **в** аднэй.

Што галава, то розум. Дзіцяці забалела галоўка. Карова дае малако. Я люблю сваю кароўку. У каня вялікая грыва. Рашча-

шу грыўку свайму коніку. На лузе вялікая трава. Пушчу кароўку на траўку. Гэта вялікая дуброва. Шуміць зялёная дуброўка.

в) Напішы подле прыкладу.

Яна пісала	— ён пісаў	Яна зьбірала	— ён
Яна хадзіла	— ён	Яна казала	— ён
Яна жала	— ён	Яна слухала	— ён
Яна чытала	— ён	Яна пасьціла	— ён

§ 14. Мяккі знак ь а значок ’ уверсе.

Калі патрабуем напісаць цьвярды сугук перад складам **ја, јэ, јо, ју, јі,** каторыя абазначаем літарамі **я, е, ё, ю, і,** дык, каб адрозьніць ад складоў зь мяккімі сугукамі, па цьвярдым сугуку ставяць уверсе гэт’кі’ (апостраф) значок. Прыклады: **аб’едкі, аб’ядаць, аб’ехаць.**

Перапішы й падчыркні сугукі з апострафам.

Хто пад’еў ракоў — такоў. Аб’едкаў нам ня трэба. Аб’едзем гэную гару. Ад’едземся крыху. Ня я б’ю — вярба б’е. Дзе п’юць, там і льлюць. На санажаці было шмат куп’я. У лесе вядзецца зьвяр’ё. Зь пер’я робяць падушкі. Дождж ліў цур’ём. Зрэб’е годзіцца на мяхі. Вятрак стаіць на ўзгор’ю. П’яніцы — такія ягады. Шкодна п’янчыцца. Уб’ю гвозд у сьцяну. Слухаць мусяць шаўца капылы й скур’ё. У Мікіты вялікая сям’я. Ня добра быць п’яніцаю. На дрывотніку ляжыць дуб’ё. Усям’і ўсё згодзіцца. Вераб’і зьвілі гняздо. Няма нашага вераб’я. Ад дурнап’яну п’янеюць. Калі ня п’юць, то й ня дзякуй.

§ 15. Па ў перад я, е, ё, ю, і, абазначаючымі **ја, јэ, јо, ју, јі,** апострафа ня ставяць **(вудаўё).**

Перапішы й падчыркні **ў** перад **я, е, ё, ю.**

Браслаўе й Пастаўе паветавыя месты крывіцкія. У Заслаўю памерла княгіня Рагнеда. Увясну дзярэўе зазелянелася. На іржышчу ляжала снапоўе. Дзяўчына не адаб’ецца ад сватоўя. Вуда складаецца з вудаўя, валасьніка, плавука й кручка. Пастух выразаў пугаўё. Цяжка жыці ў бяспраўю. У балоце было шмат гадаўя.

ЧАСЬЦЬ II.

НАВУКА АБ ГУКАХ І ПРАВАПІС

РАЗЬДЗЕЛ III.

Калі пісаць вялікія літары.

§ 16. а) Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца вялікай літараю. Пацяплела на двары. Прыгрэла сонейка. Стаіў сьнег. Крыгі лёду зьнесла вада. Дзеці ірвуцца вонкі. У гародзе паказалася траўка. Птушкі зашчабяталі. Усім вясёла ўвясну.

Ці не зацемілі вы, калі пішам вялікія літары?

б) Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца вялікай літараю.

Сядня 25. красавіка. Кажнага 25. ў нашым местачку кірмаш. Тата павязець прадаваць лён. Дзеці ждуць таты зь кірмашу. Яны пабягуць адчыняць вароты. Татуля прывязець гасьцінца. Дзеці любяць смаргонскія абаранкі.

Па бодцы (пункце) ставім вялікую літару. Пункт ставім тады, калі скончым якую думку, або па скончанай проказі. Напішы 4 проказі.

§ 17. Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца вялікай літараю.

У Мікіціных усі дома. Старая Мікіціха качае хусьце. Гапон папраўляе хамут. Унукі таксама дома, бо дождж. Старшы Юрка зь Януком Казановічыкам гамоняць аб вайне. Сярэдні Паўлюк піша. Найменшыя, Пятрусь і Хвядоська, заўзята рысуюць.

Ці адно просьле бодкі пішам тутка вялікую літару? Але, імёны й прозьвішчы пішам зь вялікай літары.

§ 18. Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца вялікай літараю.

Сядня статак ходзе разам. Вось Раба й Краса Завыганскіх. Там вунь Падласка й Рагуля Рыбачкова. Яшчэ далей Рыжа й Кудра Аляшкевічавы. Із статкам прыбеглі сабакі — Жучок Ільлючонкаў і Лыска Язэпчыкаў. Пастушкі любяць Лыску, бо ён пераймае каровы.

Якія ймёны тут напісаны зь вялікай літары?

§ 19. Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца вялікай літарай.

Вячка жыве ў сяле Загорнятах. Дагэтуль ён быў толькі ў сваім местачку Гальшанах. На Вялікдзень Вячка паедзе ў Вільню даведацца да дзядзькі. Вільня стаіць ля ракі Вяльлі. Ля Вільні Панарскія горы. Хацеў-бы Вячка яшчэ пабачыць возера Нарачча. У Крывіі шмат харошых азёраў.

Назовы местаў, местачкаў, сёлаў, рэкаў, азёраў, мораў і краёў пішам із вялікай літары.

§ 20. Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца вялікай літараю.

Спрадвеку Крывічы жывуць у Крывіі. Суседзьмі Крывічаў на паўдні ёсьць Украінцы, на ўсходзе й поўначы Маскалі. На заходзе мяжуюць Крывічы з Эстонцамі, Латышамі, Жмуйдзінамі, Немцамі й Палякамі. Нашыя плямёны — Радзімічы, Северане й Вяцічы межавалі міжсобку. Ад назову аднаго племені „Крывічы" паўстаў назоў усяго нашага народу. Нас, Крывічаў, завуць Беларусамі няправільна. Даўней наш народ сябе ніколі Беларусамі ня зваў.

Назовы народаў і плямёнаў пішам із вялікай літары.

§ 21. Перапішы й падчыркні словы, што пачынаюцца зь вялікай літары.

Краю родны, краю гожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у сьвеце Божым
Гэтых сьветлых берагоў,
Дзе бруяцца срыбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць?

Каторыя словы ў вершах пачынаюцца вялікай літараю?

РАЗЬДЗЕЛ IV.

Знакі прыпынку.

§ 22. Перапішы й зьвярні ўвагу на коску.

У Ільлініча за токам харошы сад. У садзе растуць яблыны, ігрушы, сьлівы, чарэшні й вішні. Растуць у садзе й краскі. Краскі цьвітуць чырвоным, рожавым, сінім, жоўтым і белым цьве-

там. Дзеці любяць быць у садзе. Яны там гуляюць, чытаюць, зьбіраюць садовіну, ірвуць краскі і нясуць іх маме.

Коску ставяць паміж словаў, адказуючых на тое самое пытаньне. Калі паміж двух словаў стаіць і, дык коскі перад і ня ставяць.

Сонца грэе, вецер вее, жыта палавее, маладая дзяўчынанька работы ня ўмее.

Восень. Ня іскрыцца небазор, ня цьвіце трава чабор, ня цыгліць птушыны стан, толькі поўзае туман. Вецер б'е ў нямы курган, шапаціць імглісты бор.

Коска ставіцца паміж кароткімі блізкога значаньня праказямі, адказуючымі на тое самое пытаньне.

а) Перапішы й пастаў коскі, дзе трэба.

Дзеці пайшлі ў лес. Там было прасторна хораша й вясёла. Дзеці бегалі крычэлі пяялі лазілі на дзервы. Потым зьбіралі розныя ягады: суніцы чарніцы маліны й п'яніцы. Увечары загарэлыя вясёлыя й выгаладніўшыся варачаліся дамоў.

б) Перапішы й пастаў коску, дзе трэба.

Ой, на гары пясочак на пясочку садочак, а ў садочку салавей салавейка лугавы.

Была я ў мамачкі адна на раду дала мяне мамачка замуж маладу не вялела мамачка ў госьцікі ісьці. Не пайшла гадочак и не пайшла другі, а на трэйці гадочак затужылася да мамачкі ў госьцікі захацелася.

§ 23. а) Перапішы й глядзі, дзе пастаўлена коска.

Бацькі сказалі Пятрусю, што ён заўтра пойдзе ў школу. Пятрусь усьцешыўся, бо ён даўно хацеў вучыцца. Увечары ён палажыў у торбу кніжкі, што маці яму купіла. У школе Пятрусь ня ведаў, дзе сесьці. Вучыцель паказаў яму месца. Адныя дзеці чыталі, а другія пісалі. Пятрусь адчыніў лемантар і пачаў чытаць. Паўлюта таксама адчыніў лемантар, але ён яшчэ чытаць ня ўмеў. Ужо было паўдня, калі дзеці зьвярнуліся дамоў.

Перад **але, бо, што, каторы, дзе, калі** ставяць коску.

б) Перапішы й глядзі, дзе стаіць коска.

Пастушкі пасьцілі статак. Пасьцюдзянела, дык яны наважылі раскласьці агонь. Паслалі Вінцука, каб назьбіраў дроў. Ідзе Вінцук а йдзе, ажно недалёка бяжыць воўк. Вінцук пры-

стоіў, пакуль воўк прабег. Тады назьбіраў дроўцаў ды зьвярнуўся назад. Ля вогнішча расказаў, як стрэўся з ваўком.

Якая птушка, такія й песьні.

Коску ставяць таксама перад **дык, каб, як, пакуль, такі, які.**

Калі **а** й **ды** значаць тое самое, што **і,** дык перад імі коскі ня ставяць. А калі **а, ды** маюць значаньне блізкое да **але,** дык перад імі коска ставіцца.

в) Перапішы й пастаў, дзе трэба, коску.

Жылі-былі два брацейкі ды былі ў іх дзьве сястрыцы. Адну аддалі за багатага а другую за беднага. Па багатую, багатырачку пару коняй запраглі а бедную, бяздольную перазь людзёў наказалі. Багатую, багатырачку на куце пасадзілі а бедную ў запечку.

Дождж. Было горача дык хлапцы пайшлі купацца. Па дарозе стрэліся зь дзядзькам Юстынам каторы парадзіў каб зьвярнуліся дамоў. Ен казаў што будзе навальніца бо неба зацягавала хмарамі. Хлапцы не паслухалі. Яны спадзяваліся пакупацца пакуль пачнецца дождж. Не дайшлі яны да рэчкі як пачало капаць. Хлапцы пусьціліся назад. Дождж сьціх калі яны былі на дворышчу. Змоклыя хлапцы сьміяліся але маці на іх крычэла.

Прыказь. Якое дзерва такі клін які бацька такі сын.

§ 24. а) Перапішы й зьвярні ўвагу, дзе стаіць пытаньнік.

— Мышка, мышка, дзе была?— Міскі мыла.
— У Бога. — Што дастала?
— Што рабіла? — Кусок сала.

б) Перапішы й пастаў, дзе трэба, пытаньнік.

Вось і сонейка закацілася, мне да мамачкі захацелася. Дзе мяне мама пераймаць будзе чым мяне мама частаваць будзе. Пераймаць будзе ў вішнёвым саду, частаваць будзе зялёным віном. Ці я ў гору радзілася ці да мяне гора прычапілася ці я ў гору гадавалася.

РАЗЬДЗЕЛ V.

Сугалосныя й безгалосыя сугукі.

§ 25. Адныя сугукі вымаўляюцца звонка, з голасам, а другія ціха, бяз голасу. **Безгалосаму** адказуе **сугалосны.**

п — б (снапы — бабы)
т — д (там — дам)
х — г (усход — год)
с — з (саву — заву)
сь — зь (сіта — зіма)
ш — ж (шаль — жаль)
ц — дз (цына — дзынкаць)
ць — дзь (цень — дзень)
ч — дж (хачу — хаджу)

§ 26. **п — б.**

а) Перапісуючы падчыркні **п**.

Вялікая ступа — малая ступка.
Старая ліпа — маладая ліпка.
Маміна салёпа — даччына салёпка.
Вялікая лапа — малая лапка.
Смачная рэпа — салодкая рэпка.
Вялікая капа — малая копка.

б) Падчыркні **п** і дапоўні.

2 снапы	— 1 сноп.	2 сярпы	— 1
2 цапы	— 1	2 стаўпы	— 1
2 скляпы	— 1	2 струпы	— 1
2 чарапы	— 1	2 сьцяпы	— 1

в) Перапішы й падчыркні **б**, заміж каторага чуеш **п**.

У гародзе расьце боб. Хлеб на стале — рукі свае. У Васіля высокі лоб. Паўлюк злавіў рыбку. У студні новы зруб. Стаіць стары дуб. У пятуха чуб. Бабка баіць байкі. Галуб сівы, галубка сівейша. Кінь у гаршчок дроб солі. На магільніку харошы гроб. Сьлёсар зрабіў шрубку. Поўная лубка збожжа. Малая жабка скача. Зубны лекар вырваў хворы зуб.

ґ) Гэтыя словы зьмяні так, каб ясна чуваць было **б**:

боб	— бобу	гроб	—
лоб	—	жолаб	—
хлеб	—	рыбка	— рыба
зруб	—	жабка	—
дуб	—	трубка	—
чуб	—	шрубка	—
галуб	—	бабка	—
дроб	—		

г) Перапішы й дапоўні.

каробка	— каробачка	клёпка	—
жарэбка	—	стопка	—

шапка —
лубка —
піпка —
почапка —
лазобка —

іскрыпка —
жарэбчык —
дубчык —
рубчык —

х) Перапішы й выясьні, чаму наступныя словы пішам із **б** або **п**.

кроп, бо
клуб, бо
зуб, бо
скарб, бо
грыб, бо
галуб, бо

дуб, бо
падруб, бо
клеп, бо кляпаць
любчык, бо
сіпка, бо
капка, бо

д) Перапішы, выпішы асобна словы з **б** і асобна з **п** і выясьні, чаму гэтак пішуцца.

1.

Капка дажджу капнула на шапку. У кошыку быў грыб. Кроп расьце ў гародзе. Карова зьбіла клуб. Пастух нарэзаў дубцоў на венікі. Сіпка такая хвароба. Наш сабака завецца Рабчык. Дзядуля плёў лубку. Паганяй дубчыкам каня. Курасьлеп расьце на дзірване.

2.

Гапка разумная дзяўчынка. У стопцы стаіць варыва. Клёпка ў цабры падгніла. Ня добры ў касе клеп. Гапуля апранула салёпку. Каралянок знайшоў скарб. Любчык такое зельле. Цесьлі палажылі падруб. Падруб ды сьцены, ды наруб, дык і хата ўся. Ад вялікай раны застаўся вялікі рубец, ад малой — малы рубчык.

§ 27. т — д.

а) Церапішы й падчыркні літару **т**.

Няма чаго ў рот улажыць. У Зянковіча чорны кот. Нашая котка лавушчая. Ты, брат мой, еж хлеб свой. Ад кута ў кут — усё тут. Гэты прайдзісьвет абыйшоў увесь сьвет.

б) Перапішы й падчыркні словы, у каторых чуеш **т**, але пішаш **д**.

Сабака йшоў па кладцы. Ен зьнюхаў сьлед. І дзед быў ка-

лісь молад. Голад і холад мучаць людзёў. Мёд салодкі. Адклад ня йдзе ў лад.

в) Выпішы й зьмяні словы так, каб ясна чуваць было, чаму пішацца **д**.

лёд	— лёду	рад	—
гарод	—	верад	—
мёд	—	дзед	—
род	—	голад	—
сад	—	перад	—
народ	—	гад	—
звод	—	холад	—
сусед	—		

ґ) Перапішы й сконч.

2 платы	— 1	2 сусяды	— 1
2 боты	— 1	2 браты	— 1
2 сады	— 1	2 верады	— 1
2 гароды	— 1	2 каты	— 1
2 перады	— 1		

г) Перапішы й выясьні, чаму наступныя словы пішуцца праз **т** або **д**.

сват, бо	кладка,
адклад, бо	дрот,
цэд, бо	насатка,
сад, бо	суседка,
лёд, бо	клетка,
хатка,	кітка
дрот,	ракітка
крот,	Мікітка

Перапішы й выясьні.

1.

Добра грае дудка Міхасёва. Гаспадыня адцадзіла цэд. У каваля цяжкі молат. Дай катку малачка. Каб на іх звод, на гэтыя камары! Хурман сядзеў у перадку. Улез, як у нерат: ні ўзад, ні ўперад. Слова не зьмясьцілася ў радку. Дзеці гуляюць у садку. Прут бывае дзярвяны й зялезны. Возьнік купіў кітку сена. Малацьбіт змалаціў пасад аўсу. Ягнётка сьсе матку.

2.

Конь зраніў капыт. Лёд патрэскаўся на рацэ. Сабака схаваўся ў будку. Выпусьці птушку з клеткі. Агатка зарубіла насатку. Крот псуе пожню. Гэты хлеў запіраецца закруткаю. Ля ганку былі ўсходкі. Дзеці скакалі цераз калодку. Азярод стаіць на гумнішчу. У ім сушацца снапы. Азярод ці пярэплат — усё роўна. На Калядкі — бліны ды аладкі. Вучаньнік купіў асадку да пяра.

§ 28. х — г.

а) Перапішы й падчыркні х.

У пярыны кладуць пер'е й пух. Бываюць і коўдры з пуху. Пастух пасьціць статак. У пастуха была пуга. Зьмяці мякіну ў катух. Вазьмі з катуха лубку. Сёлета гарох стручны. У сабакі добры нюх. Ен нюхам пачуў мяса. На страсе мох вырас, на моху бярозка.

б) Перапішы й падчыркні склады, у каторых чуеш х, але пішаш г.

Араты выйшаў араць лог. У яго прытупіўся нарог. Ен выпраг каня і пусьціў на луг. Конь пайшоў у стог. Яго Бог сьцярог ад бяды. Начлежнікі паехалі на начлег. Добра зрабіў Бог, што ня даў сьвіньні рог.

в) Перапішы й зьмяні словы так, каб ясна было чуваць, чаму пішацца г.

Лог — логу	Бог —
луг —	нарог —
рог —	парог —
стог —	вораг —
бег —	плуг —

ґ) Перапішы й скончч.

2 рагі	— 1 рог	2 стагі	— 1
2 берлагі	— 1	2 таргі	— 1
2 берагі	— 1	2 пастухі	— 1
2 плугі	— 1	2 катухі	— 1
2 начлегі	— 1		

г) Перапішы й выясьні, чаму наступныя словы пішуцца цераз х або г.

Сьмех, бо	**лёгка, бо лёгенька**
сьнег	**драгка**
мех	**крохкі**
грэх	**мог, бо магу**
узрэх	**лёг**
гарох	**запрог**
нюх	**рух**
пух	

х) Перапішы, падчыркні словы, што маюць **г** або **х**, і выясьні, чаму пішам гэтыя літары.

1.

Цяляці адгароджаны катух. Мне лёгка на сэрцу. Ен едзе ўлегцы. Якая драгкая дарога! Ты мог дзерці мох. На пожні стаяў стог сена. Араты зрабіў узрэх. Смачны жабе гарэх, але зубоў Бог ня даў. Поўны мех мукі.

2.

Яўтух назіраў каня. Конь пабег у шкоду. Бег у каня быстры. Дзеці зрабілі выбег у лес. У хворага цяжкі дых. Улёг ты надта ў работу. Сена яшчэ было вагкое. Чэрствы пірог крохкі. У сякіры абух. Пасьпех — людзём на сьмех. Быў чутны сабачы брэх.

§ 29. с — з.

а) Перапісуючы падчыркні, дзе чуеш **і** пішаш **с**.

Ліс пабег у верас. Кажны бес цягне ў лес. Колас, што зярнят ня мае, дагары лоб задзірае. Адам атрос жалуды. У цыгана чорны волас. Пяюльля мела хорошы голас.

б) Перапішы й падчыркні склады, у каторых чуеш **с**, але пішаш **з**.

Бегла ліска каля лесу блізка. Бабуля ўмее цікаўныя казкі. Полаз прымерз да сьнегу. Бэз пахне. Хведар прывёз воз сена. Козка грызла лозку.

в) Перапішы й зьмяні словы так, каб добра чуваць было, чаму пішацца **з**.

Мароз — маразы	нізка —
абраз — абразы	вузка —
вяз —	блізка —

полаз —
сьлёзка — сьліза
Залозка —

коўзка —
бярозка —
козка —

г) Перапішы й сконч.

2 трусы — 1
2 насы — 1
2 вазы — 1
2 паяскі — 1
2 вазкі — 1

2 каласкі — 1
трэсачка, дык
лысачка, дык
ласачка

г) Перапішы й выясьні, чаму пішаш з або с.

Час, бо
авес
квас
нос
атоска
ласка

трэска
прывёз
прынёс
абтрос
узьлез
Лыска

х) Перапішы, падчыркні с і з а выясьні, чаму яны пішуцца.

Лыска грызе костку. Трус ізьеў лапух. Быў квас, ды ня было вас. Вось улез у густы лес! У гародчыку растуць краскі. Гаспадыня мазала мазкай скварадў. На вуліцы было коўзка. Кнігар прадаў кнігу з абразкамі. Нашыя ў вазку паехалі. Дзяўчо зьбірала каласкі. На лузе рос вербалоз.

§ 30. ш — ж.

а) Перапішы й падчыркні, дзе чуеш **ш**.

Ці мышка ў пастцы? Няма мышы ў пастцы. Кош стаіць у сянёх. У кашы бульба. Трэба ашчаджаць грош. За грошы ўсюдах харошы. На палудзень была каша. І дзіцяці далі кашкі.

б) Перапішы й падчыркні, дзе чуеш **ш**, але пішаш **ж**.

У краме прадавалі рыж. З рыжу вараць кашу. Калі ўзяўся за гуж, не кажы, што ня дуж. Гужы робяць із скуры. Дужы чалавек завецца дужасілам. Ля дарогі стаіць крыж. Перад крыжам здыймаюць шапкі. Ложак стаіць ля сьцяны. У ложках сьпяць. Падай мне нож. Няма тутка нажа.

в) Перапішы гэтыя словы й зьмяні так, каб ясна чуваць было, чаму пішацца **ж**.

Вуж
нож
муж
чыж
качарэжка
пражка

ножка
дарожка
істужка
дзяружка
дзежка
цяжка

ґ) Перапішы й сконч.

Грошы, дык грош
крыжы
ежа, дык ежка
дзяжа
трэсачка
замужачка

вужы
кашы
адзежа
кішачка, дык кішка
галавешачка
качарэжачка

г) Перапішы, падчыркні **ж, ш** і выясьні, чаму словы так пішуцца.

Каб ня ежка, не адзежка, дык была-бы грошаў дзежка. Цераз Крывію йстужкай льлецца рака Нёман. Жнейка цяжка працуе. Птушка зачапілася ножкай за волас сіла. Пайшла гуляць качарэжка. Кот злавіў мышку. Замужняя жанчына завецца замужка. Мурашка працаўлівае стварэньне.

§ 31. сь — зь.

а) Перапішы й падчыркні, дзе чуеш і пішаш **сь.**

Пятрусь злавіў каня. Ен крычэў: „Кось, кось, кось!" Коська не хацеў слухаць Пятруся. Хвядоська гнала гусь. Гусь спужалася каня і паляцела. Шкада было Хвядосі гусі. Міхась ехаў у калёсах. Конь яго разьнёс. Зламалася вось.

б) Перапішы й падчыркні, дзе чуецца **сь,** але пішацца **зь.**

Дзед жаліўся на рэзь у жываце. Трэба мазь да колаў. Марозька, Марозька, хадзі куцьцю есьці! Бразь! дзьвярыма. Узьлезь на дзерва па рой.

в) Перапішы й зьмяні словы так, каб ясна чуваць было, чаму пішацца **сь** або **зь.**

Коська, бо кося
просьба, бо прасіць
Марыська
марозька

Гануська, бо
Каруська
касьба
касьбіт

рэзь гусь
мазь лазь

ґ) Перапішы, падчыркні **сь, зь** і выясьні, чаму гэтак пішацца.

Гусь крычэла на двары . У драбіне зламалася вось. Злазь ізь дзерва! Настала касьба. Касьбіты пайшлі касіць. Марка падаў просьбу ў суд. Малога бусла завуць буська. Рысь дзікое зьвяро. Антось раз забіў рыся.

§ 32. **ц — дз.**

а) Перапішы й падчыркні, дзе чуеш **ц.**

Полацак найстаршая сталіца Крывіі. У Полацку княжыў Усяслаў Вялікі. Гжацак на ўсходзе Смаленшчыны. Зараз на ўсход ад Гжацку праходзе граніца між Крывіяй а Маскоўшчынаю. Хлапец урэзаў палец. Купец купіў у стралца цецярука. Стралец прадае купцу. На мяжы стаяў капец.

б) Перапішы й зьмяні так, каб ясна чуваць было, чаму пішаш **ц** або **дз.**

Закалец курэц
ксёндз палец
месяц малец
заяц валец

в) Перапішы, падчыркні **ц, дз** а выясьні, чаму пішаш гэтыя літары.

У Слуцку ўсё палюдзку. Курэц купіў папіросы. І шавец, і кравец, і ў дуду іграц. Ксёндз паехаў да хворага. У Клецку бываюць вялікія кірмашы.

§ 33. **ць — дзь.**

а) Перапішы й падчыркні **ць.**

Круць, верць — у чарапочку сьмерць.

Круці, ні вярці — трэба памярці. Санажаць добра ўрасла. Коні ходзяць па санажаці. Трэба паставіць новую клець. Завядзі каня пад павець.

б) Перапішы й падчыркні, дзе чуеш **ць,** а пішаш **дзь.**

Медзь дастаюць ізь зямлі. Паставілі кадзь капусты. Лебедзь харошая птушка. Едзь дамоў. Мядзьведзь непавараткі зьвер. Сядзь на куце. Парадзь раданьку. Ледзь падняў гэты камень. У гаспадара ё чэлядзь. Не забудзься напаіць каня.

в) Перапішы й зьмяні так, каб ясна было відаць, чаму пішаш **дзь.**

Медзь	**радзь**
кадзь	**ня вадзься**
ведзь	**рэдзька**
чэлядзь	**дзядзька**
сядзь	**суседзька**
будзь	**лябедзька**

ґ) Перапішы й сконч.

Косьці, дык косьць	сядзі, дык сядзь
павеці	будзе
клеці	парадзіць
медзі	дзедзечка
едзе	Дзямідзечка
гладзіць	

г) Перапішы, падчыркні **ць, дзь** а выясьні, чаму так пішаш.

Увосень капаюць рэдзьку. Без мае ведзі нічога не рабі. Рэдзенькі ваш авес. Капуста радкая, бо казёл убіўся й парадзіў. Пасыпаў лубіну зрэдзь. Бацькі гадуюць дзяцей. Гэтая жэрдзь згодзіцца на плот. Пяць меней за шэсьць. Майму бацьку пяцьдзесят год. У капе шэсьцьдзесят адзінкаў. Люблю я дзедзьку Дзямідзьку. Звару сала, сьпяку блін, каб мой дзедзька дома быў. Малацьбіты малацілі ў тры цапы. Гарадзьбіты гарадзілі тын. Скарадзьбіт скародзе. Скарадзьба лягкая работа, а малацьба цяжкая.

Перапішы й замяні крыжыкі літарамі.

Восенскі вечар

Вые бура, ле + гамоніць,
Як на сходзе дзе наро +
Вецер хмары так і гоніць;
Дож + і гра + і галалё +.

На камінку корч пылае,
Каля печы дзе + сядзіць,
Ба + ка ла + ці папраўляе,
Маці ні + кі села віць.

Якуб Колас.

РАЗЬДЗЕЛ VI.

Цеканьне.

§ **34.** а) Перапішы й падчыркні **ць** дзьвюма рыскамі, а **т** аднэй.

Увясну гародзяць плот. Дворышча абгароджана плотам. На плоце сушацца жбанкі. У нас новая хата. У хаце чатыры куты. На куце пасадзілі гасьцяя. Мята пахне. На мяце раса. Салата расьце ў гародзе. У салаце шмат соку. На лобе відаць былі капелькі поту. І сарочка была ў поце. Лекар казаў хвораму адчыніць рот. Ен глядзеў у роце язык. Мама купіла сіта. У сіце драбныя дзірачкі.

Выпішы словы з **т** ды побач іх пастаў **тыя** іх хормы, у каторых заміж **т** ё **ц.**

б) Перапішы, падчыркні словы зь **ц** (мяккім) а побач напішы іншыя хормы тых-жа словаў, або адказуючыя ім свае (блізкія) словы з **т.**

Узьняўся вецер. Сады ў цьвеце. Вялікія вятры шкодзяць цьвету. Купі ваты ў краме. Кравец будзе шыць паліто на ваце. Палінар сядня ў паліце. Галіта ня ганьба, але няшчасьце. Цяжка жыці ў галіце. Котка мела трое кацянят. Сярод Вялікага посту ё Серадапосьце. У посьце пяюць смутныя песьні.

Е толькі т цьвярдое. Т мяккога ў мове крывіцкай няма. Калі т зьмякчаецца, дык яно заўсёды пераходзе ў ц (ць).

в) Перапішы й падчыркні гукі, перад каторымі стаіць **ць** (**ц** мяккое).

Прыходзіла да цябе Тацянка. Яна хацела пазычыць кніжкі. Цётка прывезла дзяцём гасьцінца. Начлежнікі пусьцілі коні на сенажаць. Маці рашчыніла цеста на пірагі. Сілкуйцеся, госьцікі. Наш цюцька чуткі. Дзяцюкі пайшлі на вайну. Цяжка жыці на чужыне. Вада цячэ далоў. Цяпер усі маюць вучыцца. Відаць, але далёка дыбаць.

Перад я, е, ё, ю, і заўсёды пішацца ц (**а ня т**)**, бо гэтыя літары паказуюць, што перад абазначанымі імі самагукамі стаіць мяккі сугук. Таксама перад ь заўсёды пішацца ц** (**а ня т**)**,** бо **ь (мяккі знак) абазначае мякчыню стаячага перад ім сугуку.**

§ 35. Перапішы й падчыркні словы, у каторых **ц** стаіць перад мяккім **в** або **м.**

Дуб цьвярды. У нашай студні вада цьвярдая. Мацьвей не паддаецца непрыяцелям. Шкло якоесь цьмянае. Ліцьвін, як лін. Ліцьвінамі або Літвой калісь зваўся наш крывіцкі або беларускі народ. Трэба быць цьвярозымі. Мярцьвец ляжаў у дамавіне. Дзіцятка ходзе чацьвярыцай. Чэцьвер — чацьверты дзень у тыдню. Цьвер ня прыяла Маскве.

Т перад мяккімі в а **м** пераходзе ў **ц,** ці — **накш кажучы — перад мяккімі в** а **м** ня бывае **т,** але ё **ц.**

Дзеканьне.

§ 36. а) Перапішы й падчыркні **дз.**

Люблю наш сад. У садзе, вінаградзе дзяўчына гуляла. Калоду парэзалі на дошкі. Стары сеў на калодзе. Гарод разьбілі на грады. У гародзе на градзе тры калівы мяты. Панас падаў у суд. Мы ў пяршыню былі на судзе. Яўхім змайстраваў дуду. Ен грае на дудзе. Пастух скруціў дудку. У вадзе былі харошыя каменчыкі. Дзеці іх даставалі з вады. На ставе лёд. Каўзуны коўзаюцца на лёдзе.

Выпішы словы з **д** ды побач іх пастаў тыя іх хормы, у каторых заміж **д** ё **дз** (мяккое).

б) Перапішы, падчыркні словы зь **дз** (мяккім) а побач напішы іншыя хормы тых-жа словаў (або адказуючыя ім свае словы) з **д.**

У Сапрона вялікая барада. У барадзе паказаліся сівыя валасы. Мы гардзімся сваім родам. У нашым родзе ня было няславы. У гародзе ячмень родзе. Мы належым да крывіцкага народу. Ходзяць чуткі ў народзе. Ягоная такая хада. У хадзе конь ня мае ганьбы (заганы). Узаралі ляда. На лядзе ўдаецца проса. Мёд сытны. У сьпелым мёдзе мала вады.

Е толькі д цьвярдое. **Д** мяккога ў мове крывіцкай няма. Калі **д** зьмякчаецца, дык яно пераходзе ў **дз** (мяккое).

в) Перапішы й падчыркні літары, перад каторымі стаіць **дз.**

Дзядуля паперазаўся дзягаю. Дзякуй Богу за пагоду. Пральля прадзець кудзелю. Ледзь пасьпелі на цягнік. Дзёрзкі наш Дзямід. Паляўнічы застрэліў лебядзь. Ен хлеба жадзён. Парадзіла мяне маці ў сьвяту нядзелю. Рэдзька гаркая. Медзякі

б'юць ізь медзі. Дровы б'юць на дрывотніку. У ваўторак снапоў сорак пшанічанькі б'ю, б'ю. Дзегаць гоняць ізь дзярвы. Сьмерць і радзіны ня выбіраюць гадзіны. Нашае цьвердзі не здабыла войска непрыяцельскае. Аўторак а другадзень — усё роўна.

Перад **я, е, ё, ю, і заўсёды пішацца дз** (а не **д**), **бо гэтыя літары паказуюць, што перад абазначанымі імі самагукамі стаіць мяккі сугук. Таксама перад ь заўсёды пішацца дз** (а не **д**), бо **ь** (мяккі знак) **паказуе мякчыню стаячага перад ім сугуку.**

§ 37. Перапішы й падчыркні словы, у каторых **дз** стаіць перад мяккімі **в** або **м.**

На паліцы — дзьве сініцы, што пададуць, тое зьядуць. Сто ды сто будзе дзьвесьце. Мікіта дзьверы напіта (наўсьцяж) расчыніў. Мядзьведзь памядун. Вецер дзьме ў вочы.

Д перад мяккімі в а м пераходзе ў дз, ці — **накш кажучы — перад мяккімі в** і **м ня бывае д, але дз.**

РАЗЬДЗЕЛ VII.

Зацьвярдзелыя сугукі.

§ 38. Перапішы й падчыркні склады з **р.**

У Вільні крывыя вуліцы. Рэпа й рэдзька гародніна. Купілі радкое рэшата. Рэкі цякуць у мора. Парадак мусіць быць усюдах. Андрэй, ня дурэй, не дзяры капоты. Ліс хітрае зьвяро. Станьце ў рад. Гэта было рады ў гады. Гаспадар гаспадара. Я сядня вару вячэру. Не давайце сабаку гарачага. У хворага гаручка. У лесе вядзецца зьвяр'ё. Коўдра зь пер'я — цёплая. Я гутару аб усім. Вячэру варылі на трыножку. На ўсходзе бачылі зару.

Р у мове крывіцкай толькі цьвярдое. Па р ніколі ня пішуць і, я, е, ё, ю, але ы, а, э, о, у, бо гэтыя літары паказуюць, што перад абазначанымі імі самагукамі стаіць цьвярды сугук. Дзеля таго-ж па р ніколі ня пішуць ь.

§ 39. Сугукі дж, ж, ч, ш.

Перапішы й падчыркні склады, у каторых ёсьць адзін ізь менаваных шыпячых сугукаў.

а) Дзякуй вам за чэсьць. Ляцелі гусанькі шэрыя. Шыюць шытнымі ніткамі. Баржджэй шыць на шытной машыне. Сыбота

шосты дзень у тыдню. Печ яшчэ цёплая. Чырвень — летні месяц. Хлеб чэрствы ня шкодзе. Ішоў буйны дождж. Па дажджы захаладала. Чытайце добрыя кніжкі. Жнейкі жалі жыта. Улетку бывае гарачыня. Пшчолы зьбіраюць мёд. У мору няшчысьлёная колькасьць рыбы.

б) Каня чорнай масьці завуць вараны. Чуваць быў шэпт людзкі. Ноч і дзень — пара. Жаўток жоўты. Дрожджы купляюць на пірагі. Птушкі выйшлі на жыр. Куры жыруюць на ральлі. Таго завуць жырным, хто мае ахвоту да яды. Стаялі парыжэлыя стагі. Жэрдка згадзілася на рубель. На шырокай дарозе добра разьмінацца. Тый хлеб, што зь мяжы, застаецца на нажы. За грошы — усюды харошы.

Сугукі дж, ж, ч, ш заўсёды цьвярдыя і дзеля таго па іх ніколі ня пішуць і, е, ё, а пішуць ы, э, о, бо гэтыя літары паказуюць, што перад абазначанымі імі самагукамі стаіць цьвярды сугук. Дзеля таго-ж, што дж, ж, ч, ш цьвярдыя, па іх ніколі ня пішуць ь.

§ 40. Цьвярдое ц.

Перапішы й падчыркні цьвярдое **ц**.

Малатарняй barжджэй змалоціш, як цэпам. Цэд робяць із аўсяной мукі. Пацы трэба труціць. Устаў цэўку ў чаўнок. Сёлета на цынк цэны высокія. Малец урэзаў палец. Ля рэчкі было відаць сялцо. За гадзінку цэлыя гоні ўзаралі. Бусел цыбаты. Карове даюць цэбар. У цаброх сечка. Цыган, як галее, дык сьмялее.

Выпішы словы зь цьвярдым **ц**.

Ці можа **ц** цьвярдое таксама паўстала з **т**? Не, **ц** цьвярдое не паўстала з **т**. Значыцца, ё **ць** — мяккое, паўсталае з **т**, і **ц** старое, цьвярдое, не паўсталае з **т**.

РАЗЬДЗЕЛ VIII.

Аканьне.

§ 41. Націск.

Калі кажам якое-колечы слова, дык адзін склад у ім вымаўляем мацней, галасьней. Гэтак, у слове »галава« галасьней вымаўляем апошні склад — **ва**, у слове »рэшата« галасьней вымаўляем першы склад — **рэ**. Галасьнейшае вымаўляньне аднаго

складу ў слове завецца націскам. Калі хочуць абазначыць **на**-**ціск**, дык ставяць гэт'кі значок над самагукам **(галава́).**

Націск бывае на розных складох. Прыклады: **харашыня** — націск на канцы, **матуля** — націск на перадапошнім складзе, **прыяцель** — націск на пачатку.

Перапішы й пастаў націск.

Зраньня выпала мядовая раса дый разьлілася па красках, па траве й па зямлі, быццам узяў хто ды сытою й апырскаў усю зямлю. Сонейка паднялося ўгару ды так прыгрэла, што ізь зямлі аж пара клубам пайшла, паваліла, бы з гаршка. Раса высахла, а мёд так і застаўся на траве ды на красках. Чмялі, пшчолы й матылі лётаюць, гудуць над краскамі ды ссуць мёд.

§ 42. а) Перапішы, зьвярнуўшы ўвагу на зьмену самагуку **о.**

Стол стаіць ля кута. На **стале** хлеб. Гарадзьбіты гарадзілі плот. Гарод мусіць быць абгароджаны. На платох сядзелі вароны. У лазьні ёё пол. Яўтух парыцца на палу. Вол карысная жывёла. Арэш на валу, сьпіш сьмела на палу (палку). Цесьлі ставяць дом. Харошы дамок Ціхонаў! У месьце вялікія дамы. Сена кладуць у копы. Чыя капа большая? Ногі трэба мыць. У лазе — на аднэй назе. Хто скомчыў гэты ком? Каму па каму, а табе два камы. Касьбіт косе касой. Вашыя косы пашчарбаліся.

Выпішы словы, што маюць **о,** ды выпішы, ставячы супроць іх, тую хорму іхнюю, у каторай ёсьцека **а.** Гэтак: **стол — на стале.** Што з гэтага бачыш? Але, **калі о стаіць бяз націску, дык яно заўсёды пераходзе** ў **а.** Значыцца, **ня бывае о бяз націску, а заміж яго кажацца й пішацца а.**

б) Перапішы й падчыркні словы з **а** на канцы.

Новае сіта на калку вісіць, а старое пад лаўкай валяецца. Цеста падыйшло. Стаіць карыта поўна вады наліта. Укінь палена ў вагонь. Сталася няшчасьце. Было вады па калена. Нашае рэшата папсавалася. Гэтае мыла мылкое. Жыта насьпела. Твае долата войстрае. Поле ўзарана й засеяна. У яго рукаво адарвалася. Дзіцё есьці захацела.

§ 43. а) Перапішы й зьвярні ўвагу на зьмену самагуку **э** (па цьвярдых сугуках).

Якія на рынку цэны? Цана паднялася. Вы колькі сцанаваліся за каня? Чаго ён чэпіцца? Сетка парвалася аб чэпы. Не

чапайце малога. Чапялой дастаюць скварадy. Наладзь мне цэп. Цапы вісяць на таку. У цапа зламалася цапільно. Разьнік зарэзаў вала. Чуваць брэх сабачы. Чые гэта сабакі брэшуць? Не брашы, цюцька, на свайго! Наш Жучок брахлівы. Малыя рэчкі цякуць у вялікую раку. Гэта брытва дзярэ. На вуліцы сучка брэша, а да мяне сябра чэша. Ейны пранік добра пяра. Адно бярэш, а другое даеш. Як кажаш, так і пішаш.

Выпішы словы з **э** (па цьвярдых сугуках), а супроць іх пастаў, выпісаўшы, свае ім із **а.** Гэтак: **цэд — цадзіць, цадзілка.** Што з гэтага бачыш?. Значыцца, **па цьвярдых сугуках э бывае толькі пад націскам. Заміж ненацісьненага э па цьвярдых сугуках, кажацца й пішацца а.**

б) Перапішы й падчыркні словы з **а** на канцы.

Загляне сонца і ў наша аконца. Аб іржышча пакалоў ногі. Сэрца закалацілася. Ой, у полю азерца, там плавае вядзерца. Пусьцілі каровы на лянынішча. У гэтай бутэлькі вузкое рылца. У вас збожжа ўдалося. Вогнішча яшчэ было цёплае. Зламалася шылца. Гумнішча добра ўрасло. Нёман цячэ ў Балтыцкае мора. У іх прасторнае дворышча. Маладзён пайшоў на ігрышча. Пагналі гусі на аўсяньнішча. Ці паедзеце вы на гліньнішча гліну капаць?

§ 44. Лічэньне складоў пры аканьню.

Звычайна склады лічацца ад пачатку слова. Прыкладам, у слове »велічыня« першы склад будзе ве-, другі — лі-, трэйці — чы, чацьверты — ня. У слове »пяршыня« першы склад — пяр-, другі — шы-, трэйці — -ня. Але можна таксама склады лічыць ад націску да пачатку слова. Тады ў тым-жа слове »велічыня« будзем лічыць ад націсьненага складу — **ня** і -чы- будзе першы склад, -лі — другі, ве — трэйці (ве(з) -лі (2) -чы (1) -ня). У слове »пяршына« (першы раз робленае поле) будзе: -на — склад націсьнены, -шы — першы склад ад націску да пачатку слова, пяр — другі склад ад націску да пачатку слова. **Не, без, перад, пераз, цераз** лічацца складамі таго слова, перад каторым стаяць. Прыклады: не (2) ма — (1) гу, безь (3) лясь (2) — ні — (1) — ка.

Перапішы й абазнач кажны склад лікам, лічачы ад націску да пачатку слова. Вось гэтак: ме (2) - ха (1) -ноша.

Цячэ рэчка не ўскалыхнецца,
Зь беражкамі не ўзраўнуецца,
Жоўтым пяском не замуціцца.
Ты, Матронка маладая,
За сталом сядзіш, ня ўсьміхнешся.

Адцьвітаньне.

Не шасьцяць каласы,
Звон ня валіцца з касы,
Не кладуцца ў стог пласты,
Толькі сыплюцца лісты
На яловыя кусты,
На сухія верасы.

Ня іскрыцца небазор,
Ня цьвіце трава - чабор,
Ня цыгліць птушыны стан,
Толькі поўзае туман.
Вецер б'е ў нямы курган,
Шапаціць імглісты бор.

Я. Купала.

Зацемка. Словы »перад, пераз, цераз« ня маюць на сабе націску.

§ 45. а) Перапішы й зьвярні ўвагу на зьмену ненацісьненага **е** па мяккіх сугуках.

Ужо вечар. Вячэра зварылася. Хадзеце, людцы, вячэраць! Чужыя землі добрыя, а свая зямля найлепшая. Нейкі зьвер разарваў курыцу. Узімку зьвяры злыя. Лес шуміць. Па лясох вядуцца зьвяры. Лясьнік забіў ліса. Ракі ў раццэ сталі весьціся. Павеяў вецер. Паўночныя вятры сьцюдзёныя. Ліпа дае цень. У цяню халадок. У мяхі ссыпалі гарох. Падай сюды мех. Дзякуй Богу за хлеб. Калі грыбно, то й хлябно. Бяз хлеба якая яда?

Выпішы словы з **е** па мяккіх сугуках а супроць іх пастаў, выпісаўшы, свае ім з **а (я)**. У якім складзе перад націскам (лічачы ад націску да пачатку слова) стаіць я?

У першым складзе перад націскам заўсёды пішацца я, а ня е.

б) Перапішы й падчыркні **я** ў першым складзе перад націскам.

— Ці гэта праўда? — Не, ня праўда. У няўмекі — рукі калекі. Вясна харошая пара году. Вялікдзень — вялікае сьвята. Пусьцілася зялёная траўка. Пусьці цяляты ў загарадню. Вялікага каменя далёка ня пусьціш. Дзяцюк пусьціўся на вясельле. Злодзей пусьціўся ўцекі. Дзяўчына зьвіла вянок. Жаўнер зьвярнуўся з вайны. Былі ў брата дзьве сястрыцы. Вучыся, нябожа,

вучэньне паможа ходацца зь нядоляй, зь няволяй. Сядня сыботачка, заўтра нядзеля, чаму ў цябе, малойчыку, кашуля ня бела? Ня стала малойчыку нітачкі ў голку. Кукуй, зязюля, да Пятра.

§ 46. а) Перапішы, зьвярні ўвагу на зьмену ненацісьненага »е« па мяккіх сугуках ды падчыркні **е** й **я** ў другім складзе перад націскам.

Старчысе далі мядзяк. Медзякі б'юць із медзі. Верасы цьвітуць увосень. Век векаваць тут ня будзем. Каму гараваць, таму ня ўміраць. Не пагаснуць зоркі ў небе. Дзяцюкі пайшлі ў войска. Цецярук такаваў на хвоі. У Пятрука добрая рука. Дай перавоз пераз раку! Гаспадыня купіла селядцоў. Даўней верылі, што ў лесе жывуць лясуны. Вераб'і зьвілі гняздо. Дзяўчынка секачом секла буракі. Секачы секлі лес. Лятуны лётаюць на лёталах. Бяз хлеба не наясіся. Такая прынука, як праца й навука, ці-ж можа нам сіл не дадаці? Іх тамка ня чуваць было.

Выпішы словы з **я** ў другім складзе перад націскам і асобна выпішы словы з **е** ў другім складзе перад націскам.

Калі ў першым складзе перад націскам няма а (я), дык у другім складзе перад націскам заўсёды пішацца я, а ня е (лясуна, Пятрука, ня ўміраці).

Калі ў першым складзе перад націскам ё а (я), дык у другім складзе перад націскам заўсёды пішацца е, а ня я (але й тады кажацца а, або гук няясны, блізкі да а, або на'т і). Прыклады: **верабей, векаваць, не пагаснуць.**

§ 47. Перапішы й выпішы словы з **е** ў трэйцім і дальшых складох перад націскам.

Чужым розумам век не пражывеш. Пральля зь верацяном прытулілася да печы. Цяперка прадуць безь верацяна. Я па табе, травачка, не нахаджуся. Няхай-жа судзяць, няхай і гавораць, мае натуры не перастановяць. Паляўнічы застрэліў цецярука. Велічыня нашае Бацькаўшчыны не малая.

У трэйцім і дальшых складох перад націскам е па мяккіх сугуках на пісьме ніколі не пераходзе ў а. Але й у гэтых складох у вымове ненацісьненага е ня чуваць.

§ 48. Перапішы й падчыркні **е** ў складзе па націску.

Наехала сватоў повен двор. Сьнегам вецер сыпе ў дзьверы,

ходзе шум па лесе. І пад гэты шум трывожны думае старая, а ў сьлед думкам неспакойны вецер падпявае. Жылі-былі два брацейкі.

Гэй, там пад ляском бярозка зь лістком
Усю восень шумела.
Ветрык павее — лісток зваліцца,
Адна ты шумець будзеш.

Па націску па мяккіх сугуках звычайна[1]) **е** на пісьме ў **я** не пераходзе. Але й тут ненацісьненае **е** не вымаўляецца. Звычайна па **мяккіх сугуках** у складох па націску ненацісьненае **е** вымаўляецца як **а (я).**

Ніколі ня чуваць ненацісьненага **о** й **е.** Заміж іх чуваць **а.** Ня рэдка можна чуць **заміж е** па мяккім сугуку гук нявыразьлівы, няясны, а рэдчас (часамі) ненацісьненае **е** па мяккім сугуку можна вымавіць як **і.** Гэтак, пішацца **верабей, велічыня,** а вымаўляецца — **вярабей, вялічыня, гукая,** або — **вірабей,** або як гук нявыразьлівы.

§ 49. Перапішы й выпішы словы зь **я** па мяккім сугуку ў складох па націску.

Хода выткала харошы пояс. Была месячная ноч. Узыйдзі, узыйдзі, ясен месячык. Із жыта выскачыў заяц. Прыяцелі адзін аднаму памагаюць. За грахі трэба каяцца. Шчырую каяту Бог прыйме.

Словы — **пояс, месяц, заяц, памяць, прыяцель, каята, тысяча і паходзячыя ад іх** — заўсёды пішуцца цераз **я,** бо ў іх **а (я)** старое, а не паходзячае зь ненацісьненага **е.**

РАЗЬДЗЕЛ IX.

§ 50. Вусьняныя сугукі б, п, м перад j а на канцы складу[2]).

а) Перапішы й падчыркні цьвярдыя вусьняныя перад гукам **j (ётам).**

На сенажаці зразалі куп'ё (купjо). У нас вялікая сям'я. У

[1]) **Звычайна,** бо ё ня мала прыпадкаў, калі ў складох па націску пішацца **я,** а ня **е.** Аб такіх прыпадках кажацца пры скланеньню й спражэньню.

[2]) Сугукі **б, п, м, в** вымаўляюцца вуснамі, дзеля таго яны завуцца вусьнянымі.

сям'і слухаюць бацькоў. Дзеці злавілі вераб'я. Яны далі вераб'ю крошак хлеба. На дрывотніку ляжала дуб'ё. У слоіку былі п'яўкі. П'янства найгоршая хвароба. Грэх п'янчыцца. У ваўторак снапоў сорак пшанічанькі б'ю, б'ю. Ня я б'ю, вярба б'е, за тыдзень — Вялікдзень. Зрэб'е благое палатно. Валялася чарап'ё. Уб'ю гвозд у сьцяну. Дзіцянё п'е малачко. Верка прагнала з канапель вераб'і.

Вусьняныя сугукі б, п, м перад j (ётаванымі самагукамі) заўсёды бываюць цьвярдыя.

б) Перапішы й падчыркні вусьняныя **б, п, м** на канцы слова і перад іншымі сугукамі.

Сем разоў дзесяць — семдзясят. Сем разоў сто — семсот. Я люблю галубы. Наш галуб харошанькі. Сьцеп парос высокай травой. Пятнанцаць і два будзе сямнанцаць. Цукер а соль могуць быць у драбох. Дроб цукру не памяняю на дроб солі.

Вусьняныя б, п, м на канцу слова і перад сугукамі заўсёды бываюць цьвярдыя.

РАЗЬДЗЕЛ X.

Зьмякчэньне сугукаў перад мяккімі сугукамі а перад j.

§ 51. Зьмякчэньне з, с перад мяккімі сугукамі а перад j.

а) Перапішы й падчыркні **з** перад **j**.

Мітрахван паехаў на зьезд. Ледзь зьехалі з гары. З гары цяжка зьяжджаць. Быў конь, ды зьезьдзіўся. Гаспадар купіў зьезд колаў. У зьезьдзе чатыры колы. Конь быў зьёхлены. Узьедзь на гэтую горку. Ізьелі ўжо стары хлеб. Узьеліся на нас нашыя варагі. На небе зьявілася камэта. Рэдка бывае такая зьява. Вясельнікі разьехаліся. Конь ізьеў зубы. Я ізьеў зубы на гэтай рабоце.

Перад j (зьезд - зьjезд) заўсёды з зьмякчаецца.

б) Перапішы й падчыркні **з, с** перад іншымі мяккімі сугукамі.

Пустой птушкі — пустыя й песьні. Сьліна бывае заразьлівая. Хто едзе на снасьці, а хто на шчасьці. Забялі буракі сьмятанай. Сьвет вялікі. Зьвяры хаваюцца ў норы. Зьмей кусаецца. Каня кусаюць сьляпні. Ня сьмейцеся зь нявіснога. Пасьпех — людзём на сьмех. Дзеці б'юцца ў сьнежкі. Сьвірэпка шкодзе

збожжу. На судзе сьветчыла шмат сьветак. Вучаньніку выдалі пасьветчаньне. Званок хораша зьвініць. Госьці былі на лазьбінах. Просім вас на чэсьць!

З, с перад мяккімі сугукамі бываюць мяккія, значыцца зь, сь.

в) Перапішы й падчыркні **зь, сь** перад мяккімі сугукамі.

У прочкі зьбірайся, а жыта сей. Ні сьцяты, ні павешаны. Трава зьвяла. Зьмялі поле мяцёлкамі. Валачобнікі ўзьвялічалі гаспадара. Ня было дзе разьмінуцца. Вада сьцякае далоў. Разьдзьмухай агонь! Узьняўся пыл на дарозе. Мірон расьпісаўся ў прашпарце. У банку разьмянілі грошы. Ськінь гэты кажух! У раськідона грош не завядзецца. Маці сьхінулася над дзіцянём. Расьпілуй гэта бярно. Ледзь ня зьгінулі ў дарозе. Лётала ўзьляцела з узьлецішча.

ґ) Перапішы й падчыркні мяккое **зь**, якое стаіць перад словамі, што пачынаюцца зь j або мяккога сугуку.

Бярозка зь лістком усю восень шумела. Зь вялікай хмары — малы дождж. Прыехаў дзед ізь лесу. Дасталі бульбу зь ямы. Абыйдуцца там і безь мяне. Ішлі неразь лес. Падарожнікі зьвярнуліся зь Вільні. Перазь яр (ярыну) зрабілі сьцежку. Пераскочыў перазь яму. Прыгналі статак ізь верасу. Зь пяску робяць шкло. Ішоў брат ізь сястрой. Мы былі зь імі (**= зь jімі).** Зь яблыкаў робяць віно. Бязь Юркі не абыйдземся. Церазь меру й конь не пацягне.

Калі з стаіць асобна перад словам, што пачынаецца зь j (накш кажучы, зь ётаванага самагуку) або мяккога сугуку, дык яно заўсёды пераходзе ў зь.

г) Перапішы й падчыркні **з, с** перад **к у** сярэдзіне слова.

Ля дарогі расьлі бярозкі. Няма мае коскі. Бог бача сіроцкія сьлёзкі. У Сымонькі сьветлыя валаскі. Дзеці зьбіралі каласкі. Шавец падбіў падноскі.

Перад мяккім **к** у сярэдзіне слова **з, с** не зьмякчаюцца.

§ 52. Ц перад мяккім сугукам.

Перапішы й падчыркні **ц**, што стаіць перад мяккім сугукам.

Яблыны цьвітуць белым цьветам. Цьвілы хлеб шкодзе. Краскі й дзервы цьвітуць, а травы й збожжа красуюць. Перазь цьмянае шкло блага відаць.

Ц перад мяккім сугукам таксама зьмякчаецца.

§ 53. Падвойныя мяккія сугукі.

Перапішы й падчыркні падвойныя мяккія сугукі.

У школе было чытаньне й пісаньне. Дзе п'юць, там і льлюць. Пяюльля, як званочак, зальлецца. Судзьдзя судзе. Калосьсе было сьпелае. Згулялі вясельле. Сьмяцьцё на сьметніку. Е розънае судзьдзе. Ахрэм прадаў конскае валосьсе. Ад кацелкаў засталося адно дудзьдзе. Рызьнік купляе рызьзё. Знахарка сушыла зельле. Сьвірэпка — пустазельле. Наш гадзіньнік добра йдзе. Абараньнік пячэ абаранкі.

РАЗЬДЗЕЛ XI.

Зьмены паміж словаў і на пачатку словаў.

§ 54. Прыстаўное в.

А) Прыстаўное в перад о.

а) Перапішы й падчыркні:

1. склад **во**, 2. а на пачатку слова.

У нашым возеру шмат рыбы. Ой, у полю азерца, там плавае вядзерца. Восень дажджлівая пара году. Восенскія дні хмарныя. Асянча — гэта трава, што застаецца на лузе з восені. Гэты парсюк — асянчук. Вольха расьце ля ракі. Альховыя дровы добра гараць. Пусьціўся расьці алешнік. Воспа цяжкая хвароба. У яго асьпяныя знакі на відзе. Стараста прывёз асьпяніка шчапіць дзяцём воспу. Волава мяккі коў. Алавяньнік робе алавяннае судзьдзе. Узімку вокны рэдка адчыняюць. Акно замерзла. Восвы кусаюцца. Язэпку ўжо адна асва ўкусіла. Бярэце вопратку й апранайцеся! Вочы бываюць розныя. Гэта відавочная праўда. Воцту дадаюць дзеля кісьлі. Абачыўшы айца, сын крыкнуў: »Войча, які ты добры!«. Ацец пачаставаў дзяцей цукеркамі. У калёсах зламалася вось. Лявон, Сілівон, Радзівон і Ларывон — суседзі.

Выпішы словы з **во** — на пачатку а супроць іх выпішы й пастаў тыя іх хормы, або свае ім словы, з **а** на пачатку. Гэтак: **вокны — акно.**

Што з гэтага бачыш? Але, **калі о стаіць на пачатку слова або складу, дык перад ім заўсёды бывае прыстаўное в. Але о**

ненацісьненае пераходзе ў а і перад такім а, як і перад а звычайным, ня бывае в прыстаўнога.

б) Перапішы й падчыркні **во-** й **а-** на пачатку слова.

Воглядніца кажны дзень мусіць аглядацца. Абады прыгатаваны да колаў. Не чапай асьвінага гнязда. Рашчыні акно. Крывічы, памагайце адны адным. Ні водзін не застаўся на другі год у клясе. Пастухі разлажылі агонь. Было вялікае вогнішча. Узімку надабе апранацца ў цёплую вопратку. Кажуць вобуй і абутак. Чаравікі, камашы, боты, валенцы, галёшы, сьнежнікі, — гэта ўсе вобуй або абутак. У вобуй абуваюцца. Вось добра пакоўзацца ў мароз! Мы абступілі непрыяцеля. Дзеці лезьлі да дзеда воступіцай. Абмяшайце жывёле. Каровам давалі сечку з вобмешкай. Мае вочы добра бачаць. З аччу пакаціліся сьлёзы. Надабе казаць праўду ў вочы й зачы. Вочнік — гэта сьветка, што сам бачыў, сваймі ачыма. Ворша паветавае места Аршанскага павету. Бабуля ў вобмаладзь пайшла (стала маладзець). Вольга й Волька добра вучацца. Алесь хораша пяе.

Выпішы словы з **а** на пачатку а супроць іх пастаў, выпісаўшы, або зьмяніўшы, іншую іх хорму — з **во-** на пачатку, або свае ім словы з **во-** на пачатку.

Б) Прыстаўное **в** перад **а**.

Перапішы й падчыркні **а** й **ва-** на пачатку слова.

Сёлета авес урадзіў. Гусі ў ваўсе. Выжані гусі з аўсу. На гумнішчу азярод. У вазяродзе снапы. Агонь хораша гарыць. Кінь палена ў вагонь. Адзін чалавек быў надта багаты. Захварэла ў ваднаго гаспадара дзіцё. Шануйце адзежу. У чыстай адзежы прыемна хадзіць. У вадзежы заводзіцца моль. Міхна жыве ў ваколіцы. Аколіцы Вільні харошыя. Акалічныя людзі справядлівыя. Араты арэ поле. Арба цяжкая работа. У варатага мазалі на руках. У Крывіі ўзімку часта бывае адлега. У вадлегу бывае мокра. Дзе мала асьветы, там шмат астрогаў. Ня зычым нікому быць у вастрозе.

Што стаіць перад словамі, што пачынаюцца з **ва**? Але, **па прыймені у або ў на пачатку слова заўсёды бывае прыстаўное в перад а. Калі імя, прозьвішча або назоў краю пачынаюцца з а, дык просьле у або ў у іх таксама перад а вымаўляецца пры-**

стаўное в, але ня пішацца. Кажацца — ў Вадама, у Вамэрыццы, але пішацца — **у Адама, у Амэрыцы.**

В) Прыстаўное **в** перад **у.**

а) Перапішы й падчыркні склад **ву.**

Навуму баліць у вуху. Ен леча вуха. На вуліцы стаяў цівун із работнікамі. У хлопчыка засьмяглі вусны. Вучаньнік вучыцца ў школе. Навука бывае розная. Павук тчэ кросны. У дзеда былі сівыя вусы. Дзіцянё было такое вутлае. У возеру купалася вутка з вуцянятамі.

На пачатку слова або складу ніколі ня бывае націсьненага у, а заўсёды ё ву, ці — накш кажучы — перад націсьненым у на пачатку складу заўсёды бывае прыстаўное в.

б) Перапішы й падчыркні словы із складам **ву.**

Вудаль вудою вудзіў рыбу. У яго зламалася вудзільно. У кузьні паляць каменным вугальлям. Карова выцялася аб вугол хлява. Хто гэты вусаты мужчына? Е розныя вузлы: засмаргаю, сабачы вузёл і іншыя. Аборка була нейкая вузлаватая. У балоце бываюць вужакі. Ткальля выткала вузкое палатно. Нашыя шнюры вузкаватыя. Скарадзьбіт наракаў на вузіню поля. У каровы ў скуры былі вугры. Вугорач — такая рыба. А Вугорцы такі народ. Вугорцы накш завуцца Мадзьдзярамі. Сталіца Вугры — Будапэшт. Есьцека й віно вугорскае. Муха ўблыталася ў павучыньне. Павук яго выткаў.

Выпішы словы із складам **ву.** Гэтыя словы і ўтвораныя ад іх заўсёды ўжываюцца з **в** перад **у,** як націсьненым, так і ненацісьненым. У іншых словах **у** вадных перад ненацісьненым **у** бывае **в** прыстаўное **(вучыцелка, вушак),** а ў другіх ня бывае **(умець, на ўме, наўчоны).**

в) Перапішы й падчыркні склад **ву** аднэй рыскаю а **у** або **ў** на пачатку складу дзьвюма рыскамі.

Вучыцелка вучыла ў школе. У краме прадавалі вугналі. Услон стаяў ля сьцяны. Укрой — ня ўдой. Умелька шмат умее. Убогаму далі лусту хлеба. Уцекачы дазналі шмат гора. У нашым возеру ё вукляя. Вуцяк ямчэй плаваў за вутку, а за вуцяняты і пагатове. Трэба быці ўпорыстым. Ня добра быць упорным. У вокны ўставілі вушакі. Наўчоныя людзі шмат ведаюць.

§ 55. Прыстаўное j перад і.

а) Перапішы, падчыркні і на пачатку слова ды зьвярні ўвагу, як яно вымаўляецца.

З малое іскры бывае вялікі пажар. Індыкі баяцца вады. Ільля наробе гнільля. У вадных селядцоў бывае ікра, у другіх — малако. Ігруша расла ля дарогі. На ёй было шмат ігрушкаў Іван надзер моху на імшару, ён будзе імшыць хату. У нядзелю пробаршч імшыў імшу, а вікары казаў казань. Іржа йзьела коску. У Ільлючонкаў вялікая хата. У сыботу ў іх было ігрышча. Ігра музыкаў усім падабалася. Вельмі хораша граў цымбалісты. Імя ягонае Пархвен. Ігор граў на дудзе.

Літара і, стаячая на пачатку слова, вымаўляецца як jі, накш кажучы, перад пачатным і ёсьць прыстаўное j.

б) Перапішы, падчыркні пачатнае і ды зьвярні ўвагу, як яно вымаўляецца.

На вясельлю быў Панас і Дзяніс. Іскрыпач хораша граў. Іскрыпка ягоная аж заліваецца. Крывіцкі князь Усяслаў ізваяваў сваіх непрыяцеляў. Істужкі ўплецены ў касе. Прыехаў цягнік із мукой.

Перад злучом і (і, стаячым асобна), перад і ў із асобным ды перад і ў із а іс на пачатку слова прыстаўнога j ня бывае, у гэтых прыпадках вымаўляецца бязь j.

На бач. 11. было паказана, што калі і стаіць па самагуку ў сярэдзіне, або ў канцы слова, дык перад такім і заўсёды бывае прыстаўное j (**паіць, паі, пяі, раі** = паjіць, паjі, пяjі, раjі).

§ 56. У а ў, стаячыя асобна і на пачатку слова.

Перапішы й падчыркні стаячыя асобна і на пачатку слова у аднэй рыскаю, а ў — дзьвюма.

Што каму на ўме, тый тое даўбе. Чалавек ён быў рахманы. Гарэлкі ў губу ён ня браў. Затое ў ласцы быў у пана, яго пан дужа шанаваў. Што ўбіў, то ўехаў. Мушка на аконцы ў цымбалікі тнець. А ў нядзельку раненька ўзыйшло сонца ясьненька. Крывічанская зямліца мяне ўзгадавала, маці ў мове крывічанскай песьні мне пяяла. Тады, хіба, перастане, як уся сарока бела стане. Куды ні глянь — усюдах зелена, усё расьце, усё сьпее, усё націваецца на сонцу. Пусты ўлетку нашы сёлы: усе на полі за сярпом. Сьмерць усюдах хадзіла, усюдах была. Па-

ехаў лясьнік у лес. Не пагаснуць зоркі ў небе. Сякач сек у лесе. Секачы секлі ў лесе. Ен умее. Яна ўмее.

Выпішы словы, што стаяць перад **у** (асобным або пачынаючым слова), і асобна выпішы словы, стаячыя перад **ў**. Просьле якіх словаў **ё у**, **и** просьле якіх **ў**. Ці просьле знакоў прыпынку бывае **ў**?

Значыцца, **калі ў папярэдняга слова на канцы самагук, дык ёсьцека ў** (стаячае асобна або на пачатку слова). **Калі на канцы папярэдняга слова ё сугук або паўсамагук (ў, й), дык асобна й на пачатку слова бывае у. Па знаках прыпынку бывае толькі у**[1]).

§ 57. Пераход і ў й.

а) Перапішы й падчыркні пачынаючыя слова **і** а **й** — **і** аднэй рыскаю, а **й** — дзьвюма.

Адклад ня йдзе ў лад. Жнеі йшлі дамоў. Край неба, дзе зайшло сонца, блішчэў чырвонаю йстужкаю. Пойдзем да Йвана на вясельле. Пагуляўшы, дзеці йзноў сталі вучыцца. Каля Ільлі пачалі йсьці дажджы. Юрка добра ймецца ў школе. Ня ймуць веры, каб пшчолы Йгоравы гэтулькі назьбіралі мёду. Але гэта праўда, бо Йгор добры зямец. Таксама Йгнату дае пшчэльня добры прыбытак. Калі трэба, казала, ідзеце сюды. Борзда імчаліся коні. Коні ў стайні ірзалі. Панас ізноў зьвярнуўся дамоў. Паляўнік ішоў на паляваньне.

Якое — націсьненае ці ненацісьненае і пераходзе ў **й?**

Выпішы словы, што стаяць перад пачатным **і**, ды асобна выпішы словы, стаячыя перад пачатным **й**. Просьле якіх словоў ё **і** и просьле якіх **й?** Ці просьле знакоў прыпынку бывае **й?** Зьвярнеце ўвагу, у якіх яшчэ словах **і** не перайшло ў **й**.

Пачатнае і ненацісьненае па самагуку папярэдняга слова пераходзе ў й. Калі перад і ё знак прыпынку, дык няма пераходу і ў й. Калі па ненацісьненым і пачатным стаяць у слове два сугукі, зь якіх першы або другі р, л, м, то такое і таксама ў й не пераходзе (на Ільлю, коні ірзалі, на імшары).

б) Перапішы й падчыркні асобна стаячыя **і** а **й** — **і** аднэй а **й** — дзьвюма рыскамі.

---

[1]) Знакі прыпынку абазначаюць паўзу, прыпынак, а просьле прыпынку, як і на пачатку гутаркі, немагчыма вымавіць ў.

Увосень.

Агаліўся й парадзеў лес. Стаіць, як сірата, смутны й маркотны. Адзін вецер ня мае сабе прыпынку. Носіцца ён па голай зямлі, круце сухое лісьце і расьсявае сьпелую сяўбу з травы й дзерваў. Усё чарнее й траце свой колер, толькі жыта маладое расьце й рунее. Усё хаваецца ад сьцюжы й дажджу.

Шмат рэкаў пачынаецца ад сьнягоў, што таяць у горах. Яны цякуць далоў гаманкімі ручаямі й вадападамі. Па дарозе падмываюць груды лёду й сьнегу.

Гадавалі нас поле, бор і лог Крывіччыне-маці. Важыш на рыбку, важ і на юшку. Дзе прапала кароўка, там няхай і вяроўка. А зьнізу мяккі ветрык вее, і сонейка так цёпла грэе. На гэтае лета добра й гэта. Які сакавік, такі й красавік. Якое дзерва, такі й клін, які бацька, такі й сын. На галодны зуб добра й гэта. Якая птушка, такія й песьні.

Што вы зацемілі?

Але, асобнае і пераходзе ў й, калі стаіць па самагуку папярэдняга слова ды адно тады, калі луча два словы, адказуючыя на тое самое пытаньне, або можа быць заменена словам »таксама«. У вапошнім прыпадку, калі і не паўтараецца. Па знаках прыпынку няма пераходу злуча і ў й.

§ 58. Прыстаўное і.

а) Перапішы, падчыркні **з, зь** ізь першым гукам наступнога слова раз, а **із, ізь** ізь першым гукам наступнога слова — двойчы.

Елі кашу із скваркамі, а капусту з хлебом. Піліп зьвярнуўся із службы. Прыймі кніжку із столу, а другую — з лавы. Прыйшоў брат ізь сястрой. Бацька із сынам паехаў на места. Яны былі на кірмашы із сваім таварам. Напякла Ганулі пірагоў із сырам, зь яблыкамі, зь ягадамі, із смажэньнем. Вясна пабудзіла жабы ізь зімовага сну. Муж із жонкаю паехалі ў госьці. Гаспадар таргаваўся із Жыдам. Людзі стаялі із шапкамі ў руках. Зьдзер кару із сука. Гіцаль злупіў скуру із сабакі.

Перад з, с, зь, сь, ж, ш наступнога слова да з, зь дадаецца і.

б) Перапішы, падчыркні **з, зь** із апошнім гукам папярэдняга слова раз, а **із, ізь** із апошнім гукам папярэдняга слова двойчы.

Ішоў Тодар із Тадорай, знайшлі лапаць із аборай. Прыехаў

дзед ізь лесу. Хай воля вечна будзе з намі. Выйшаў вучыцель ізь дзяцьмі. Прыехаў гандляр із таварам. Брат дзяліўся апошнім із Гапулькаю. Нашыя рана выехалі зь места. Прыехаў скарадзьбіт із поля. У хатцы жыў лясьнік із малой дачушкай. Гаспадар строс аўсянкі з выкаю каровам. Госьціца выскачыла з калёс і пабегла ў хату. Стары зь мяшком на плячох цягнуўся па дарозе. Ен із кніжкаю траха не разлучаўся.

Па сугуку папярэдняга слова да з, зь дадаецца і — заўсёды, калі наступное слова адказуе на пытаньне з кім? з чым? а калі наступное слова адказуе на пытаньне з чаго? (з чаго штось зроблена) **або скуль** (калі ізь сярэдзіны, з нутра чаго, прыкладам зь места, зь лесу), **дык і можа да з не дадавацца. Па паўсамагуку (ў, й) папярэдняга слова і да з, зь таксама можа не дадавацца.**

ЧАСЬЦЬ III.

СКЛАНЕНЬНІ.

РАЗЬДЗЕЛ XII.

Спакмень.

§ 59. Перапішы й падчыркні назовы судзьдзя.

Судзьдзё.

Вучыцель загадаў дзяцём напісаць аб судзьдзю ў іх. Алеся напісала гэтак: »У нас рознае судзьдзе. У судніку стаяць талеркі, белыя і ў розныя красачкі, паліваныя місы, сподкі, шклянкі, кубкі, салянка із сольлю і іншыя. У печы гаршкі й скавароды. У шахве жбаны, латушкі, глякі, бутлі, бутэлькі, слаі. У стопцы стаіць бойка, у каторай б'ём масла, дзяжа на хлеб і дзежка на бліны. У сянёх начоўка, карытца, цэбар і рашка. На дворышчу карыта з вадою. У сьвірне (клеці) апаланка да апаланьня грэччыны і іншага, кубел на мяса і іншае«.

Да надрукаванага судзьдзя дадай тыя судзіны, што знаеш, але каторыя тутка неменаваны.

§ 60. Снадзівы.

Перапішы й падчыркні кажнае снадзіва.

Вячка акуратны хлопчык. Навучыўшыся лекцыі, ён гатуе ўсё ў школу назаўтрае. Пяро, асадку, алавікі, астрылца і іншыя снадзівы кладзе ў пярэчнік. У пярэчніку таксама ё колькі шчэпнікаў і блышчыкаў. А пярэчнік, кніжкі й сшыткі паложа ў торбачку. Туды-ж паложа таксама макацеліцу з чэрняю.

Ці ўсі людзі маюць аднолькавыя снадзівы? Ці знаеш майстроў? Якія ў іх снадзівы? Пералічы снадзівы кравецкія, шавецкія, сталярскія, мулярскія.

§ 61. Струмэнты.

Перапішы й адкажы на пытаньні.

На чым грае дудар? (Дудар грае на дудзе). На чым грае цымбалісты? На чым грае гусьляр? Якіх яшчэ знаеш музыкаў? Пералічы, якія знаеш музыцкія струмэнты. Які табе музыцкі струмэнт балей (больш) падабаецца, іскрыпка ці дуда? Якая розьніца між дудой а дудкаю?

§ 62. Снасьць.

Перапішы й падчыркні снасьць.

Панас гаспадарлівы чалавек. Перад вясной ён агледзе калёсы, плуг і барану. Увосень, яшчэ сьнегу няма, а ў яго ўжо агледжаны сані. На санёх і ў калёсах езьдзяць улегцы або з возам. Санны воз завецца саньнік, а калёсны калясьнік. У касьбу й жніво Панас возе калясьнікі сена й снапоў. Узімку возе сань-

нікі дроў ізь лесу і збожжа ў млын. У сячкарні Апанасовай заўсёды войстрыя нажы. Малатарня й сячкарня змазаны алівай. Колы ў ягоных калёсах намазаны каланіцаю.

Калёсы, сані, плуг, барана і іншае пад., — гэта ўсё снасьць.

Прыказка: хто едзе на снасьці, а хто на шчасьці.

Якую яшчэ знаеш снасьць? Напішы!

§ 63. Гародніна.

Перапішы й падчыркні гародніну.

Даўно ўжо вясна. Як хараша на дворы! Дзеці прыбеглі із школы. Яны выбеглі ў гарод. У гародзе на градах расьце ўжо гародніна. Тут і цыбулька, і бурачкі, салата, шпінак, гуркі. Толькі моркава яшчэ не абыйшла. Націна ў бурачкоў малая. Яшчэ рана ламаць бацьвіньне. Карэнчыкі гародніны яшчэ меншыя, а цьвет яшчэ не паказаваўся. Найбольшы вырас мак. У яго ўжо ладнае сьцябло.

§ 64. Садовіна.

Перапішы й падчыркні садовіну.

А як хараша ў садзе! Садовыя дзервы ў цьвеце. Пшчолкі гудзяць і зьбіраюць мёд. Ой будзе сёлета ў нас садовіны! Будуць вішні, лепшыя за іх чарэшні, мядуначкі йгрушы. А колькі розных яблыкаў!

Між садовых дзерваў растуць ягадныя кусты: парэчкі, смуродзіна, яграст, маліны.

У гародчыку пусьціліся краскі. Пасадзіла іх Зулька. Яна іх і палівае.

§ 65. Санажаць, поле, лес.

На санажаці зазелянелася травіца. Там ходзяць каровы й коні. У рэчцы плаваюць качкі й гусі. Індыкі воддаль ад ракі, яны баяцца вады. За садам цягнуцца палі. На палёх збожжа. З аднаго боку жыта, з другога яр — ячмень, авес і іншае. Нядаўна пасадзілі там такжа бульбу й пасеялі лён.

А за полям цямцішца лес. У лесе вядуцца зайцы, лісы, ваўкі, дзікі, ласі. Вядуцца ў лесе й розныя птушкі. На сяле людзі маюць свойскую жывёлу, а ў лесе вядзецца дзікая.

Скажэце, аб чым вы пісалі ад § 59. дагэтуль?

Судзьдзе, снадзівы, стрўмэнты, снасьць і іншыя рэчы, расьліны, жывёла, людзі й Бог, — усё гэта **спакмяні.** Спакмянямі яшчэ завуцца такія поймы, як **сьцюжа, гарачыня, голад, жаль, плач, голас, сьмех,** бо на ўсё гэта мы можам зварочаваць нашую ўвагу, усё гэта можам спакмячаць нашым розумам.

Назовы спакмянёў завуцца спакменнымі йменамі або спакменьнікамі. Спакменьнікі адказуюць на пытаньне хто? што?

§ 66. Спакмяні чуцьцявыя.

У чалавека ё пяць чуцьцяў: зрок, слух, вошчуп, нюх і смак.

Спакмяні, што мы пазнаём гэтымі чуцьцямі, завуцца **спакмянямі чуцьцявымі.** Сюды належаць розныя рэчы, расьліны, жывёла й людзі. Прыклады: стол, мятліца, дуб, пятух, Алехна. Гэтак, прыкладам яблык, мы пазнаём зрокам, гледзячы на яго, пазнаём па паху, пазнаём таксама вошчупкам.

Такія чуцьцявыя спакмяні, як **пясок, жвір, цукер, вугальле, воўна, мяса, тварог, малако,** завуцца **матар'яльныя.** У матар'яльных крышка спакмяню завецца аднолькава зь яго мноствам, прыкладам жменя пяску і гара пяску.

Таковыя чуцьцявыя, як **лес, сад, рой, народ, збор,** завуцца **зборныя.**

Кажны зь іх складаецца з мноства асобных спакмянёў (лес із асобных дзерваў, рой з мноства пшчолаў, народ із асобных людзёў).

Да чуцьцявых належаць яшчэ **жывыя творы** (людзі й жывёла) і расьліны.

Усі засталыя чуцьцявыя спакмяні завуцца рачавымі або конкрэтнымі, бо абазначаюць рэчы (стол, кол, хата, нож).

З дагэтулешніх укладаньняў выпішы па 4 спакмяні рачавыя.

З дагэтулешніх укладаньняў выпішы асобна ўсі спакмяні матар'яльныя і асобна ўсі спакмяні зборныя.

Назовы спакмянёў чуцьцявых (рачавых, жывых, матар'яльных і зборных) завуцца спакменьнікамі чуцьцявымі, што дзеляцца на рачавыя, жывыя, матар'яльныя й зборныя.

§ 67. Спакмяні разумовыя.

Тыя спакмяні, што пазнаём розумам, завуцца разумовымі (смутак, весялосьць, справядлівосьць, праўда, стук, плач, сьмех і да г. пад.).

Перапішы й падчыркні разумовыя спакмяні.

Максім мусіў уцякаць із Бацькаўшчыны. Ен апынуўся на чужыне. Цяжка там было Максіму. Апанавала яго туга за бацькаўшчынай. Смутак ня сходзіў зь ягонага віду. З дому йшлі лісты аб зьдзеку непрыяцеляў над Крывічамі. Ен чуў у сваім сэрцу крык і плач мучаных людзёў. Гневам загаралася ягонае сэрца і жадала помсты.

Але вось прыйшлі ведамкі, што народ будзе вольны. Максім падскокаваў з радасьці. Надзея ўлілася ў ягонае сэрца. Цяжар зваліўся зь ягоных грудзёў. Зьявілася весялосьць і сьмех. Ен спадзяваўся справядлівосьці й вызваленьня свайго народу. Але заўзятасьць ня зыходзіла зь ягоных вуснаў.

Значыцца, спакменям завецца ўсё тое, што мы пазнаём нашымі пяцьма чуцьцямі й розумам.

Назовы спакмянёў разумовых завуцца спакменьнікамі разумовымі або абстрактнымі.

§ 68. Собскія ймёны.

Прыгледзьцеся да спакменьнікаў, надрукаваных тутка чорнымі літарамі. Чаму іх пішам ізь вялікай літары? Чым яны розьняцца ад іншых?

Крывія вялікі край. У **Крывіі** шмат харошых рэкаў. З рэкаў найбольшыя **Дзьвіна, Нёман** і **Дняпро.** Ля **Дняпра** стаяць старыя месты крывіцкія — **Смаленск, Магілеў** і іншыя. **Гомель** стаіць ля **Сожа,** прытоку Дняпровага, а **Пінск** ля **Піны. Піна** ўцякае ў **Прыпяць,** правы прыток Дняпроў. Ля **Дзьвіны** ўзноў маем найстаршае места **Полацак** а **Віцебск.** Слаўны стары **Горадзен** стаіць ля **Нёмна. Вільня** — ля прытоку Нёмнавага, **Вяльлі.**

Адныя спакменьнікі — гэта ймёны, што даюцца толькі некаторым людзём, жывёле, краём, рэкам, азёрам і пад., каб адрозьніць іх ад іншых да іх падобных, прыкладам Сьцяпан, Настася, Берасьце, Беласток, Смаленшчына, Нарачча. Гэт'кія спакменьнікі завуцца собскімі ймёнамі. Імёны, прозьвішчы й мянушкі людзёў, імёны жывёлы (Рагуля, Жучок), назовы краёў, месцавосьцяў, рэкаў, азёраў, местаў і пад., — гэта ўсё собскія ймёны. Собскія ймёны пішуцца зь вялікай літары.

Іншыя спакменьнікі, як **хлапец, дзяўчына, карова, сабака, край, рака, возера, места** абазначаюць шмат падобных асобаў, жывёлы і пад., ужываюць іх часта, агульна, дзеля таго завуцца яны спакменьнікамі **агульнымі.**

Да агульных належаць таксама **неба й сонца.** Хоць кажны з гэтых двух спакменьнікаў абазначае адну рэч, але ня собскія гэта іх імёны, бо не даём іх дзеля адрозьненьня ад іншых падобных рэчаў.

Перапішэце й падчыркнеце собскія ймёны.

Вучаньнікі паехалі на выбег. Яны былі на Палесьсю. Плавалі па раццэ Прыпяці. Лавілі рыбу ў возеру Князь. Раўнавалі яго да Нарачча ў Віленшчыне. Былі ў Тураве й Берасьцю. Адзін із вучаньнікаў, Міхна Аляшкевічык, пастанавіў апісаць сваё падарожжа. А Зулька Туранка напісала аб Палесьсю харошы вершык. Разам із школаю езьдзіў на выбег Лыска, сабака Гапановічаў.

РАЗЬДЗЕЛ XIII.

Роды спакменьнікаў.

§ 69. Перапішы і, аб якім спакменьніку можаш сказаць **мой,** падчыркні раз, аб якім **мая,** падчыркні двойчы, і аб якім можаш сказаць маё, падчыркні хвалькамі.

Ляцела дзераўцо цераз наша сялцо,
Ды з таго дзераўца ставілі царкоўку,

Ды ў тэй царкоўцы тры месяцы ясных,
Тры зарыцы красных (значыць харошых),
Ды першы-ж месяц — малады Мадэстка,
Ды другі месяц — малады Янутка,
Ды трэйці месяц — малады Язэпка.
Ды першая зарыца — малада Ганначка,
Ды друга зарыца — малада Сабінка,
Ды трэйця зарыца — малада Марылька.

Усе спакменьнікі дзеляцца на тры роды — мужчынскі, жаноцкі й ніякі. Калі аб спакменьніку можам сказаць **мой,** дык ён мужчынскага роду **(стол),** калі — **мая,** дык жаноцкага **(лава),** калі — маё, дык ніякага роду **(акно).**

Заміж **мой, мая, мае** дзеля пазнаваньня роду можна ўжываць **твой, твая, тваё; свой, свая, сваё; ён, яна, яно; адзін, адна, адно.**

Перапішы й абазнач роды пачатнымі літарамі над спакменьнікамі.

Ходзіць-паходзіць ясны месяц на небе,
Лічыць-палічыць зорачкі на небе.
Не далічыўся аднэй зорачкі-зарыцы:
Пайшла зарыца яснаму сонейку служыці!

Ходзіць-паходзіць Ганульчын татка па хаце,
Не далічыўся аднэй Ганулькі - дзіцятка:
Пайшла Ганулька свайму Яначку служыці,
Не на дзянёчак, не на гадочак — на ўвесь век!

——х——

Рада, рада шэра перапёлка,
Што лета даждала.
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.

Перапішы й выпішы асобна спакменьнікі мужчынскага роду, асобна жаноцкага і асобна ніякага.

Сабака ляжаў пад яблынай. Зь яблыны зваліўся **яблык.** Сабака гыркнуў на яблык. Недалёка быў **кот.** Ен спужаўся сабакі. **Гусь** таксама спужалася.

Сабака брэша і **ліс** брэша. Ліс хітрэйшы за сабаку.

Гаспадар загадаў сыну Адолю рэзаць **дзярно.** Ен хацеў вылажыць дзярном бакі наспы. Рэжучы дзярно, Адоль аб зямлю ўпэцкаў **рукаво.** Абачыўшы гэта, ён нахмурыў **брыво.** Бровы ў Адоля густыя. Парабіўшы, Адоль сеў пасілкавацца. Ізь зьвязку дастаў ён хлеб, яйцо і малы **дроб** солі. У яйцу Адоль балей любе **жаўток,** як **бялок,** але бялок сытнейшы. Звычайна Адоль майструе. Ен сталяр. Учора ён зрабіў **ложак.** Брат Адолеў шавец. Ен шые добры **вобуй** або **абутак.**

Уламжэце самі проказі із спакменьнікамі, што надрукаваны тутка чорнымі літарамі.

Слова »сьцеп« мужчынскага роду. Прыкладам: сьцеп парос высокай травою.

§ 70. Ня мала ё спакменьнікаў, што бываюць раз мужчынскага, а другі раз жаноцкага роду, залежна ад таго абазначаюць яны мужчыну ці жанчыну. Гэт'кія спакменьнікі завуцца спакменьнікамі **супольнага роду.**

Перапішы й падчыркні спакменьнікі супольнага роду.

Каго як завуць?

Хто ня мыецца, тый нямыцька.
Хто забываецца — забудзька.
Хто лянуецца — лянуцька.
Хто памалу робе, порыцца, тый пароцька.
Хто лянуецца, абівае бакі, тый абібока.
Недалужнага чалавека завуць недалуга.
Памаўзьлівага, што ўлезе ўсюдах, дзе ня
можна, — памаўза.
Таго, што ўпэцкаўшыся, умурзаўшыся — мурза.
Беднага, голага — галеча.
Таго, што ў гору жыве, »пякае гора« — гарапяка.
На няўдалага скажуць неўдаляка.
На вельмі скупога скажуць скупіндзя, жмінда.
На таго, што часта бывае не здаволіўшыся,
крывіцца, кажуць крывіндзя.
Бывае, на сьляпога зьняважліва скажуць сьлепанда,
на глухога — глуханда.

——х——

Поэта піша вершы. У няўмекі — рукі калекі. Хвалько нахваліцца, а будзька набудзецца. Рыгор спадкаемца, ён дастаў спадак па цётцы. Наталя таксама спадкаемца, яна дастане спадак па дзядзьку. Спадкаемцу завуць яшчэ начасьнік, а калі жанчына, дык начасьніца. Хто прыймае, тый прыемца.

Е й шмат іншых спакменьнікаў супольнага роду.

РАЗЬДЗЕЛ XIV.

Спакменьнікі зьменшаныя й любасныя.

§ 71. Спакменьнікі зьменшаныя.

Перапішы й падчыркні меншыя спакмяні.
У ката вялікая лапа — у кацяняці малая лапка.
У Пётры вялікая рука — у Пятруся малая ручка.
У месьце ё вялікія вуліцы і малыя вулкі.

На садовай яблыне вялікія яблыкі, а на дзікой малыя яблычкі.

У Менску вялікія крамы, а ў Койданаве малыя крамкі.

Скарбовы лес вялікі, а наш малы лясок.

Ля старога дуба пусьціўся расьці малады дубок.

Рыбак большую рыбу забраў у мех, а малую рыбку пусьціў назад у раку.

—х—

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Куплю чаравічкі,
Малы, невялічкі.
Дарожка крывая,
Кабылка сівая.

Назовы меншых спакмянёў завуцца спакменьнікамі зьменшанымі.

§ 72. Часта бывае, што якісь спакмень вымаўляем із любасьцяй, зь любоўю.

Перапішы й падчыркні спакмяні, вымаўляныя зь любасьцяй.

У нядзельку раненька
Татка коніка поіць,
Дужа жаласна плача.
— Ды па кім, мой татульку,
Ды так жаласна плачаш?
— Па табе, мой сыночку,
Па табе, мой міленькі.
На вайну ты паедзеш,
Ах, адтуль ці прыедзеш,
Павязеш свае плечы
Пад маскоўскія мечы,
Павязеш сваю галоўку
На чужую старонку.

—х—

Сонeнька-каласок,
Закаціся за лясок.
Сонeнька нізенька,
Нам да хаткі блізенька.

Назовы спакмянёў, вымаўляных зь любасьцяй або любоўю, завуцца спакменьнікамі **любаснымі** або **любовымі.**

Перапішы й падчыркні любасныя спакменьнікі.

Лётала паванька па шчырым бару,
Раніла перайка ў зялёну траву.
Ня жаль-жа мне паванькі, ні пер'я яе —
Ды жаль мне дзіцяці ў чужой старане.
Як шчыра рыбанька без вады б'ецца,
Так маё дзіцятка сьлізою льлецца.

Часта цяжка або й немагчыма адрозьніць спакменьнікі любасныя ад зьменшаных.

Перапішы й падчыркні зьменшаныя й любасныя спакменьнікі.

Пайшоў каток у лясок,
Знайшоў каток паясок,
Таму-сяму прадаваў,
А Ганульцы дарма даў.

Пайшоў каток на таржок,
Знайшоў каток піражок,
Таму-сяму прадаваў,
А Гапульцы дарма даў.

Пайшоў каток на беражок,
Злавіў рыбку за хвасток,
Таму-сяму прадаваў,
А Антольцы дарма даў.

§ 73. Хормы зьменшаных і любасных спакменьнікаў.

Зьменшаныя й любасныя спакменьнікі бываюць рознае хормы. Адныя зь іх маюць суфікс — **ік** (па зацьвярдзелых сугуках — **ык**): агончык, баранчык, госьцік, гарлачык, гародчык, дожджык, дубчык, жарэбчык, Іванчык, кабанчык, каменчык, карэнчык, крэменчык, крыжык, ласунчык, малойчык, ражэнчык, сысунчык, складанчык (складаны ножык), спадманчык, сядунчык, цыганчык.

Як бачыце, у зьменшаных перад — **чык** ё заўсёды н цьвярдое (**агончык** і г. д.).

Суфікс — **іца**: вадзіца, гарыца (=горка), зарыца, зямліца, кніжыца. На першай ральліцы родзіць жыта-пшаніца.

Суфікс — **ок** (не пад націскам — **ак**): браток, вазок (малы воз і род саннай вязені), гаёк, гадок, гаспадарок, грыбок, грудок, дамок, драбок, дубок, задок, зубок, калок, капылок, каток, кулёк, кусток, куток, лабок, лянок, лісток, масток, мядок, мядзьвёдак, павадок, пылок, равок, радок, разок, ражок, раёк, расток, садок, сваток, снапок, ставок, стажок, шасток, часок.

Гэтыя зьменшаныя яшчэ могуць меншаць, драбнець і тады маюць хорму на **-очак** (па шыпячых часта — **эчак**): браточак, садочак, мяшэчак, гаршчэчак і іншыя.

На — **ка**: грыўка, дужка, копка, ягадка, вочка і інш.

Калі гэтыя зьменшаныя яшчэ меншаюць, дык ад іх паўстаюць зьменшаныя на — **ачка**: грывачка, розачка (ад розка), рыбачка.

Зьменшаныя імёны мужчынскія на — **ук**: Янук, Вінцук, Зьмітрук, Міхалюк, Паўлюк, Пятрук. Гэтак завуць хлапцоў.

Спакменьнікі ніякага роду на — **цо** (не пад націскам — **ца**): азярцо, аконца, вядзерца, дабрыццо, жытцо.

Л перад ц спакменьнікаў ніякага роду на — цо (-ца) заўсёды цьвярдое: астрылца, білцо, вяселца (ад вясло), елца (куст ялягі), жыгалца, каромыселца, колца, коўзалца, крэселца, крылцо, сямылца, маселца, памялцо, перавеселца, рылца, салца, сілцо, сядзелца, сялцо, сьцебялцо, шкелца, тачылца, целца, цяпелца.

Л тут вымаўляецца на зубах, яно накшае, чымся л, прыкл., у **словах вол, кол.**

Перапішы й падчыркні зьменшаныя спакменьнікі на — **цо (ца).**

Міхась зайстрыў алавік астрылцам. У вялікага звана ё біло, а ў малога білцо. Сталыя весалавалі вёсламі, а дзеці вяселцамі. Кусаючы, пшчала пакідае ў целе жыгалца. Падай дзіцяці крэселца. Зрабілі колцы да цялежкаў. У ланцузе шмат колцаў. Крылцы ў матыля харошыя. У гэтай бутэльцы вузкое рылца. Гаспадыня ўзяла салца на мазку. Сілом сіляюць вялікія птушкі, а сілцом — малыя. У нас вялікае сяло, а ў іх малое сялцо. Татка купіў сынку коўзалцы. Вялікія каўзуны коўзаюцца на коўзалах, а малыя на коўзалцах. Целца дзіцяняці далікатнае. У крыві ё белыя й чырвоныя целцы.

Любасныя мужчынскага роду на **-хна:** Алехна (ад Аляксандра), Міхна (ад Міхал).

Любасныя на — **ухна:**

Рэчка з рэчухнай разьліваецца. На бярозе птушухны-салаўі пяюць. Сыботухна нядзелюхне гадзіла. Ляцелі гусухны церазсад. Зялёная дубровухна, ды што ў цябе дуб'я мала? Цярэшка — цярэшухна, цераз бор дарожухна. Устань, татухна, устань родны, парадухну дай!

Ды, як у мамухны была,
Я, як рожухна, цьвіла,
Ды, як мачынка, сьпела,
Як вішанька у садочку,
Як пчолухна у лясочку.

Любасныя на — **хнейка:** Паедзем, мой брахнейка, у дарогу.

Любасныя на — **ейка:** брацейка, лецейка.

Любасныя жаноцкага роду на — **анька:** хатанька, раданька, рыбанька, сёстранька, цётанька.

Любасныя асобавыя спакменьнікі мужчынскага роду на — **ка з папярэднім зьмякчоным сугукам:**

Гапонька (ад Гапон), Дзямідзька (ад Дзямід), Сымонька, Сьцяпанька. А мой-жа ты, суседзька! У Антонькі ды явар на двары. Не забудзься, Лявонька, на татухну! Ігнацька ў госьці прыехаў. Прыедзь, прыедзь, Раманька!

Каціласе бервянцо
Цераз наша сялцо.
А на тым бервянцы
Ды чатыры малайцы:
Першы маладзец —
Малады Іванька,

Другі маладзец —
Малады Міхалька,
Трэйці маладзец —
Малады Платонька,
Чацьверты маладзец —
Малады Панаська.

——х——

А я дзеду зраблю беду —
На кірмаш не паеду!

Звару сала, сьпяку блін,
Каб мой дзедзька дома быў.

Гэтым любасным адказуюць зьменшаныя на — **ка** безь зьмякчэньня папярэдняга сугуку. Гэтак любасныя **Іванька, Міхалька,** а зьменшаныя **Іванка, Міхалка** і пад.

Калі перад **к** луча сугук, што ня можа зьмякчыцца (**р,** вусьняныя **б, м, п** перад сугукам), тады няма розьніцы ў вымове паміж асобавых любасных мужчынскага роду на — **ка,** а такіх-жа зьменшаных. Прыкладам, **Рыгорка, Максімка** могуць быць, як любасныя, так і зьменшаныя. Тое самое бывае, калі ў звычайнай хорме слова ё на канцы мяккі сугук: **вучыцель — вучыцелька, Васіль — Васілька** і пад.

Менаваныя любасныя могуць таксама зьмяншацца і тады маюць хорму на — **ечка (Іванечка, Васілечка).**

Любасныя спакменьнікі асобавыя на — **ля:** Антоля, Аўдоля, Ядзьвіля, Марыля.

Любасныя спакменьнікі асобавыя на — **уля:** Дзядуля, бабуля, татуля, матуля, братуля, сяструля, сынуля, Ғануля, Гапуля, Зуля, Маруля, Настуля.

Любасныя асобавыя мужчынскага роду на — **уль:** Вайцюль, Вінцуль.

Любасныя асобавыя спакменьнікі жаноцкага роду на — **ся:** бабуся, Алеся, Антося, Ядзьвіся, Ғануся, Дамініся, Каруся, Кастуся, Людзьвіся, Марыся, Пятруся.

Любасныя асобавыя спакменьнікі мужчынскія на — **сь:** Алесь, Антось, Міхась, Карусь, Кастусь, Пятрусь.

Е яшчэ й іншыя хормы зьменшаных і любасных спакменьнікаў.

Уніжэй надрукаванай песьні маем побач розныя любасныя й зьменшаныя спакменьнікі.

Гарнастай наш Іванька,
Па застольлейку ходзіць,
У руках шапачку носіць,
Свайго брахненьку просіць:
— Ды не забаўляй мяне, брахненька,
Мая цешчухна горда,
Яна ня пусьціць на двор позна,
Яна не аддасьць свае дачкі,
Свае дачкі ды каханачкі,
Вароцейкі замыкае,
То ў тры замкі, то ў чатыры,
А й у пяты залаты.

——х——

РАЗЬДЗЕЛ XV.

Некаторыя асаблівасьці спакменьнікаў.

§ 74. Назовы маладога лесу маюць хорму на -нік: маладнік, алесьнік, алешнік, асіньнік, дубнік, ляшчыньнік, хвойнік, зарасьнік, кляньнік.

Пайду, пайду па бярэзьнічку, я дроўцы пазьбіраю, па ельнічку, па сасоньнічку я лучынку пашчапаю.

Назовы складзішчаў маюць найчасьцей хорму на — нік: дрывотнік, качарэжнік, каласьнік, суднік, пярэчнік, сьметнік.

Таксама назовы хлявоў: аўчарнік, сьвінарнік, кароўнік.

Мужчынскім спакменьнікам на — **ун (юн)** адказуюць жаноцкія на — **уха (юха):** ядун — ядуха, брахун — брахуха, харашун — харашуха, хадун — хадуха, дзікун — дзікуха, крыксун — крыксуха, лапатун — лапатуха, лясун — лясуха, лятун — лятуха, палятун — палятуха, рагатун — рагатуха, сядун — сядуха, скакун — скакуха, смактун — смактуха, сысун — сысуха, сьвістун — сьвістуха, шчабятун — шчабятуха, таўстун — таўстуха.

Мужчынскім спакменьнікам асобавым на — **нік** адказуюць жаноцкія на — **ніца:** грабеньнік — грабеньніца, дагляднік — дагляднiца, нагляднік — наглядніца, зраднік — зрадніца, кіраўнік — кіраўніца, крыўднік — крыўдніца, нашэньнік — нашэньніца, падлыжнік — падлыжніца, прашэньнік — прашэньніца.

Мужчынскім спакменьнікам асобавым на — **ель, — ыль** адказуюць жаноцкія на — **елка, -ылка:** вучыцель — вучыцелка, збавіцель — збавіцелка, карміцель — карміцелка, круцель — круцелка, прыяцель — прыяцелка, узгадавацель — узгадавацелка, бабыль — бабылка[1]).

У спакменьнікаў на — **ство** (бяз націску на канцы — **ства**) **л** перад **с** цьвярдое: бабылства, вучыцелства, кавалства, круцелства[1]).

РАЗЬДЗЕЛ XVI.

Зьмяняньне спакменьнікаў.

§ 75. Лікі спакменьнікаў.

Спакменьнікі: **стол, куст, кот, дзяцюк** абазначаюць адну якуюсь рэч, расьліну, жывёлу або асобу, а тыя самыя спакменьнікі ў хормах: **сталы, кусты, каты, дзяцюкі** абазначаюць шмат (многа) рэчаў, расьлінаў, жывёлы або асобаў. У першым прыпадку маем **лік адзіночны,** а ў другім — **лік множны.**

---

[1]) Тут, як і перад **ц (колца), л** зубное.

Перапішы, падчыркні спакменьнікі і абазнач зьверху, у якім яны ліку (адзіночны лік — **адз. л.**, множны лік — **мн. л.**).

Страшны зьмей паламаў засаўкі зялезныя, павысаджаваў дзьверы дубовыя, дый ухапіў мяне ад слаўнага гаспадара — роднага татулі, і панёс мяне за сіняе мора, за высокія горы, за вялікія балаты, за цёмныя лясы, прынёс сюды дый схаваў у гэтым палацу. Была тут адна божая пшчолка. Яна кажны дзень да мяне лётала ды вестачкі насіла ад слаўнае гаспадарыні — роднае матулькі. Толькі вось ужо тры дні прайшло, як яе няма. Чула я — раўлі медзьвядзі, раўлі страшна, аж зямля дрыжэла. Хіба медзьвядзі маю пшчолку задзерлі.

Некаторыя спакменьнікі ўжываюцца толькі ў вадзіночным ліку, іншыя ўзноў толькі ў множным ліку.

Перапішы й выпішы спакменьнікі надрукаваныя чорнымі літарамі, асобна, ужываныя толькі ў вадзіночным ліку, і асобна тыя, што ўжываюцца адно ў множным ліку.

1.

Антон Туранок можа пахваліцца сваім садам і гародам. Із саду кажны год зьбірае ён мноства садовіны. Часьць садовіны прадае, а другую часьць пакідае сабе. **Садовіна** смачная й здаровая **еміна.**

З гароду мае Туранок ня мала **гародніны.** Часьць яе йдзе на еміну радзіме, а часьць на корм **жывёле.** Дзеля таго Туранок і жывёлы можа шмат дзяржаць. Ад гародніны ў кароваў прыбывае малако.

2.

Сядня ў Міхневіча **ладзьбіны.** У хаце стаяць начоўкі зь мёдам і гуркамі. Некаторыя госьці ўжо прыехалі. Ждуць яшчэ Давідзёнка. Але вось на выгане затарахцелі **калёсы.** Гэта едзе Давідзёнак із жонкаю. Дзеці пабеглі адчыняць **вароты.** На дварышчы Давідзёнчыха дае дзяцём **прыгоршчы** цукеркаў. А ізь сяней рашчыняюцца **дзьверы,** і Міхневічы выходзяць перайmаць дарагіх гасьцей.

Сёлета разам ладзьбіны й **угодкі** сябраўства Міхневіча з Давідзёнкам. Пазалетась гэтай парой яны разам купілі пшчолы. Міхневічы з Давідзёнкамі дружаць. Не абыйдуцца **хрэсьбіны, запоіны, заручыны, улазіны** або, накш, **уходзіны,** каб яны ня былі адны ў вадных. А ладзьбіны яны ладзяць адзін год у ваднаго, а другі ў другога, значыцца робяць **пярэзвы.**

Харошы мужчына Давідзёнак, высокі, здаровы. Кажуць, што яго ніхто ў сяле ня здолее. У яго шырокія **плечы й грудзі.** Ён і разумны чалавек, не абы-якія **мазкі** мае.

Прыказка: сьмерць і **радзіны** ня выбіраюць гадзіны.

Улажэце самі проказі, у каторыя ўвыйшлі-б словы, надрукаваныя тутка чорнымі літарамі.

§ 76. Склоны спакменьнікаў.

Перапішэце, падчыркнеце спакменьнік **кот** і задайце пытаньні, на каторыя ён у кажнай проказі адказуе.

Наш кот чуткі. Ен добра лове мышы. Без ката іх шмат завялося-б. Нашаму кату нічога ўпікнуць ня можна. Дзеці любяць ката. З катом, бывае, і сьпіць каторае. Дзеці не забываюцца аб каце. Коце, коце! клічуць дзеці. Каты ловяць мышы. Без катоў не абыйдзешся ў хаце. Катом трэба даваць есьці. Яны любяць малачко. Дзеці любяць карміць каты. З добрымі катамі няма бяды. Дзеці пісалі аб катох.

Тая хорма, што прыймае спакменьнік у залежнасьці ад пытаньняў, завецца **склон,** а зьмяняньне склонаў завецца **скланеньне.** У скланеньню ё сем склонаў у вадзіночным ліку і тыхжа сем склонаў у ліку множным. Вось назовы склонаў: назоўны, дакладны, прызначальны, прыймальны, снадзіўны, мясцовы й клічны.

Розныя склоны адказуюць на розныя пытаньні, наймя:

Назовы склонаў.	Пытаньні.		Хормы склонаў.			
			Адзіночны лік.		Множны лік.	
Назоўны	Хто?	Што?	воўк,	бор	ваўк-і,	бар-ы
Дакладны	каго?	чаго?	ваўк-а,	бор-у	ваўк-оў,	бар-оў
Прызначальны	каму?	чаму?	ваўк-у,	бор-у	ваўк-ом,	бар-ом
Прыймальны	каго?	што?	ваўк-а,	бор	ваўк-і,	бар-ы
Снадзіўны	кім?	чым?	ваўк-ом,	бор-ам	ваўк-амі,	бар-амі
Мясцовы	у (на, аб)кім?	чым?	ваўк-у,	бар-у	ваўк-ох,	бар-ох
Клічны			воўч-а!	бор-у!	воўк-і!	бор-ы!
Назоўны	Хто?	Што?	хат-а,	дзір-а	хат-ы,	дзір-ы
Дакладны	каго?	чаго?	хат-ы,	дзір-ы	хат-аў,	дзір-аў
Прызначальны	каму?	чаму?	хац-е,	дзір-ы	хат-ам,	дзір-ам
Прыймальны	каго?	што?	хат-у,	дзір-у	хат-ы,	дзір-ы
Снадзіўны	кім?	чым?	хат-аю, або хат-ай,	дзір-ою дзір-ой	хат-амі,	дзір-амі
Мясцовы	у кім?	чым?	хац-е,	дзір-ы	хат-ах,	дзір-ах

Гэтта мы даведаліся, што спакменьнікі ня толькі адказуюць на пытаньне хто? што? але таксама на пытаньні каго? чаго? каму? чаму? каго? што? кім? чым? Спакменьнікі, абазначаючыя людзёў, адказуюць на пытаньні хто? каго? каму? каго? кім? А

абазначаючыя ня людзёў на пытаньні што? чаго? чаму? што? чым? у (на, аб, па) чым? Клічны склон ужываецца, калі да каго або чаго зварочуемся; клічны склон не адказуе на пытаньні.

Перапішэце, падчыркнеце спакменьнікі і абазначце ўверсе, у якім склоне й ліку яны стаяць.

Родны край.

Краю родны, краю гожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у сьвеце Божым
Гэтых сьветлых берагоў,
Дзе бруяцца срыбрам рэчкі,
Дзе бары - лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць,
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе ўвясну лугі цьвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуць?

Якуб Колас.

Да жніва.

— А пайду-ж я, маці,
У поле жыта жаці!
Жыта зелянее,
Колас налівае;
Вецер зь ніўкі вее —
Жнеяк прызывае:
— Ды ўставайце, жнейкі,
Дзеўкі маладзенькі!
Ды барждзэй вайстрэце
Іржавы сярпочкі,
Ды барждзэй пачнеце
Вузенькі шнюрочкі.
Бо пачну гуляці,
Ніўку калыхаці:
— Досьць табе, ніўка,
У полю красавацца;
Пара табе, ніўка,
У гумно схавацца!
— Ціха-ж, ветру, ціха!
Не рабі-ж ты ліха.
Плача ніўка, плача,
Гнецца каласамі;
Ня відзіць — ня бачыць
Жнеяк ізь сярпамі.
— Ціха, ніўка, ціха!
Не рабі-ж нам ліха.
Рукі ўжо памлелі
Граблямі махаці,
Яшчэ-ж не пасьпелі
Сена паграбаці.

Ад. Гурыновіч.

Каток.

Сядзіць над вадою маленькі каток,
Глядзіць ён на рыбкі — разінуў раток,
Хацеў-бы дастаць іх, баіцца сьнікнуць,
Баіцца вадою ён ног абмакнуць.

Ад. Гурыновіч.

У скланеньню кажнага спакменьніка адна часьць ё супольная й нязьменная, прыкладам хат, дзір, воўк, бор. Гэтая часьць завецца асноваю. Другая часьць мяняецца. Яна бывае на канцы спакменьніка, дзеля таго завецца канчаткам.

З тэксту, паказанага вучыцелям, выпішы спакменьнікі, адзяляючы іх аснову ад канчатку, і абазнач, у якім склоне й ліку яны стаяць.

Адныя спакменьнікі пры скланеньню маюць адныя канчаткі, а другія іншыя. Подле гэтых канчаткаў, усі спакменьнікі належаць да аднаго зь пяцёх розных скланеньняў.

РАЗЬДЗЕЛ XVII.

Скланеньне I.

Да I. скланеньня належа бальшыня спакменьнікаў мужчынскага й ніякага роду.

А) **Спакменьнікі мужчынскага роду.**

Спакменьнікі мужчынскага роду, належачыя да I. скланеньня, маюць у назоўным склоне адзіночнага ліку на канцы сугук (цьвярды або мяккі) або паўсамагук **(й, ў).** Назоўны склон гэтых спакменьнікаў мужчынскіх ня мае канчатку, тут адна аснова. Прыклады: **стол, конь, верабей, стаў.** Е колькі спакменьнікаў мужчынскага роду, што ў назоўным склоне маюць на канцы — о (хвалько).

§ 77. Пробкі I. скланеньня спакменьнікаў мужчынскага роду.

Назовы склонаў.	Адзіночны лік.		Множны лік.	
Назоўны	народ	сьнег	народ-ы	сьняг-і
Дакладны	народ-у	сьнег-у	народ-аў	сьняг-оў
Прызначальны	народ-у	сьнег-у	народ-ам	сьняг-ом
Прыймальны	народ	сьнег	народ-ы	сьняг-і
Снадзіўны	народ-ам	сьнег-ам	народ-амі	сьняг-амі
Мясцовы	народз-е	сьнез-е	народ-ах	сьняг-ох
Клічны	народз-е!	сьнег-у!		

Адзіночны лік.

Н.	сьмех	жаль	кол	лось
Д.	сьмех-у	жал-ю	кал-а	лас-я
Прз.	сьмех-у	жал-ю	кал-у	лас-ю
Прм.	сьмех	жаль	кол	лас-я
Сн.	сьмех-ам	жал-ям	кал-ом	лас-ём
М.	сьмех-у	жал-ю (або жал-і)	кал-е	лас-ю (або лас-і)
Кл.	сьмех-у!	жал-ю!	кол-е!	лос-ю!

Множны лік.

Н.	**сьмех-і**	**жал-і**	**кал-ы**	**лас-і**
Д.	**сьмех-аў**	**жал-яў**	**кал-оў**	**лас-ёў**
Прз.	**сьмех-ам**	**жал-ям**	**кал-ом**	**лас-ём**
Прм.	**сьмех-і**	**жал-і**	**кал-ы**	**лас-і**
Сн.	**сьмех-амі**	**жал-ямі**	**кал-амі**	**лас-ямі**
М.	**сьмех-ах**	**жал-ях**	**кал-ох**	**лас-ёх**

Адзіночны лік.

Н.	кош	салавей	ліхадзей	брат
Д.	каш-а	салаў-я	ліхадзе-я	брат-а
Прз.	каш-у	салаў-ю	ліхадзе-ю	брат-у
Прм.	кош	салаў-я	ліхадзе-я	брат-а
Сн.	каш-ом	салаў-ём	ліхадзе-ям	брат-ам
М.	каш-ы (або каш-у)	салаў-і (або салаў-ю)	ліхадзе-ю	брат-у
Кл.	кош-у!	салоў-ю!	ліхадзе-ю!	брац-е!

Множны лік.

Н.	каш-ы	салаў-і	ліхадзе-і	брат-ы
Д.	каш-оў	салаў-ёў	ліхадзе-яў	брат-оў
Прз.	каш-ом	салаў-ём	ліхадзе-ям	брат-ом
Прм.	каш-ы	салаў-і	ліхадзе-яў	брат-оў
Сн.	каш-амі	салаў-ямі	ліхадзе-ямі	брат-амі
М	каш-ох	салаў-ёх	ліхадзе-ях	брат-ох

Перапішэце, падчыркнеце канчаткі спакменьнікаў I. скланеньня мужчынскага роду і зацемце ўверсе, у якім склоне й ліку яны стаяць.

Прыйдзі пад вечар ты на поле
І палюбуйся ім, саколе!
У якія роўныя шнюрочкі
Цяпер пакладзены снапочкі.

——х——

Тунэль тымчасам разьдзяляўся,
І вал сярмяжнага народу
Ідзе да правага праходу.
Паны налева важна садзяць,
Дзе іх сярмяжнікі ня зрадзяць
Ні пахам дзёгцю, ні сярмягі.
Як выйшаў дзядзька наш з вакзалу,
Яму аж моташна нейк стала.
Ідзе так дзядзька і па бруку
Адзін за дзесяць робіць груку.

Я. Колас.

З агню ды ў прысак. За туманом сьвету ня відаць. Жаўцеюць палоскі позьняга аўсу й ячменю. Ня бача далей свайго носу. Што ў галаве, то й на языццэ. Птушка сядзела на суку. Гукалі аб купцу Дзяміду Матузу. Хвалько нахваліцца, а будзька набудзецца.

§ 78. Зацемкі да асобных склонаў.

Назоўны склон адзіночнага ліку.

а) Спакменьнікі на **-энт** — аргумэнт, хундамэнт, дакумэнт, дэпартамэнт, мамэнт, парлямэнт, працэнт, сакрамэнт, струмэнт, студэнт і іншыя — маюць націск на **-энт.** Націск на гэтым **-э-** застаецца ў усіх іншых склонах адз. й мн. ліку.

б) Спакменьнікі на **-ґраф** — этноґраф, ґеоґраф, параґраф, фотоґраф і іншыя падобныя — маюць націск на **-ра.**

в) Назовы сыноў па бацьку і прозьвішчы ад іх маюць у крывіцкай мове літаратурнай націск на **-ок (кавалянок, Касянок, Семчанок, Туранок, Чарнянок** а іншыя), хоць дапушчаецца й націск на перадапошнім складзе (Кавалёнак, Туронак).

ґ) У прозьвішчах крывіцкіх на **-овіч, -евіч** (Пятровіч, Станулевіч) націск не заўсёды бывае на суфіксе **-ов, -ев,** але рэдчас і на карані **(Аніськавіч, Ясевіч, Косьцевіч, Родкевіч, Родзевіч, Мацавіч, Шутавіч).**

г) Спакменьнікі — абраз, акунь, атлас, бандар, галуб, Зыдор, жалуд, каршун, саболь, сакол, сталяр, вузёл, Ігор, звычай, леварвэр, магазын, памачнік, пастыр, Ціхон — маюць націск на канцы.

х) Спакменьнік **непрыяцель** мае націск на **не-,** а **прыяцель** — на **пры-. У чырванец** націск на **-нец.**

д) Зьвярнеце ўвагу на пачатны гук гэт'кіх спакменьнікаў: мяніньнік, Зыдор, спэктар, струмэнт.

э) Зьвярнеце ўвагу на склады **-лы-, -ры-,** гэт'кіх спакменьнікаў: яблык, плыт, плытнік, перакрыш (крызыс), прысак, стрыжэнь, стрымгаловец, трыбух, трыкутнік, трыножак, трысьцен, арышт, адрыс.

Дакладны склон адз. л.

Канчатак -у ў дакл. скл. адз. л. маюць гэт'кія групы спакменьнікаў:

а) Усі спакменьнікі зборныя (такія, як **народ** і пад.).

Прыклады: народу, люду, бяз роду, хадзіць каля лесу, бору, гаю, асіньніку, бярэзьніку, хвойніку, дубніку, маладніку, ля гароду, саду, рою і іншыя.

б) Усі спакменьнікі матар'яльныя: сьнегу, агню, алею, аўсу, ячменю, бобу, воску, гароху, дажджу, жару, квасу, лёну, лёду, маку, моху, мёду, палыну, пяску, попелу, прыварку, соку, соладу, шроту, тварагу, тытуну, цукру і мноства іншых.

в) Усі спакменьнікі разумовыя: сьмеху, веку, году, голасу, грому, груку, болю, крыку, ладу, нюху, парадку, плачу, розуму, смаку, смутку, стуку і інш.

Усе іншыя спакменьнікі (значыцца ня зборныя, не матар'яльныя і не разумовыя) маюць у дакладным склоне адз. л. канчатак — **а.** Значыцца, канчатак **-а** ў дакладн. скл. адз. л. звычайна маюць спакменьнікі рачавыя (**кала, нажа** і інш.), назовы расьлінаў (калі яны ня маюць значаньня матар'яльнага — бурака, дубка, але маку, верасу), назовы жывых твораў (жывёлы й людзёў): казла, каня, пятуха, чалавека, купца.

На — а ў дакл. скл. адз. л. канчаюцца таксама назовы месяцаў: студзень — студня, сакавік — сакавіка і інш.

Аднак некаторыя спакменьнікі гэтых групаў маюць у дакл. скл. адз. л. канчатак — **у.** Гэтак, кажацца заўсёды **каля дому** і інш. **Стол** і **ліст** канчаюцца на — **у (столу, лісту).**

Канч. **-у** маюць **гроб, бок, пакой — гробу, боку, пакою.**

Некаторыя назовы дзерваў прыймаюць канчатак **-у (сесьці ля клёну, дубу, наламаць бэзу).**

Канчатак **-у** маюць таксама назовы местаў: зь Віцебску, Менску, Полацку, Смаленску, з Гомелю, із Старадубу, Ноўгараду Северскага, з Бэрліну, Парыжу, Лёндону, Нью-Ерку, Штокгольму, Рыму, Мадрыду, Лісабону. Але назовы местаў на **-оў (-аў), -еў, -ін** канчаюцца на **-а:** з Магілева, Барысава, зь Кіева, Кракава, Царыцына і інш. Горадзен — Горадна, Арол — Арла.

Звычайна назовы краёў маюць канчатак **-у:** зь Егіпту, з Туркястану (і іншыя на **-стан),** із Судану, Сібіру, Крыму, Каўказу.

Канч. **-у** маюць некаторыя назовы рэкаў: зь Нёмну (але з Дняпра).

Снадзіўны склон адз. л. мае канчатак **-ом, -ём (кал-ом, ласём, салаў-ём),** пры гэтым самагукі гэтых канчаткаў, будучы бяз націску, як звычайна, пераходзяць у **-а (народ-ам, жал-ям, ліхадзем-ям).**

Мясцовы склон адз. л.

Канчатак **-е** ў мясцовым склоне адз. ліку маюць спакменьнікі зь цьвярдым сугукам на канцы асновы **(стол — на стале, кол — на кале, у народзе, у лесе).**

Адныя із спакменьнікаў з **-к** на канцы асновы мяняюць **-к** на **-цц** і тады канчаюцца на **-э (на языццэ).** У іншых — а гэткіх бальшыня — **к** застаецца, і яны канчаюцца на **-у (на баку, на бураку, на суку** і пад.).

У вадных спакменьнікаў з **-г, -х** на канцы асновы гэтыя сугукі пераходзяць у мясцовым склоне адз. л. у **-з, -с,** і тады бывае канчатак **-е (на беразе, на лузе, у кажусе, у гаросе, у гарэсе),** у іншых **-г, -х** застаюцца, і ё канчатак **-у (аб Богу, аб грэху).**

Канчатак **-ю** (значыцца **-у** з папярэднім мяккім сугукам або зь **j**), або **-і** ў мясцовым склоне адз. л. маюць спакменьнікі зь мяккім сугукам або зь **-й** у васнове (**на пню, на каню,** або на пні, на кані, **аб салаўю, у сваім краю, як у раю).**

Спакменьнікі з **-р, дж, ж, ч, ш, ц** на канцы асновы канчаюцца ў мясцовым скл. адз. л. на **-у** або на **-ы (у бару, на сьцімбіру, на нажу або у бары, на сьцімбіры, на нажы).** Ад спакменьнікаў зь мяккім сугукам на канцы асновы яны розьняцца тым, што перад канчаткам мясц. скл. адз. л. маюць зацьвярдзелы сугук.

Усі спакменьнікі асобавыя канчаюцца ў мясцовым скл. адз. л. на **-у (-ю).** Прыклады: аб брату, сыну, купцу, аб Івану, Рыгору, Крывічу, Немцу, Сьцяпану, Маскалю, Кавалю і г. д.

Клічны склон адз. л.

а) Спакменьнікі зь цьвярдым сугукам на канцы асновы канчаюцца ў клічным склоне на **-е (лесе, дубе, суседзе, браце, сваце, Барысе, сам бараніся! саколе мой ясны).** Слова »сын« канчаецца ў клічным склоне на **-у — о сыну!**

Спакменьнікі з **-к** перад канчаткам мяняюць **-к** на **-ч** і канчаюцца ў клічным склоне на **-а:** Чалавека, куды йдзеш? Што ў цябе, воўча, хвост, як памяло? Паслухай, прарочa!

Але бывае, што **-к** застаецца, і спакменьнік канчаецца на **-у:** Не бяры, сынку, што ў золаце, а бяры, сынку, што ў беленькім.

Спакменьнікі з **-г, -х** на канцы асновы найчасьцей у клічным склоне канчаюцца на **-у** (о стогу, ворагу, гароху).

Спакменьнікі з **ц** на канцы асновы (ацец, маладзец, купец) канчаюцца ў клічным склоне на -э (не пад націскам **-а),** пры гэтым заміж **ц** ёсьць **ч** (войча, малойча, купча).

б) Спакменьнікі зь мяккім сугукам перад канчаткам канчаюцца ў клічным склоне на **-ю.**

Прыклады: Чаму, коню, вады, ня п'еш? Дарагі наш госьцю! А мой-жа ты Мікалаю!

Спакменьнікі з **-р, дж, ж, ч, ш** на канцы асновы канчаюцца ў клічным склоне на -у: Добры вечар гаспада́ру! Спада́ру мой! нажу! кошу! Іграй, іграй, іграчу! Ідзі, ідзі, дожджу!

Спакменьнікі з **-р, дж, ж, ч, ш** на канцы асновы тым розьняцца ў клічным склоне ад спакменьнікаў зь мяккім сугукам на канцы асновы, што, замест на **-ю,** канчаюцца на **-у,** значыцца, адныя маюць мяккі, а другія цьвярды сугук перад **-у.**

Зацемка. Як відаць із прыведзеных прыкладаў, націск у клічным склоне бывае на аснове. Прыклады: **дай каню** (прз. скл.) і — **мой коню вараненькі!** (клічны склон). Голубе мой!

Назоўны склон мн. л.

а) Побач із канчаткам **-ы, -і (браты, ласі)** ужываецца яшчэ канчатак **-э, -е (братэ, ласе),** калі ён пад націскам.

б) Апрача гэтых канчаткаў, спакменьнікі асобавыя канчающца яшчэ на **-ове.** Прыклады: **паслове, Арабове, багатырове, сяброве.** Што за сватове, што за панове на двары? Гэтак рабілі нашыя айцове.

в) Спакменьнікі — бог (пагански), год, дзед, стог, вецер, зьвер, дзевер — маюць у мн. ліку націск на канцы: **багі** (у паган), гады, **дзяды, стагі, вятры, зьвяры, дзевяры.**

ґ) Спакменьнікі — волас, голад, голас, холад, колас, молат, полаз, солад, волат — маюць у ўсіх склонах множнага ліку націск на канчатку: **валасы, галады, галасы, халады, каласы, малаты, палазы, салады, валаты, валасоў** і г. д.

Таксама спакменьнікі — **бераг, верад, верас, нерат, перад** — маюць у множным ліку націск на канчатку: **берагі, верады, верасы, нераты, перады, берагоў, берагом** і г. д.

І спакменьнікі — **горад, вораг** — маюць у множным ліку націск на канчатку: **гарады, варагі, варагоў, варагом, варагамі,** аб варагох.

Тут гэт'кае правіла: **калі ў васнове спакменьніка** ! **-ола (колас), -ора (вораг)** або **-ера (верас), дык у множным ліку ён мае націск на канчатку.**

г) Націск на канчатку ў множным ліку маюць таксама спакменьнікі — **гарох** і **мароз (гарахі, маразы), кароль** (гаспадар) і **Кароль** (імя).

х) Назовы мясцовасьцяў на **-овічы (-авічы), -евічы** маюць нярэдка націск на карані: Алёхнавічы, Асіпавічы, Баранавічы, Войнаштавічы, Радашкавічы й інш.

д) **Чорт** мае ў множным ліку падвойную хорму — **чарты й чэрці, чартоў, чарцей, чартом** і **чэрцям, чартамі** й **чэрцямі,** аб **чартох** і **чэрцях.**

Дакладны склон мн. л.

а) Спакменьнікі зь цьвярдым сугукам на канцы асновы маюць у дакл. скл. мн. л. канчатак **-оў (сьнягоў),** пры гэтым калі на **-о** няма націску, дык яно, як заўсёды, пераходзе ў **-а,** і тады зьяўляецца канчатак **-аў (народаў, чалавекаў).**

б) Спакменьнікі зь мяккім сугукам на канцы асновы малі ў дакл. скл. мн. л. канчатак **-еў (жалеў, ліхадзееў, аленеў),** каторы пад націскам перайшоў у **-ёў: ласёў, салаўёў, маскалёў, медзьвядзёў, кавалёў, рублёў;** а не пад націскам **е** перайшло ў **я,** і паўстаў канчатак **-яў (жаляў, ліхадзеяў, аленяў).**

в) Спакменьнікі з **-р, дж, ж, ч, ш, ц** на канцы асновы канчающца ў дакл. скл. мн. л. на **-оў** (не пад націскам **-аў).** Прыклады: багатыроў, гаспадароў, пекароў, спадароў, сьлёсараў, цароў, вужоў, віжоў, гужоў, кашоў, нажоў, бучоў, дажджоў.

г) Слова **год** ня мае ў д. скл. мн. л. канчатку, значыцца, мае

хорму **год (пяць год, сем год** і г. д.). Таксама рэдчас »рог« **(ня даў Бог сьвіньні рог).**

Слова **дзень** мае ў д. скл. мн. л. хорму **дзён,** значыцца, кажацца: **адзін дзень,** 2, 3, 4 **дні,** але 5, 6, 7 і г. д. **дзён, 31 дзень, але 30 дзён.**

Кажацца **гасьцей,** калі між гасьцей могуць быць ня толькі мужчыны, і **гасьцёў,** калі маем наўвеце адных мужчын, і **госьцяў,** калі адных жанчынаў.

Прызначальны склон мн. л.

а) Спакменьнікі зь цьвярдым сугукам на канцы асновы маюць у прз. скл. мн. л. канчатак **-ом (сьнягом, калом, братом),** каторы, будучы не пад націскам, з прычыны аканьня, пераходзе ў **-ам (народам).**

б) Спакменьнікі зь мяккім сугукам на канцы асновы канчаліся ў прз. скл. мн. л. на **-ем (жалем, ліхадзеем, конем),** але — е, будучы пад націскам, перайшло ў **-ё,** і паўстаў тады канчатак **-ём (ласём, салаўём),** а **-е-** ненацісьненае, з прычыны аканьня, перайшло ў **я,** і паўстаў канчатак **-ям (коням** і пад.).

Прыймальны скл. мн. л.

Назовы жывёлы маюць прм. скл. мн. л. аднолькавы з назоўным склонам мн. л.: **паю коні, люблю каты, пасу валы, палюю на цецярукі** і г. д.

У снадзіўным склоне мн. л. звычайны канчатак ё **-амі, -ямі (каламі, ласямі),** але некаторыя спакменьнікі маюць канчатак на **-мі (коньмі, людзьмі, гасьцьмі).**

Мясцовы скл. мн. л.

а) Спакменьнікі зь цьвярдым сугукам перад канчаткам маюць у мясцовым склоне мн. л. канчатак **-ох (сьнягох, калох, братох),** каторы, з прычыны аканьня, не пад націскам пераходзе ў **-ах (народах).**

б) Спакменьнікі зь мяккім сугукам перад канчаткам малі ў мясц. скл. мн. л. канчатак **-ех (жалех, ліхадзеех, конех),** але пад націскам **-е-** перайшло ў **-ё-,** і такім парадкам паўстаў канчатак **-ёх (ласёх, салаўёх, людзёх, гасьцёх),** а бяз націску **-ех** перайшло ў **-ях (жалях, ліхадзеях, конях).**

Клічны склон мн. л. нічым ня розьніцца ад назоўнага склону таго-ж ліку.

§ 79. Зацемкі да розных склонаў.

а) Спакменьнік **конь** мае ў множным ліку націск на карані: н. — **коні,** дакл. — **коняў, коняй** або **коні,** прз. — **коням,** прм. — **коні,** сн. — **коньмі,** м. — **на конях.**

б) Націск на канчатку ў усіх склонах адз. й мн. л. мае спакменьнік **чорт (чарта, чарту** і г. д., **чарты, чартоў** і г. д.).

в) Спакменьнік **Кароль** (хрышчонае імя) і **кароль** (гаспадар, валадар) скланяюцца аднолькава і маюць у ўсіх склонах адз.

й мн. л. націск на канчатку (Караля, караля, Каралі, каралі, каралёў, каралём і г. д.).

ґ) Спакменьнік **зуб,** калі знача зуб людзіны або жывёлы, дык ува ўсіх склонах адз. л. ды ў назоўным — прыймальным мн. л. мае націск на карэнным **у** (зуба, зубу, зубам, на зубе, зубы, але — зубоў, зубам, зубамі, у зубах, а калі знача зуб у снадзівах, снасьцях, струмэнтах, дык усюдах мае націск на канчатку **(зуба, зубу, зубом, на зубе, зубы, зубоў, зубом,** зубамі, у **зубох).**

Спакменьнікі — абраз, акунь, атлас, бандар, галуб, жалуд, каршун, саболь, сакол, сталяр, вузёл, памачнік, пастыр — маюць націск на канчатку ў усіх склонах адз. й мн. ліку (з выняткам назоўнага склону адз. л., дзе націск на апошнім складзе).

г) Спакменьнік **мукар** (тый, што мучае) мае націск на **му-** ў усіх склонах адз. й мн. ліку.

Пост мае націск на **по-** ў усіх склонах адз. л.: посту, посту, постам, у посьце.

Калі спакменьнікі на **-ік** або на **-нік** маюць у наз. скл. адз. л. націск на канцы **(маладзік, каталік, сакавік, красавік, валасьнік, каласьнік, маладнік, кіраўнік, памачнік** і інш.), дык націск на канчатку ў іх будзе ў усіх склонах адз. й мн. л. **(маладзіка́, каласьніка́, маладзіку, каласьніку** і г. д., **маладзікі, каласьнікі** і г. д.).

х) Калі спакменьнікі на **-ак** маюць у наз. скл. адз. л. націск на канцы **(гайсак, казак, паляк, яздак, дзівак, мацак, мастак, грак, шпак, галяк, масьляк, сваяк),** дык будуць мець націск на канцы ў усіх склонах адз. й мн. л. **(казака, паляка** і г. д., **казакі, -оў** і г. д.).

д) Спакменьнік **грош** мае ў мн. ліку дваякае значаньне — знача манэты **грашакі й грошы.** У першым значаньню скланяецца як **нож,** значыцца: **грашы, грашоў, грашом, грашы, грашамі аб грашох.** У другім прыпадку мае націск на аснове і скланяецца гэтак: **грошы, грошаў** або **грошы** (няма грошы), **грошам, грошы, грашмі або грашыма.**

э) У назовах месяцаў — студзень, ліпень, жнівень, верасень, сьнежань — у залежных склонах (знач., апрача назоўнага й прыймальнага) адз. л. і ў усіх склонах мн. л. самагук перад **н** выпадае **(студня, ліпня, жніўня, верасьня, сьнежня, студню** і г. д.). Назоў месяца **чырвень** у залежных склонах адз. л. і ў цэлым ліку мн. па **в** мае **і (чырвіня).**

е) Надабе памятаваць, што **е** бяз націску не вымаўляецца, і дзеля таго, калі кажацца тутка, што ў тым ці іншым канчатку ё ненацісьненае е, дык гэта значыцца, што яно тамка пішацца дзеля свайго быцьця ў будоўлі слова, але вымаўляецца як **я** або як гук няясны, або як **і.**

Канчаткі **я, е, ё, ю** зьяўляюцца тымі самымі канчаткамі, што **а, э, о, у,** з тэй толькі розьніцаю, што перад гэтымі самагукамі ё мяккі сугук (**гасьц-я, гасьц-ю, на стал-е = гасьць-а, гасьць-у, на сталь-э,** таксама **лас-ём = лась-ом** і пад.).

А калі канцавыя **я, е, ё, ём,** ёх і пад. вымаўляюцца як **ja, je, jo, jom, jox,** дык у іх j належа да асновы слова, а канчаткам ё запраўды — **а, э, о, у, ом.** Прыкладам: вераб'я, вераб'ём, вераб'ёх = **верабj-а, верабj-у, верабj-ом, верабj-ох.** Таксама **вераб'і = верабj-і.** У гэт'кіх прыпадках абазначаем канчатак пры памачы **-я, -е, -ё, -ю, -ём, -ямі, -ёх** толькі з прычыны заганы нашае кірылічнае абэцады, у каторай дагэтуль няма літары j.

Заданьне. Праскланяйце спакменьнікі **каталік, маладнік, кіраўнік.** Праскланяйце **яздак, дзівак, шпак.**

§ **80.** Дзеля націску, зьвярнеце ўвагу на скланеньне спакменьнікаў абраз, галуб, сакол, цыган.

Адзіночны лік.

Н.	абраз	галуб	сакол	цыган
Д.	абраза	галуба	сакала	цыгана́
Прз.	абразу	галубу	сакалу	цыгану
Прм.	абраз	галуба	сакала	цыгана
Сн.	абразом	галубом	сакалом	цыганом
М.	абразе	галубе	сакале	цыгану
Кл.	вобразе!	голубе!	саколе!	цыгане!

Множны лік.

Н.	абразы	галубы	сакалы	цыганы
Д.	абразоў	галубоў	сакалоў	цыганоў
Прз.	абразом	галубом	сакалом	цыганом
Прм.	абразы	галубы	сакалы	цыганоў
Сн.	абразамі	галубамі	сакаламі	цыганамі
М.	аб абразох	галубох	сакалох	цыганох

Значыцца, менаваныя спакменьнікі ў усіх — з выняткам клічнага — склонах адзіночнага й множнага ліку маюць націск на канчатку. Таксама, з выняткам клічнага склону, у ўсіх іншых склонах абодвых лікаў маюць націск на канцы спакменьнікі **воўк** (глянь скланеньне яго вышэй), **акунь, жалуд, каршун, мядзьведзь, саболь.** Праскланяйце іх!

§ **81.** У спакменьнікаў **ацец і маладзец,** пачынаючы з д. скл. адз. л., у ўсіх склонах абодвых лікаў зьяўляецца **-й.** Значыцца, яны скланяюцца гэтак:

	Адзіночны лік.		Множны лік.	
Н.	ацец	маладзец	айцове або айцы	малайцове або малайцы
Д.	айца	малайца	айцоў	малайцоў
Прз.	айцу	малайцу	айцом	малайцом
Прм.	айца	малайца	айцоў	малайцоў
Сн.	айцом	малайцом	айцамі	малайцамі
М.	аб айцу	аб малайцу	айцох	малайцох
Кл.	войча!	малойча!	як назоўны	

Зацемка. У назоўным склоне адз. л. кажацца і **айцец.**

§ 82. Пры скланеньню спакменьнікаў — **лоб, лён, леў, мох, назоў, рот, лёд, роў** — самагук асновы не выпадае. Значыцца, менаваныя спакменьнікі скланяюцца гэтак:

Адзіночны лік.

Н.	лоб	рот	лён	мох
Д.	лобу	роту	лёну	моху
Прз.	лобу	роту	лёну	моху
Прм.	лоб	рот	лён	мох
Сн.	лобам	ротам	лёнам	мохам
М.	(у на) лобе	роце	лёне	моху
Кл.	лобе!	роце!	лёне!	моху!

Множны лік.

Н., Кл.	лабы	раты	ляны	махі
Д.	лабоў	ратоў	ляноў	махоў
Прз.	лабом	ратом	ляном	махом
Прм.		Як назоўны		
Сн.	лабамі	ратамі	лянамі	махамі
М.	лабох	ратох	лянох	махох

Адзіночны лік.

Н.	назоў	леў	лёд	роў
Д.	назову	лява	лёду	рову
Прз.	назову	ляву	лёду	рову
Прм.	назоў	лява	лёд	роў
Сн.	назовам	лявом	лёдам	ровам
М.	назове	ляве	лёдзе	рове
Кл.	назове!	леве!	лёдзе!	рове!

Множны лік.

Н.	назовы	лявы	ляды	равы
Д.	назоваў	лявоў	лядоў	равоў
Прз.	назовам	лявом	лядом	равом
Прм.	назовы	лявы	ляды	равы
Сн.	назовамі	лявамі	лядамі	равамі
М.	назовах	лявох	лядох	равох

Заданьне. Перапішэце гэтыя спакменьнікі (ад **лоб - роў**) і падчыркнеце самагук асновы.

§ 83. Пры скланеньню спакменьнікаў **грэбень, камень, карэнь, крэмень, рэмень -е-, -э-** перад **-н-** не выпадае:

Адзіночны лік.

Н.	карэнь	камень	рэмень	крэмень
Д.	караня	каменя	рэменя	крэменя
Прз.	караню	каменю	рэменю	крэменю
Прм.	Як назоўны			
Сн.	каранём	каменям	рэменям	крэменям
М	караню або карані	каменю або камені	рэменю або рэмені	крэменю або крэмені
Кл.	карэню!	каменю!	рэменю!	крэменю!

Множны лік.

Н.	карані	камяні	рамяні	крамяні
Д.	каранёў	камянёў	рамянёў	крамянёў
Прз.	каранём	камянём	рамянём	крамянём
Прм.	Як назоўны			
Сн.	каранямі	камянямі	рамянямі	крамянямі
М.	каранёх	камянёх	рамянёх	крамянёх

Перапішэце й падчыркнеце самагук перад **н.** Як **рэмень, крэмень,** таксама скланяюцца **грэбень, ячмень, спакмень (ячменю, спакменю** і г. д., мн. лік.: **ячмяні, спакмяні, грабяні** і г. д.). Праскланяйце іх!

§ 84. Калі ў спакменьніках на **-ец** перад **-е-** ёсьць **-л-** мяккое **(палец),** дык яно, апынуўшыся пры скланеньню перад **-ц-,** пераходзе ў **-л-** цьвярдое **(палца).**

Перапішэце й падчыркнеце **л** перад **ц.**

Адзіночны лік.

Н.	палец	стралец	валец	Партугалец
Д.	палца	стралца	валца	Партугалца
Прз.	палцу	стралцу	валцу	Партугалцу
Прм.	палец	стралца	валец	Партугалца
Сн.	палцам	стралцом	валцам	Партугалцам
М.	палцу або палцы	стралцу	валцу або валцы	Партугалцу
Кл.	пальча!	стрэльча!	вальча!	Партугальча!

Множны лік.

Н.	палцы	стралцы	валцы	Партугалцы
Д.	палцаў	стралцоў	валцаў	Партугалцаў
Прз.	палцам	стралцом	валцам	Партугалцам
Прм.	палцы	стралцоў	валцы	Партугалцаў
Сн.	палцамі	стралцамі	валцамі	Партугалцамі
М.	палцах	стралцох	валцах	Партугалцах

Заcемка: л перад **ц** (палца, колца) зубное (вымаўляецца на зубах), значыцца, накшае, як л перад іншымі сугукамі, або на канцы слова.

Праскланяйце **гулец, Ангелец, закалец.**

§ 85. Калі спакменьнікі на **-эц, -ец** перад **-э, -е** маюць — **р, л, в** з папярэднім сугукам **(мудрэц, круглец, мярцьвец),** дык ў усіх склонах — з выняткам назоўнага адз. л. і згоднага зь ім прыймальнага — абодвых лікаў, заміж **-э-** маюць **-ы-** і заміж **-е- — і- (ігрыца, кругліца, мярцьвіца).**

Перапішэце й падчыркнеце склады — **ры-, — лі-, — ві-.**

Адзіночны лік.

Н.	мудрэц	ігрэц	круглец
Д.	мудрыца	ігрыца	кругліца
Прз.	мудрыцу	ігрыцу	кругліцу
Прм.	мудрыца	ігрыца	круглец
Сн.	мудрыцом	ігрыцом	кругліцом
М.	мудрыцу	ігрыцу	кругліцы або кругліцу
Кл.	мудрыцу!	ігрыцу!	кругліцу!

Множны лік.

Н.	мудрыцы	ігрыцы	кругліцы
Д.	мудрыцоў	ігрыцоў	кругліцоў
Прз.	мудрыцом	ігрыцом	кругліцом
Прм.	мудрыцоў	ігрыцоў	кругліцы
Сн.	мудрыцамі	ігрыцамі	кругліцамі
М.	мудрыцох	ігрыцох	кругліцох

	Адзіночны лік.		Множны лік.	
Н.	трэц	мярцьвец	трыцы	мярцьвіцы
Д.	трыца	мярцьвіца	трыцоў	мярцьвіцоў
Прз.	трыцу	мярцьвіцу	трыцом	мярцьвіцом
Прм.	трыца	мярцьвіца	трыцоў	мярцьвіцоў
Сн.	трыцом	мярцьвіцом	трыцамі	мярцьвіцамі
М.	трыцу	мярцьвіцу	трыцох	мярцьвіцох
Кл.	трэцу!	мерцьвецу!		Як назоўны

Заміж **мярцьвец** часьцей цяпер ужываецца **мярцьвяк.**

Назоў месяца **чырвень** у залежных склонах адз. л. і ў усіх склонах мн. ліку па **-в-** мае **-і-**, адз. л.: н. **чырвень,** д. **чырвіня,** прз. **чырвіню,** прм. **чырвень,** сн. **чырвіням,** м. у **чырвіні** або **чырвіню,** к. **чырвіню!** мн. л.: **чырвіні,** чырвіняў, чырвіням, чырвіні, чырвінямі, у чырвінях.

§ 86. Калі спакменьнікі на **-ок** перад **-о** — маюць **р** з папярэднім сугукам **(мудрок)**, дык пры скланеньню заміж **-ро** — яны маюць склад **-ры** — **(мудрыка** і г. д.).

Перапішэце й падчыркнеце склад — **ры-.**

Адзіночны лік.

Н.	мудрок	Пятрок	сяброк	швагрок
Д.	мудрыка	Пятрыка	сябрыка	швагрыка
Прз.	мудрыку	Пятрыку	сябрыку	швагрыку
Прм.	мудрыка	Пятрыка	сябрыка	швагрыка
Сн.	мудрыком	Пятрыком	сябрыком	швагрыком
М.	мудрыку	Пятрыку	сябрыку	швагрыку
Кл.	мудрыку!	Петрыку!	сябрыку!	швагрыку!

Множны лік.

Н.	мудрыкі	Пятрыкі	сябрыкі	швагрыкі
Д.	мудрыкоў	Пятрыкоў	сябрыкоў	швагрыкоў
Прз.	мудрыком	Пятрыком	сябрыком	швагрыком
Прм.	мудрыкоў	Пятрыкоў	сябрыкоў	швагрыкоў
Сн.	мудрыкамі	Пятрыкамі	сябрыкамі	швагрыкамі
М.	аб мудрыкох	Пятрыкох	сябрыкох	швагрыкох

Таксама скланяюцца **зуброк, Сыльвастрок** (праскланяйце іх!) і ўсі іншыя на **-рок** з папярэднім сугукам.

§ 87. Пры скланеньню спакменьніка **цесьць** самагук асновы выпадае. Таксама найчасьцей адпадае пачатнае **ц-**. Значыцца, скланеньне гэт'кае:

	Адзіночны лік.	Множны лік.
Н.	цесьць	сьці
Д.	сьця	сьцёў
Прз.	сьцю	сьцём
Прм.	сьця	сьцёў
Сн.	сьцём	сьцямі
М.	сьцю	сьцёх
Кл.	сьцю!	

Пачатнае **ц- (цьсьця** і г. д.) бывае рэдка.

§ 88. Спакменьнікі на **-анін** — **хрысьцянін, мешчанін, мусульманін,** селянін, Вільнянін, Палачанін, Рымлянін, Северанін, Смальнянін і іншыя пад. — маюць у вадзіночным ліку націск на — **ні-**, а ў множным на **-áне.**

У вадзіночным ліку іх скланеньне нічым ня розьніцца ад скланеньня іншых спакменьнікаў мужчынскіх, а ў ліку множным скланяюцца яны гэтак:

Н.	мяшчане	Рымляне
Д.	мяшчан мяшчанаў	Рымлян або Рымлянаў
Прз.	мяшчанам	Рымлянам
Прм	Як дакладны	
Сн.	мяшчанмі	Рымлянмі
М	мяшчанах	Рымлянах

Б) **Спакменьнікі ніякага роду.**

Уходзячыя ў І. скланеньне спакменьнікі ніякага роду канчаюцца ў назоўным склоне адз. л. на **-о** (не пад націскам будзе **-а**), або -е, ё. Прыклады: **акно, сіта, поле, жыцьцё.**

§ 89. Зразы (пробкі) скланеньня.

Адзіночны лік.

Н. Прм. Кл.	1. акн-о	2. жыт-а	3. пол-е	4. страхацьц-ё
Д.	акн-а	жыт-а	пол-я	страхацьц-я
Прз.	акн-у	жыт-у	пол-ю	страхацьц-ю
Сн.	акн-ом	жыт-ам	пол-ям	страхацьц-ём
М.	на (аб, у) акн-е	жыц-е	пол-ю або пол-і	страхацьц-ю або страхацьц-і

Множны лік.

Н. Прм. Кл.	вокн-ы	жыт-ы	пал-і	страхоцьц-і
Д.	вокн-аў	жыт-оў	пал-ёў	страхоцьц-яў
Прз.	вокн-ам	жыт-ом	пал-ём	страхоцьц-ям
Сн.	вокн-амі	жыт-амі	пал-ямі	страхоцьц-ямі
М.	вокн-ах	жыт-ох	пал-ёх	страхоцьц-ях

Адзіночны лік.

Н. Прм. Кл.	5. мор-а	6. падарожж-а	мор-ы	падарожж-ы
Д.	мор-а	падарожж-а	мор-аў	падарожж-аў
Прз.	мор-у	падарожж-у	морам	падарожж-ам
Сн.	мор-ам	падарожж-ам	мар-амі	падарожж-амі
М.	на (па, у) мор-у, ы	падарожж-у,-ы	мор-ах	падарожж-ах

§ 90. Зацемкі да канчаткаў розных склонаў.

Націск у спакменьніку **спасеньне** ё на **спа-**, а ў **вароты** — на **-ро-**.

Назоўны склон адз. л. спакменьнікаў ніякага роду зь мяккіна **-ні-**, а ў множным на **-áне.**

торае аднак вымаўляецца як **-я** (значыцца, кажацца **поля**), бо ненацісьненага **-е-** ня бывае.

Да **снадзіўнага скл. адз. л.** спакменьнікаў ніякага роду адносіцца ўсе тое, што сказана вышэй (гля бач. 65) аб канчатках таго-ж склону спакменьнікаў мужчынскіх.

Мясцовы склон адз. л.

а) Спакменьнікі ніякага роду зь цьвярдым сугукам перад канчаткам канчаюцца ў мясцовым склоне адз. л. на **-е (на сял-е).** Калі гэтае **е** бывае бяз націску, дык яно вымаўляецца як **я (у жыця)** або як гук нявыразьлівы.

б) Адныя спакменьнікі ніякага роду з **к** перад канчаткам (малако) зьмяняюць у мясцовым скл. адз. л. **к** на падвойнае **цц,** і тады бывае канчатак **-э (у малаццэ)**; у другіх — і гэт'кіх балей — **к-** застаецца, і бывае канчатак **-у (на веку, у воку).**

в) Да спакменьнікаў з **г, х** перад канчаткам (рэха) адносіцца тое, што сказана вышэй (бач. 65) аб такіх-жа спакменьніках мужчынскага роду.

ґ) Спакменьнікі ніякага роду зь мяккім сугукам перад канчаткам канчаюцца ў мясцовым скл. адз. л. на **-ю (на полю),** але можа ўжывацца таксама хорма на **-і (на полі).**

г) Спакменьнікі ніякага роду з **р, дж, ж, ч, ш, ц** перад канчаткам канчаюцца ў мясц. скл. адз. ліку на **-у (на мору, у падарожжу)** або на **-ы (на моры),** значыцца, канчаткі тыя самыя, што і ў спакменьнікаў зь мяккім сугукам перад канчаткам, толькі із зацьвярдзелымі (а не мяккімі) сугукамі перад канчаткам.

Назоўны склон мн. л. спакменьнікаў ніякага роду мае ў мове літаратурнай і ў вялізарнай бальшыні мовы народнае толькі канчаткі **-ы, -і,** хоць у некаторых мясцовасьцях мовы народнае захаваліся яшчэ хормы на **-а, -я.** Да канчаткаў дакладнага, прызначальнага й мясцовага склонаў мн. л. адносіцца ўсе тое, што сказана аб канчатках гэтых склонаў пры спакменьніках мужчынскіх (гля бач. 67—68).

Заданьне. Прaскланяйце гэт'кія спакменьнікі: зялеза, дзярно, брыво (мн. л. **бровы**), далоўе, рукаво, дзіўства, жарало, сэрца.

§ 91. Вока й **вуха** ў вадз. ліку скланяюцца звычайна — подле пададзеных пробкаў — а ў ліку множным маюць гэт'кія хормы: вочы, вочаў або вачэй, вачом, вачмі або вачыма, у вачох; вушы, вушоў або вушэй, вушом, вушмі, у вушох.

Калі маецца наўвеце пара аччу ці вушшу, прыкладам вочы аднаго чалавека, дык кажацца — з аччу, з вушшу (дакл. скл.), у **ваччу,** у **вушшу** (мясц. склон), **вачыма, вушыма** (снадз. склон). Прыклады: У ваччу пацямнела. У вушшу зазьвінела. З аччу відаць, што ён праўду кажа.

Плячо ў мн. ліку мае гэт'кія хормы: плечы, плечаў або плячоў, плячом, плячыма або плячмі, на плячох.

Неба й чуда ў вадз. ліку скланяюцца звычайна, значыцца, як **жыта,** а ў ліку множным скланяюцца гэтак: н., прм., кл. — нябёсы, чудосы; д. — нябёсаў, чудосаў (радзей — нябёс, чудос); прз. — нябёсам, чудосам; снадз. — нябёсамі, чудосамі; м. — на нябёсах, чудосах.

Кола скланяецца звычайна, значыцца, як **жыта** (адз. л.: кола, кола, колу, колам, на коле; мн. л.:: колы, колаў, колам, коламі, на колах).

Слова **калёсы** ўжываецца толькі ў мн. л. і абазначае вязеню на колах, скланяецца, як **нябёсы.**

Як **нябёсы, калёсы, чудосы,** скланяецца таксама **дзівосы.**

Спакменьнікі зьмяншальныя на -цо (не пад націскам **-ца)** перад — **ц** маюць — **л** цьвярдое: колца, шылца, салца, памялцо, жыгалца, елца, рылца. **Л** тут зубнсе, як у **палцы** (гл. вышэй).

Спакменьнікі на -ство (не пад націскам **-ства)** перад **-с** маюць — **л** заўсёды цьвярдое: бабылства, вучыцелства, кавалства, круцелства, самахвалства. Таксама тут **л** зубное.

§ 92. Парны лік.

Апрача ліку адзіночнага й множнага, у спакменьнікаў ніякага роду могуць яшчэ ўжывацца хормы парнага ліку. Парны лік ужываецца тады, калі абазначае пару або пры словах **дзьве, тры, чатыры.** Прыклады: **дзьве акне; дзьве, тры, чатыры сяле** і пад. Хормы — дзьве (тры, чатыры) акны, сялы — множныя, але з націскам парнага ліку.

§ 93. Зборныя спакменьнікі ніякага роду на -е, -ё, -о.

Перапішы й зьвярні ўвагу на спакменьнікі, надрукаваныя чорнымі літарамі.

Секачы секлі **дзярэўе.** Ад сьсечанага **пнеўя** яны адсякалі **суччо** й **гальлё.** Із **сучча** рабілі **кольле. Кольлям** гарадзьбіты гарадзілі плот. З маладога ценкага **дзярэўя** было **жардзё. Жардзё** годзіцца на плот і на латы. Тут-жа пастухі дзерлі **карэньне.** Яны з **карэньня** плятуць кашы. Парабіўшы, секачы селі палуднаваць на **бярвеньню.** Із свайго **судзьдзя** яны даставалі ежу.

Адзін ці мноства спакмянёў абазначаюць спакменьнікі, надрукаваныя чорнымі літарамі.

А ці маюць яны хормы множнага ліку?

Але, праўда, яны маюць хорму спакменьнікаў ніякага роду, стаячых у вадзіночным ліку.

Вось гэт'кія спакменьнікі ё спакменьнікі зборныя ніякага роду (канчаюцца на **-е, -ё, -о).** Абазначаюць яны збор чагось і ўжываюцца заміж множнага ліку. Ад шмат якіх спакменьнікаў усіх трох радоў паўсталі спакменьнікі зборныя ніякага роду.

Значыцца, такія спакменьнікі маюць лік адзіночны, лік множны і хорму зборную.

ПРЫКЛАДЫ

Перапішэце ніжэй паданыя прыклады.

Адзіночны лік	множны лік	зборныя.
1. Чорны вугаль	чорныя вугалі	чорнае вугальле
Кляновая голь	кляновыя голі	кляновае гальлё (або гольле)
Малы капыл	малыя капылы	малое капыльле
Дубовы кол	дубовыя калы	дубовае кольле
Гусінае крыло	гусіныя крылы	гусінае крыльле
Малое сіло	малыя сілы	малое сільле
Балючая скула	балючыя скулы	балючае скульле
Сухое сьцябло	сухія сьцеблы	сухое сьцябельле
Войстрае шыла	войстрыя шылы	войстрае шыльле

Перапішы й падчыркні зборныя спакменьнікі.

Вугальлям цепляць у печы. На дрывотніку ськінулі гальлё. У шаўца шмат капыльля. Сільлям сіляюць птушкі. Е розныя лекі ад скульля. Як рэзалі гусі, дык шмат было гусінага крыльля.

Перапішэце гэтыя прыклады.

Адзіночны лік	множны лік	зборныя.
2. Даўгі волас	даўгія валасы	даўгое валосьсе
Поўны колас	поўныя каласы	поўнае калосьсе
Войстрая каса	войстрыя косы	войстрае касьсё
3. Мой вяз	мае вязы	маё вязьзё
Тваё зялеза	твае зялезы	тваё зялезьзе
Маладая лаза	маладыя лозы	маладое лозьзе
Старая рыза	старыя рызы	старое рызьзё
Новы полаз	новыя палазы	новае палазьзё

Перапішы й падчыркні зборныя спакменьнікі.

Прадалі конскае валосьсе. Вучыцель забараніў ходзіць у школу з даўгім валосьсям. Ярыца шуміць сьпелым калосьсям. Гэты крамнік гандлюе старым зялезьзям. У густым лозьзю вяліся птушкі. Рызьнік купляе рызьзё. Ен гандлюе рызьзём. На сьнезе відаць былі сьляды палазьзя.

Перапішэце гэтыя прыклады.

Адзіночны лік	множны лік	зборныя.
4. Войстры нож	войстрыя нажы	войстрае нажжо
Таўстое бярно	таўстыя бёрны	таўстое бярвеньне
Чорная варона	чорныя вароны	чорнае вараньнё
Цьвярды камень	цьвярдыя камяні	цьвярдое каменьне
Яловы карэнь	яловыя карані	яловае карэньне
Сухое палена	сухія палены	сухое паленьне
Сыры сук	сырыя сукі	сырое суччо

Перапішы й падчыркні зборныя спакменьнікі і зацем уверсе, у якім склоне яны стаяць.

У краме было мноства рознага нажжа. Нажжом гандлююць у зялезных крамах. На ўзьбярэжжу ляжаць кучы бярвеньня. Яго пагоняць плытамі. Сямчанок гандлюе дзервам: дрыўмі, бярвеньням, балькамі й дошкамі. Ад вараньня й крумкач не ўбароніцца. З вараньнём ён ня справіцца. Драбнога каменьня прывезьлі на паправу шашы. Накраталі воз каменьням. Ля берагу ў карэньню вяліся ракі. Неўспадзеўкі ў ім аказалася роднае карэньне. Ніхто з нашых грудзёў ня вырве роднага карэньня. Пастушкі нанесьлі сухога паленьня. Сухім паленьням добра паліць. Яно добра гарыць.

Зьвярнеце ўвагу, што ў прыведзеных зборных спакменьніках стаіць перад канчаткам. Але, падвойныя сугукі. Значыцца, перад канчаткам зборных спакменьнікаў сугукі здвоеваюцца. Падчыркнеце падвойныя сугукі ў дагэтуль прыведзеных зборных спакменьніках.

Адзіночны лік	множны лік	зборныя.
5. добры брат	добрыя браты	добрае брацьце
зялёная ветка	зялёныя веткі	зялёнае вецьце
зялёны ліст	зялёныя лісты	зялёнае лісьцё
мая дуда	мае дуды	маё дудзьдзе
новая судзіна	новыя судзіны	новае судзьдзё
даўгая жэрдзь	даўгія жэрдзі	даўгое жардзё

Наступныя спакменьнікі таксама зборныя: збожжа, багацьце, порце, хусьце, трысьцё.

Перапішэце прыведзеныя пад пунктам 5. прыклады і перад канчаткам зборных падчыркнеце сугук — падвойны або адзіночны.

Прыгледзьцеся да тых зборных, што маюць перад канчаткам падвойны сугук, і да тых, што маюць сугук адзіночны. Прыраўнуйце адны да адных. Якую бачыце між іх розьніцу? Але, у тых зборных, што маюць адзіночны сугук перад канчаткам, перад гэтым сугукам стаіць іншы сугук (**лісьцё, порце, хусьце, жардзё**).

Адгэтуль правіла: **калі перад сугукам, што мае здвоіцца, стаіць іншы сугук, дык здваеньня ня бывае.**

Перапішэце, падчыркнеце зборныя спакменьнікі і зацемце ўверсе, у якім склоне яны стаяць.

Бярозы шумелі зялёным веццям. Увосень лісьцё жаўцее. Дзеці назьбіралі кляновага лісьця пад хлеб. Лісьцём падсьцілаюць жывёле. І лубінавым дудзьдзям таксама падсьцілаюць. На рынку прадавалі судзьдзё. Ехаў воз із судзьдзём. У судзьдзю была ежа. У нас не ставала судзьдзя. Жардзём гарадзілі плот. Мыцьцёха разьвесіла памытае хусьце. Хусьце накш завуць порцям.

Перапішэце ўсі ніжменаваныя прыклады і падчыркнеце ў зборных перад канчаткам падвойны або адзіночны сугук.

Адзіночны лік	множны лік	зборныя.
наш баярын	нашыя баяры	нашае баяр'е
дзікі зьвер	дзікія зьвяры	дзікое зьвяр'ё
вароняе пяро	варонія пёры	вароняе пер'е
старая скура	старыя скуры	старое скур'ё
зялёны дуб	зялёныя дубы	зялёнае дуб'ё
малая купіна	малыя купіны	малое куп'ё
высокае дзерва	высокія дзервы	высокае дзярэўе
гліняны чэрап	гліняныя чарапы	глінянае чарап'ё
кусьлівы гад	кусьлівыя гады	кусьлівае гадаўё

Ці ў прыведзеных гэтта прыкладах таксама маем у зборных спакменьніках перад канчаткам падвойныя сугукі?

Значыцца, **сугук р і вусьняныя (б, п, м, ў) ня здвойваюцца.**

Перапішэце, падчыркнеце зборныя спакменьнікі і зацемце ўверсе, у якім склоне яны стаяць.

У шаўца было ня мала рознага скур'я. На санажаці зразалі куп'ё. Валялася чарап'ё ад пабітага судзьдзя.

На полю каменьне. Рэдка бывае зямля без каменьня, хоць яно не расьце. Каменьню дождж не памагае й ня шкодзе. На канюшыне зьбіраюць каменьне. З каменьням зямля не благая. Але на каменьню нічога не расьце.

Бачыце, што зборныя спакменьнікі ніякага роду скланяюцца подле скланеньня ў вадзіночным ліку спакменьнікаў ніякага роду зь мяккім сугукам перад канчаткам, або із сугукамі **р, дж, ж, ч, ш, ц** перад канчаткам.

Перапішэце, падчыркнеце зборныя спакменьнікі, зацемце ўверсе, у якім склоне яны стаяць і адлучэце ў іх канчаткі.

На прызьбе ляжала сьвежае карэньне. Гэта пастух яго прынёс. Ен надзер карэньня ў лесе. З карэньня ён пляце кашы. Дзякуючы карэньню напляце шмат кошыкаў. Дзяручы карэньне,

шкодзім дзярэўю. Дзярэўе дастае сабе карэньням жыр. На карэньню ё драбнюсенькія карэнчыкі. Яны і ўцягуюць жыр ізь зямлі. Лісьцём і карою дзярэўе дыхае.

Калосьсе найдарожшая часьць жыта. З калосься найбольшая карысьць. Дзеля таго гаспадар уважае на калосьсе. Калосьсю прыяе добрая зямля. Шуміць тады збожжа вялікім калосьсям. У вялікім калосьсю буйныя зярняты.

РАЗЬДЗЕЛ XVIII.

Скланеньне II.

Да скланеньня 2. належаць спакменныя ймёны ці — накш — спакменьнікі жаноцкага й мужчынскага роду з канчаткам -а (-я) ў наз. скл. адз. ліку. Прыклады: **вад - а, зямл - я, вайвод** - а, **судзьдз - я.**

§ **94.** Зразы скланеньня спакменьнікаў жаноцкага роду II. скланеньня.

Адзіночны лік.

Н.	1. вад-а	2. хат-а	3. зямл-я	4. вішн-я
Д.	вад-ы	хат-ы	зямл-і	вішн-і
Прз.	вадз-е	хац-е	зямл-і	вішн-і
Прм.	вад-у	хат-у	зямл-ю	вішн-ю
Сн.	вад-ою (й)	хат-аю (й)	зямл-ёю (й)	вішн-яю (й)
М.	на (аб) вадз-е	хац-е	зямл-і	вішн-і

Множны лік.

Н. Прм.	вод-ы	хат-ы	земл-і	вішн-і
Д.	вод-аў	хат-аў	земл-яў	вішн-яў
Прз.	вод-ам	хат-ам	земл-ям	вішн-ям
Сн.	вод-амі	хат-амі	земл-ямі	вішн-ямі
М.	на (аб, у, пры, па) вод-ах	хат-ах	земл-ях	вішн-ях

Адзіночны лік.

Н.	5. кар-а	6. зар-а	7. дзяж-а	8. сах-а
Д.	кар-ы	зар-ы	дзяж-ы	сах-і
Прз.	кар-ы	зар-ы	дзяж-ы	сас-е
Прм.	кар-у	зар-у	дзяж-у	сах-у
Сн.	кар-ою (й)	зар-ою (й)	дзяж-ою (й)	сах-ою (й)
М.	кар-ы	зар-ы	дзяж-ы	сас-е

Множны лік.

Н. Прм.	кор-ы	зор-ы	дзеж-ы	сох-і
Р.	кор-аў	зор-аў	дзеж-аў	сох-аў
Прз.	кор-ам	зор-ам	дзеж-ам	сох-ам
Сн.	кор-амі	зор-амі	дзеж-амі	сох-амі
М.	на (аб, у, пры, па) кор-ах	зор-ах	дзеж-ах	сох-ах

Адзіночны лік.

Н.	9. рак-а	10. навук-а	11. дачк-а	12. лаўк-а
Д.	рак-і	навук-і	дачк-і	лаўк-і
Прз.	рацц-э	навуцц-ы	дачц-э	лаўц-ы
Прм.	рак-у	навук-у	дачк-у	лаўк-у
Сн.	рак-ою (й)	навук-аю(й)	дачк-ою (й)	лаўк-аю (й)
М.	рацц-э	навуцц-ы	дачц-э	лаўц-ы

Множны лік.

Н. Прм.	рэк-і	навук-і	дачк-і	лаўк-і
Д.	рэк-аў	навук-аў	дач-ок	лаўк-аў
Прз.	рэк-ам	навук-ам	дачк-ам	лаўк-ам
Сн.	рэк-амі	навук-амі	дачк-амі	лаўк-амі
М.	аб (на, у) рэк-ах	навук-ах	дачк-ах	лаўк-ах

Зацемка. Клічны склон у 2. скланеньню аднолькавы з назоўным склонам.

Перапішэце і над спакменьнікамі I. скланеньня пастаўце 1, над спакменьнікамі II. скланеньня — 2, ды абазначце, у якім склоне й ліку яны стаяць.

Чатыры гароды.

У чыстым полю чатыры гароды:
У вадным гародзе чырвона рожа,
У другім гародзе зялёна рута,
У трэйцім гародзе пахнюча мята,
А каля прыплоцьця крапіўка.
А хто прыгожы, пільнуй рожы;
А хто круты, пільнуй руты;
А хто багаты, пільнуй мяты;
А хто лянівы, пільнуй крапівы.

Як будзілася пушча.

Дрозд, на елцы сеўшы, стаў сьвістаць, сьміяцца,
Што ён песьняй можа з салаўём зраўнацца.
Гаспадар у лесе — дзяцел наш насаты —
Ня любіў, каб сварка выхадзіла з хаты:
Як абухом грукнуў у сухую елку,
Каб уцішыць сварку.
Памачніцы жоўны тут-жа затрашчэлі:
Дзятлаву каманду, відаць, зразумелі.
І, як макам сеяў, так прыціхла пушча,
Толькі рэхам нейдзе азвалася гушча...
Доўга дзяцел слухаў, наставіўшы вуха, —
Зьлявцеў пасьля ў кузьню і стаў каваць глуха.

§ 95. **Агульныя зацемкі аб некаторых спакменьніках II. скланеньня.**

а) У спакм. **скала** націск заўсёды на **ска-**.

Спакменьнікі **вярба, ліпа, грамада** маюць у вадз. ліку націск на канцы, а ў множным на аснове.

Таксама ёсьць у спакменьніка **думá**, а **кляцьба**.

У спакм. **прысяга** націск на першым складзе.

б) Наступныя спакменьнікі — падчыркненыя ў проказях — маюць падвойны сугук: **Мыцьцёха** мые хусьце. **Пяюльля** пяе песьні. **Пральля** прадзе кудзелю. **Снульля** снуе. **Ткальля** тчэ кросны. **Ральля, свацьця, судзьдзя.**

в) Зьвярнеце ўвагу на склады **-ры-, -лы-, -мы-** ў наступных спакменьніках II. скланеньня: яблына, ятрывя, брындушка, дрыгата, дрыгва, дрыготка, дрымота, клычка, крыха, крыхатка, крышка, мыгла, сьвякрывя, трыгубіца, трысьціна.

Спакменьнікі **блыха, сьліза** маюць у вадз. ліку **-лы-, -лі-**: д. скл. блыхі, сьлізы; прз. блысе, сьлізе; прм. блыху, сьлізу; сн. блыхою (й), сьлізою (й); м. аб блысе, сьлізе; а ў мн. ліку гэтыя спакменьнікі маюць **-о-, -ё-** (**блохі, сьлёзы** і г. д.), сн. склон мн. л. ад **сьліза** ё **сьлязьмі** й **сьлізьмі**.

ґ) Зьвярнеце ўвагу на склад **-ыр-** з папярэднім сугукам у наступных спакменьніках 2. скланеньня: чырва, цырата, цырамоня, канцылярыя (канцыляра).

г) Наступныя спакменьнікі 2. скланеньня пачынаюцца зь **і-**: істужка, іскрыпка, ісьпіца, іржа, імжа (мыгла), імша, імшара, ігруша.

х) Наступныя спакменьнікі 2. скланеньня ня маюць **і** на пачатку: **гліца, голка** (што шьць), Забэля, мянушка.

д) Зьвярнеце ўвагу на канчаткі наступных словаў: Аміля, Апалёня, Аўгіня, Аўрэля, бібля, губэрня, клябаня, Маланя, Настася, Наталя, півоня, Панася, паліца (ё **паліца**, што даглядае парадку, і **паліца** — прыбітая да сьцяны дошчачка), Разаля, станца, Таццяна, Цыцыля, Юля, Юстыня.

Заданьне 1. Прыпомнеце як найбалей абстрактных спакменьнікаў на **-іня** і напішэце іх у проказях, значыцца, каб у кажную проказь уходзіў такі спакменьнік.

Заданьне 2. Прыпомнеце колькі мага спакменьнікаў на **-іна**, абазначаючых адзінку, і ўкладзеце проказі зь імі.

Заданьне 3. Перапішэце з-пад пункту в) усі спакменьнікі II. скланеньня з **-ры-, -лы-, -лі-** і дапішэце да іх усі спакменьнікі I. скланеньня з гэтай-жа асаблівасьцяй.

Заданьне 4. Перапішэце з-пад пункту ґ) спакменьнікі II. скланеньня з **-ыр-, -ір-** і дапішэце да іх з гэтай-жа асаблівасьцяй спакменьнікі I. скланеньня, калі такія знаеце.

Заданьне 5. Перапішэце з-пад пункту г) жаноцкія спак-

меньнікі з **і-** на пачатку і дадайце да іх спакменьнікі І. скланеньня з гэтай-жа асаблівасьцяй.

Заданьне 6. Перапішэце з-пад пункту х) жаноцкія спакменьнікі, ня маючыя **і-** на пачатку, дадайце да іх падобныя спакменьнікі І. скланеня ды ўкладзеце зь іх проказі.

Заданьне 7. Прыпомнеце й напішэце як найбалей хрышчоных імёнаў жаноцкіх, што канчаліся-б на **-я** з папярэднім сугукам (значыцца самагук **-а** з папярэднім мяккім сугукам), такіх, як **Хвядося,** (глядзеце, каб ня былі зьмяншальныя або любасныя).

§ 96. Зацемкі аб канчатках розных склонаў спакменьнікаў II. скланеньня.

Прызначальны й мясцовы склон адз. ліку маюць тый самы канчатак.

а) Спакменьнікі зь цьвярдым сугукам на канцы асновы **(вада)** канчаюцца ў прызначальным і мясцовым скл. адз. л. на **-е (вадз-е, хац-е).**

б) Спакменьнікі зь мяккім сугукам на канцы асновы канчаюцца ў прызначальным і мясц. скл. адз. л. на **-і (зямл-і, вішн-і).**

в) Спакменьнікі із **р, дж, ж, ч, ш, ц** на канцы асновы канчаюцца ў прызн. і мясц. скл. адз. л. на **-ы (на кар-ы, зар-ы, дзяж-ы, каш-ы, куч-ы, вуліц-ы),** значыцца, маюць тый самы канчатак, што й спакменьнікі зь мяккім сугукам на канцы асновы, толькі заміж мяккога маюць зацьвярдзелы сугук перад канчаткам (**ы** паказуе цьвярдзіню папярэдняга сугуку).

г) У спакменьнікаў з **г, х** перад канчаткам у прызн. і мяс. склоне **г** пераходзе ў **з** (на **наз-е**), а **х** — **с** (у **сас-е**).

ґ) У спакменьнікаў з **к** перад канчаткам **к** у прз. і мяс. склоне пераходзе ў **ц,** пры гэтым калі перад **к** няма сугуку або паўсамагуку **(рака, навука),** дык будзе падвойнае **-цц** (у **раццэ,** у **навуццы),** а калі ё сугук ці паўсамагук, дык будзе **ц** адно **(дачка — дачцэ, рэчка — у рэчцы, лаўка — на лаўцы).** Трэба яшчэ зацеміць, што калі спакменьнікі на **-ка** маюць націск на канцы, дык у прз. — мясц. склоне будзе **-э (раццэ, дачцэ),** а калі націск на аснове, дык **-ы (у вапеццы, на лаўцы).**

Прыймальны склон адз. л. У спакменьнікаў, маючых у наз. скл. адз. ліку націск на канцы **(нага, рука, саха, галава, зямля),** застаецца ён на канцы ў прыйм. скл. адз. л. **(нагу, руку, саху, галаву, зямлю).**

Калі спакменьнік у прыймальным скл. адз. л. папераджаюць прыймёны **на, аб** і пад., дык націск на іх не пераходзе, значыцца, ё **на нагу, на галаву, на зямлю.**

Назоўны склон множнага ліку. Спакменьнікі **жонка** (гэтае слова значыць таксама **»жанчына«),** **дачка, дзеўка** маюць у на-

зоўным і іншых склонах множнага ліку націск на канчатку. Значыцца, у множным ліку скланяюцца яны гэтак:

Н.	жанкі	дачкі	дзяўкі
Д.	жанок	дачок	дзявок
Прз.	жанкам	дачкам	дзяўкам
Прм.	жанок	дачок	дзявок
Сн.	жанкамі	дачкамі	дзяўкамі
М.	жанках	дачках	дзяўках

Зацемка. Калі слова **»жонка«** ня значыць »жанчына«, дык у множным ліку можа мадь націск на аснове (**жонкі** і г. д.).

Дакладны склон мн. ліку мае канчатак **-аў, яў (вод-аў, зем-л-яў).** Таксама бальшыня спакменьнікаў на **-ка** мае канчатак **-аў** (лаўкаў, галоўкаў) і адно некаторыя на **-ка** могуць канчацца таксама на **-ок (жанок, дашчок, дачок).**

Капа, рука й **нага** маюць у дакл. скл. мн. л. толькі **коп, рук, ног; авечка** мае **авец. Рука, нага** маюць у прз. скл. мн. л. **рукам, нагам,** а ў мясц. **руках, нагах.** Значыцца, як усі іншыя спакменьнікі II. скланеньня.

Дзеля націску зьвярнеце ўвагу на скланеньне ў мн. ліку спакменьнікаў **галава, барана, старана.**

Н. Прм.	галавы	бараны	стараны
Д.	галоваў	баронаў	старонаў
Прз.	галавам	баранам	старанам
Сн.	галавамі	баранамі	старанамі
М.	у (на, па, пры) галавах	баранах	старанах

Значыцца, апрача дакл. скл. мн. л. ў усіх іншых склонах мн. ліку націск на канчатку.

Гэтак у множным ліку скланяюцца ўсе спакменьнікі жаноцкага роду, маючыя ў васнове **-ала-, -ара-** і націск на канцы ў вадз. ліку (**баразна** і іншыя пад.). Радзей гэтая група ўжываецца з націскам у мн. ліку на 2. складзе (галовы й пад.).

Парны лік.

Апрача ліку адзіночнага й множнага спакменьнікі жаноцкага роду на **-а, -я** маюць яшчэ хормы парнага ліку. Парны лік ужываецца тады, калі абазначаюць пару або пры ліках **дзьве, тры, чатыры.** Прыклады: дзьве назе; дзьве, тры, чатыры сасе і пад.

Хормы — **дзьве, тры, чатыры нагі, рукі** й пад. зьяўляюцца хормамі мн. ліку із захаваным націскам ліку парнага.

Заданьне 1. Праскланяйце на пісьме, адзначаючы канчаткі: бяда, рада, пахадня (месца, прызначанае на хадню на вуліцы), лазьня, залаза, дзядзіна.

З а д а н ь н е 2. Праскланяйце на пісьме, адзначаючы канчаткі: дзіра, нара, **вячэра**, мяжа, дуга, нага. Праскланяй **гара** ў проказях або ўлажы апавяданьне, у каторым скланяўся-б спакменьнік **гара**.

З а д а н ь н е 3. Напішы, адлучаючы канчаткі, скланеньне гэт'кіх спакменьнікаў: рука, прынука, рашка, бойка (што біць масла).

З а д а н ь н е 4. Праскланяй, адлучаючы канчаткі і ставячы націск, гэт'кія спакменьнікі: пустыня, раўніна, даліна, лагчыня, нізіна.

З а д а н ь н е 5. Праскланяй у васобных проказях або ў вапавяданьню: вярба, ліпа, грамада. Скланяючы стаў націск.

§ 97. Належачыя да II. скланеньня спакменьнікі мужчынскага роду.

Да II. скланеньня належаць таксама наступныя групы спакменьнікаў мужчынскага роду з канчаткам на **-а (-я)**.

а) Гэт'кія, як **вайвода**, судзьдзя, старшыня, сабака, музыка.

б) Адале ўсе спакменьнікі супольнага роду тады, калі абазначаюць асобу мужчынскую: **боўдзіла**, гуляка, дурніла, забіўца, калека, нядбайліца, п'яніца, поэта, разінька, салапяка, прыемца, прадпрыемца, спадкаемца, глуханда, **сьлепанда** і іншыя супольнага роду (глянь вышэй балей прыкладаў на бач. 53).

в) Розныя спакменьнікі на **-ка: бацька**, дзядзька, Юрка, Янка, Міхалка, Міхалька, Сымонька і да г. п. Сярод іх ё мноства маючых значаньне зьмяншальнае або любаснае.

ґ) Спакменьнікі на **-ра, -ла** з папярэднім сугукам або паўсамагукам: **Аляксандра**, Лаўра, Пётра, Сыльвэстра, майстра, магістра, бурмістра, міністра, літра (гэктолітра й пад.), **мэтра** (цэнтымэтра, мілімэтра, кілемэтра і пад.), зубра, сябра, швагра, тыгра, нэгра, Паўла і іншыя.

Менаваныя спакменьнікі паўсталі такім спосабам, што да слова, каторае канчалася на **-р, -л** із папярэднім сугукам (Пётр, зубр), было на канцы дадана **-а (Пётра, зубра).**

Сюды-ж належаць спакменьнікі мужчынскія, маючыя канчатак **-а** з двума папярэднімі сугукамі, зь якіх першы **-р** або **-л: маршалка, Карпа, Марка,** Адольфа, Палікарпа й пад. Надабе зацеміць, што **Адольфа** й **Палікарпа** маюць яшчэ хорму **Адоль, Палікар** і ў гэтай хорме яны належаць да I. скланеньня.

Зацемка. Спакменьнікі **літра, мэтра** бываюць таксама жаноцкага роду.

Прыклады скланеньня групаў а, б, в.

Адзіночны лік.

Н. й Кл.	а) вайвод-а	б) поэт-а	в) дзядзьк-а
Д.	вайвод-ы	поэт-ы	дзядзьк-і
Прз.	вайводз-е і вайвод-у	поэт-у радзей: поэц-е	дзядзьк-у радзей: дзядзьц-ы
Прм.	вайвод-у	поэт-у	дзядзьк-у
Сн.	вайвод-ай (але й ьайвод-ам)	поэт-ам	дзядзьк-ам (радзей: дзядзьк-ай)
М.	аб вайвод-у	поэт-у	дзядзьк-у

Значыцца, што да групаў а, б, в, дык у вадз. ліку розьніца ў іх ад скланеньня спакменьнікаў жаноцкага роду тая, што ў прз. і сн. склонах апрача канчаткаў II. скланеньня ё — і на'т пераважаюць — канчаткі I. скланеньня. Тое самое ў склоне мясцовым, дзе канчатак **-у** асобавых спакменьнікаў I. скланеньня.

Множны лік.

Н. й Кл.	вайвод-ы	поэт-ы	дзядзьк-і
Д.	вайвод-аў	поэт-аў	дзядзьк-оў
Прз.	вайвод-ам	поэт-ам	дзядзьк-ом
Прм.		Як дакладны.	
Сн.	вайвод-амі	поэт-амі	дзядзьк-амі
М.	вайвод-ах	поэт-ах	дзядзьк-ох

У множным ліку скланеньне групаў **а, б, в** з націскам на аснове нічым ня розьніцца ад скланеньня спакменьнікаў жаноцкага роду на **-а (-я)**, а спакменьнікі з націскам на канчатку ў **мн.** ліку скланяюцца подле I. скланеньня.

Прыклады скланеньня групы ґ.

Адзіночны лік.

Н.	Пётр-а	2. майстр-а	3. мэтр-а	4. маршалк-а
Д.	Пётр-ы	майстр-ы	мэтр-ы	маршалк-і
Прз.	Пётр-у	майстр-у	мэтр-у або мэтр-ы	маршалк-у
Прм.	Пётр-у	майстр-у	мэтр-у	маршалк-у
Сн.	Пётр-ам	майстр-ам	мэтр-ам	маршалк-ам
М.	Пётр-у	майстр-у	мэтр-ы або мэтр-у	маршалк-у
Кл.	Пётр-у	майстр-у	мэтр-у	маршалк-у

Значыцца, група ґ) у вадз. ліку розьніцца ад скланеньня спакменьнікаў жаноцкага роду тым, што ў прз., сн. і кл. склоне мае канчаткі I. скланеньня — у прз. **-у**, у снадз. **-ам.** Апрача

таго ў мясцовым склоне асобавыя спакменьнікі канчаюцца на **-у** (канчатак асобавых спакменьнікаў мужчынскіх I. скланеньня).

Множны лік.

Н. й Кл.	Пётр-ы	майстр-ы або майстр-ове	мэтр-ы	маршалк-і
Д.	Пётр-аў	майстр-оў	мэтр-аў	маршалк-аў
Прз.	Пётр-ам	майстр-ом	мэтр-ам	маршалк-ам
Прм.	Пётр-аў	майстр-оў	мэтр-ы	маршалк-аў
Сн.	Пётр-амі	майстр-амі	мэтр-амі	маршалк-амі
М.	Пётр-ах	майстр-ох	мэтр-ах	маршалк-ах

З прыкладаў бачым, што ў множным ліку спакменьнікі мужчынскія групы ґ) на **-ра, -ла** з папярэднім сугукам, або **з -р, -л** + сугук перад **-а**, маючы націск на аснове, скланяюцца аднолькава із спакменьнікамі жаноцкімі, а калі маюць націск на канчатку, дык скланяюцца подле I. скланеньня. Як **майстры,** так скланяюцца **зубры, сябры, швагры** і іншыя, маючыя ў мн. ліку націск на канчатку. Ведама, канчатак наз. й кл. склонаў **-ове** могуць мець толькі спакменьнікі асобавыя, а прыймальны мн. ліку назоваў жывёлы заўсёды аднолькавы з наз. таго-ж ліку **(палюю на зубры, на тыгры).**

РАЗЬДЗЕЛ XIX.

Скланеньне III.

Да трэйцяга скланеньня належаць спакменьнікі жаноцкага роду, маючыя на канцы асновы сугук **(гусь, рэч,** ноч, сьмерць, соль, медзь) або паўсамагук **(кроў).** У множным ліку сюды ўходзяць **дзьверы,** грудзі, людзі, гусьлі, сані, сені, куры.

§ 98. Агульныя зацемкі.

а) Спакменьнікі III. скланеньня на **-осьць** (не пад націскам **-асьць)** часта маюць на гэты суфікс націск **(маладосьць, прыгажосьць, цярплівосьць, весялосьць** і інш.).

б) Зьвярнеце ўвагу, што наступныя спакменьнікі III. скланеньня пачынаюцца з **-і: імклівасьць, імсьлівасьць.**

в) Зьвярнеце ўвагу на склад **-ыр-** у гэт'кіх спакменьнікаў: **чырвань, чырвень** (масьць у картах).

Перапішэце, падчыркнеце спакменьнікі III. скланеньня й заземце, у якім склоне й ліку яны стаяць.

Вось.

Купец вёз соль. Ен гандляваў сольлю. У яго зламалася вось. »Бяда із слабымі восьмі!« — наракаў купец. У сяле восі рабіў сталяр. У яго было ня мала гатовых восяў. Купец пайшоў да

сталяра купіць вось. Сталяр жыў на аднаселі. Да яго было далёка йсьці. А сярод ночы было нягодна йсьці. Па дарозе купцу здалася здань, хоць ён зданяў не баяўся. Прыйшоўшы, купец не засьпеў сталяра дома. Чэлядзь таксама была вонках. Купец ня ведаў, што рабіць. »Дрэнь вось« — думаў ён — »а во колькі клопату«.

Зразы скланеньня.

Адзіночны лік.

Н. Прм. й Кл.	1. соль	2. ноч	3. рэч	4. кроў	5. любоў
Д.	сол-і	ноч-ы	рэч-ы	крыв-і	любов-і
Прз.	сол-і	ноч-ы	рэч-ы	крыв-і	любов-і
Сн.	сол-яю (й) (сольл-ю)	ноч-аю (й) (ночч-у)	рэч-аю (й) (рэчч-у)	крыв-ёю	любоў-ю
М.	аб(у, на) сол-і	ноч-ы	рэч-ы	крыв-і	любов-і

Як **кроў**, таксама скланяецца **сьвякроў** (дакл. сьвякрыві і г. д.).

Множны лік.

Н. Прм. й Кл.	сол-і	ноч-ы	рэч-ы
Д.	сол-яў	ноч-аў	рэч-аў
Прз.	сол-ям	нач-ом	рэч-ам
Сн.	соль-мі	нач-мі	рэч-мі
М.	сол-ях	нач-ох	рэч-ах

Перапішэце, падчыркнеце спакменьнікі III. скланеньня, зацемце, у якім склоне й ліку яны стаяць, і адлучэце ў іх канчаткі.

Татулька казаў казань у царкве. Наш татулька добры казаньнік. З казані ягонай людзі вучацца. І на Вялікдзень ён быў із казаняй.

Мы выкапалі копань. З копані маем шмат карысьці. У копані вядзецца рыба. У нашых суседзяў ё колькі копаняў. З копаньмі не вялікая работа.

Бабульчыны куры.

Бабуля склікала куры ў сені. У сянёх яна іх карміла. Стаячы ў дзьвярох, яна пасыпала куркам ячменю. Ажно тут бабулька зацеміла, што не стае аднае курачкі. Яна засталася за дзьвярмі. »Бяда з гэтымі курмі« — падумала бабуля.

§ 99. Зацемкі да канчаткаў розных склонаў.

Снадзіўны склон адз. **л.** мае канчатак **-яю** або **-яй (соляю, соляй)**, а пад націскам — **ёю** або **ёй.** Апрача тага ё канчатак **-ю** (па зацьвярдзелых сугуках **-у**), пры гэтым перад **-ю**, -у бывае здваеньне сугуку **(сольлю).** Як заўсёды, **р** і вусьняныя **(б, п, м, ў)** ня здвоеваюцца і ня бывае здваеньня тады, калі перад сугукам, што мае здвоіцца, стаіць іншы сугук **(з косьцю, перад сьмерцю).**

Дакладны склон мн. л. звычайна мае канчатак **-яў (радасьцяў, справядлівасьцяў, любасьцяў, прыязьняў, упорыстасьцяў** і г. д.), па зацьвярдзелых сугуках **-аў (рэчаў)**, а пад націскам **-ёў (грудзёў)**. Калі ў дакл. склоне мн. л. націск на аснове, дык заўсёды ёсьць **-яў** або **-аў** (па зацьвярдзелых), а калі націск на канцы, дык адныя спакменьнікі канчаюцца на **-ёў (грудзёў, людзёў)**, другія на **-ей (гусей)**.

Прызначальны склон мн. л. мае канчатак бяз націску **-ям (радасьцям)**, па зацьвярдзелых ё **-ам (рэчам)**. Пад націскам ё **-ём (касьцём, грудзём, санём, сянём, людзём)**, а па зацьвярдзелых **-ом (начом, дзьвяром)**.

Снадзіўны склон мн. л. канчаецца на **-мі (касьцьмі, грудзьмі, дзьвярмі, людзьмі, саньмі, сяньмі)**.

Мясцовы склон мн. л. канчаецца, бяз націску на канцы, на **-ях (у копанях, аб радасьцях)**, па зацьвярдзелых ё **-ах (рэчах)**. Пад націскам ёсцека **-ёх (у касьцёх, санёх, сянёх, у грудзёх, у людзёх)**, а па зацьвярдзелых **-ох (у дзьвярох, па начох)**.

Куры маюць гэт'кія хормы ў множным ліку: н. прм. — куры, дакл. — **курэй**, прз. — курам, сн. — курмі, м. — аб курах.

Пры скланеньню спакменьнікаў **любоў** і **вош** самагук асновы **о** не выпадае (любові, вашы, мн. л. — вошы, вошаў і г. д.). Як агульны спакменьнік **любоў**, таксама скланяецца хрышчонае імя **Любоў**.

Чэсьць скланяецца гэтак:

	Адзіночны лік.	Множны лік.
Н. Прм. Кл.	**чэсьць**	**сьці**
Д.	**сьці**	**сьцёў**
Прз.	**сьці**	**сьцём**
Сн.	**сьцёю** або **сьцёй**	**сьцьмі**
М.	**сьці**	**сьцёх**

Значыцца, пры скланеньню самагук асновы выпадае. Рэдка бывае пры скланеньню на пачатку **-ч** (чсьці і г. д.) або **-ц** (цьсьці і г. д.

З а д а н ь н е 1. Выпішы спакменьнікі III. скланеньня з **-і-** на пачатку з-пад пункту б) і дапішы да іх спакменьнікі I. й II. скланеньня з тэй-жа асаблівасьцяй.

З а д а н ь н е 2. З I.—III. скланеньняў выпішаце спакменьнікі, у каторых ё склады з **-ыр-**, **-ір-** з папярэднім сугукам.

З а д а н ь н е 3. Праскланяй на пісьме, адлучаючы канчаткі і ставячы націск: гусь, маладосьць, маемасьць, маўклівасьць, дрэнь.

РАЗЬДЗЕЛ XX.

Чацьвертае скланеньне спакменных іменаў.

Да чацьвертага скланеньня спакменных іменаў належаць спакменьнікі ніякага роду, маючыя ў назоўным склоне адз. ліку хорму на **-мя:** імя, плямя, стрымя, бярэмя, цемя, семя, емя, вымя, полымя.

§ 100. Зразы скланеньня.

Адзіночны лік.

Н. Прм. Кл.	імя	плямя́	стрымя́
Д.	ім-ен-і	плям-ен-і	стрым-ен-і
Прз.	ім-ен-і	плям-ен-і	стрым-ен-і
Сн.	ім-ен-ям, ім-ям	плям-ен-ям, плям-ём	стрым-ен-ям, стрым-ём
М.	аб (на, у, пры, па) ім-ен-і	плям-ен-і	стрым-ен-і

Множны лік.

Н. Прм. й Кл.	ім-ён-ы	плям-ён-ы	стрым-ён-ы
Д.	ім-ён-аў	плям-ён-аў	стрым-ён-аў
радзей:	ім-ён	плям-ён	стрым-ён
Прз.	ім-ён-ам	плям-ён-ам	стрым-ён-ам
Сн.	ім-ён-амі	плям-ён-амі	стрым-ён-амі
М.	аб (на, у, пры, па) ім-ён-ах	плям-ён-ах	стрым-ён-ах

IV. скланеньне адзначаецца тым, што, апрача наз., прм. й кл. скл. адз. ліку, перад канчаткамі ўсіх іншых склонаў ё суфікс **-ен-**, каторы ў ліку множным пад націскам пераходзе ў **-ён**. У снадзіўным скл. адз. л. гэтага суфіксу можа ня быць.

Зацемка. Калі націск на канцы, дык у наз. скл. адз. ліку бываюць таксама хормы на **-ё (плямё).**

Перапішэце, падчыркнеце спакменьнікі IV. скланеньня й адлучэце ў іх канчатак і суфікс.

Кажны чалавек мае імя. Ня бывае чалавека бязь імені. Зь іменям бывае й жывёла. Розныя ёсьцека ймёны.

Было колькі плямёнаў крывіцкіх. Гэным плямёнам жылося добра. Яны займалі вялікія й багатыя прасторы.

Гэта бульба на емя, а гэна на семя. Коньнік меў сядло з харошымі стрымёнамі.

РАЗЬДЗЕЛ XXI.

Пятае скланеньне спакменных іменаў.

§ 101. Да V. скланеньня спакменных іменаў належаць спакменьнікі, абазначаючыя назовы маладое жывёлы ці — накш —

назовы дзяцей жывёлы, а таксама дзяцей людзкіх. Канчаюцца яны ў наз. скл. адз. ліку на **-ё** (па зацьвярдзелых на **-о — княжо)** часта з папярэднім суфіксам **-ян-, -ан-**. Прыклады: парасё, гусянё, зьверанё, куранё, птушанё, жарабё. Назовы дзяцей людзкіх: княжо, кавалянё, Піліпянё, блізьнё, дзіцё. Сюды належыць таксама **зярнё.** Хормы на **-я (парася, гусяня, княжа** й іншыя) — дыялектычныя (мясцовыя).

Перапішэце, падчыркнеце спакменьнікі пятага скланеньня й зацемце, у якім склоне й ліку яны стаяць.

Куравoдка вывяла на дворышча кураняты. З адным куранём сталася няшчасьце. Яно ўшчамілася ў плот. Шкада куравoдцы кураняці. Яна хацела памагчы беднаму кураняці. Дык пакінула засталыя і прыбегла ратаваць беднае куранё. Недалёка была гуска з гусянятамі і сучка із шчанём. Але куравoдка не збаялася іх.

Зразы скланеньня.

Адзіночны лік.

Н. Прм. Кл.	гусян-ё	княж-о	зярн-ё
Д.	гусян-яц-і	княж-ац-і	зярн-яц-і
Прз.	гусян-яц-і	княж-ац-і	зярн-яц-і
Сн.	гусян-ём	княж-ом	зярн-ём
М.	аб (па, пры, па, у) гусян-яц-і	княж-ац-і	зярн-яц-і

Таксама **рабё** (д. — рабяці, прз. — рабяці сн. — рабём, м. — аб рабяці).

Множны лік.

Н. Прм.	гусян-ят-ы	княж-ат-ы	зярн-ят-ы
Д.	гусян-ят-аў	княж-ат-аў	зярн-ят-аў
або:	гусян-ят	княж-ат	зярн-ят
Прз.	гусян-ят-ам	княж-ат-ам	зярн-ят-ам
Сн.	гусян-ят-амі	княж-ат-амі	зярн-ят-амі
М.	гусян-ят-ах	княж-ат-ах	зярн-ят-ах

Хто як завецца?

Дзеці катовы завуцца кацяняты. Дзеці медзьвядзёвы — медзьведзяняты. Казіныя дзеці — казяняты, асьліныя — асьляняты, мышыныя — мышаняты.

Напішы 10 назоваў дзяцей рознае жывёлы ды праскланяй іх, адлучаючы канчатак і суфікс.

Назовы маладое жывёлы ці — накш — дзяцей жывёлы ня могуць маці хормы на **-ёнак, -онак** або **-янок, -анок** (гусянёнак, рабёнак або гусянянок, рабянок). Хормы на **-янок, -анок** або **-ёнак, -онак** абазначаюць сына. Прыклады: **сын кавалёў — ка-**

валянок, сын Сёмкаў — Семчанок, сын Тураў — Туранок, або: кавалёнак, Туронак.

Дзіцё ў вадз. ліку належа да V. скланеньня, а ў ліку множным — да III. У ліку множным **дзіцё** скланяецца гэтак: н., прм., кл. — дзеці, д. — дзяцей, прз. — **дзяцём,** сн. — дзяцьмі, м. — аб **дзяцёх.**

Дзяўчо, мн. л. **дзяўчаты** — таксама належа да V. скланеньня і сваім скланеньням нічым ня розьніцца ад іншых.

Хорма множнага ліку ад **дзяўчо — дзяўчаты** служа таксама множным лікам для спакменьніка **дзяўчына,** а зьмяншальнае **дзяўчаткі** служа множным лікам для **дзяўчынка.** Значыцца, у вадз. л. ё **дзяўчына, дзяўчынка,** а ў множным — **дзяўчаты, дзяўчаткі.** Але **дзьве, тры, чатыры дзяўчыны, дзяўчынкі,** бо гэта заміж парнага ліку.

Маці або зусім не скланяецца, значыцца, у ўсіх склонах адз. ліку застаецца хорма **маці,** або замяняецца словам **матка.** Таксама ў множным ліку **маці** замяняецца словам **матка.**

РАЗЬДЗЕЛ XXII.

Прыметнік.

§ 102. Прыметнік альбо імя прыметнае гэта слова, абазначаючае **прымету** і наагул якую-колечы **якасьць** спакменю; прыкладам, якасьцю работніка можа быць, што ён добры, працаўлівы, акуратны, уважны, крывіцкі, селавы, мескі і г. д., якасьць ігрушы могуць абазначаць гэт'кія словы: вялікая, малая, сакаўная, сьпелая, зялёная, садовая, дзікая і г. д. Кніга можа быць бацькава, матчына, вучыцелева, старая, новая, цікаўная і г. д., якасьць надвор'я могуць абазначаць гэт'кія словы: ціхое, дажджлівае, маразянае, туманнае і г. д.

Прыметнікі адказуюць на пытаньні: **які? якая? якое? чый? чыя? чыё?**

§ 103. Род прыметнікаў.

У прыметніках ё тры рады: 1) мужчынскі род, прыкладам: **разумны** чалавек, **працаўлівы** работнік, **дзікі** зьвер і г. д.; 2) жаноцкі род, прыкладам: **разумная** дзяўчына, **працаўлівая** мурашка, **дзікая** гусь і г. д.; 3) ніякі род: **разумнае** дзіцё, **працаўлівае** стварэньне, **дзікое** зьверанё і да г. п. З гэтых прыкладаў відаць, што кажны прыметнік мае тры рады, у кажным родзе іншая хорма, тым-жа часам у спакменьнікаў таксама тры рады, але кажны спакменьнік ё заўсёды толькі аднаго роду. Прыкл., спакменьнікі: **чалавек, работнік, зьвер** і да г. п. — заўсёды мужчынскага роду; **дзяўчына, мурашка, гусь** і да г. п. — заўсёды жаноцкага, а гэт'кія як **дзіцё, стварэньне, зьверанё** і да г. п. — заў-

сёды ніякага роду. Тымчасам прыметнікі, прыкл., **разумны, працаўлівы, дзікі** і да г. п. — побач гэт'кіх хормаў мужчынскага роду, маюць яшчэ гэт'кія хормы жаноцкага роду: **разумная, працаўлівая, дзікая** — ды хормы ніякага роду: разумнае, **працаўлівае, дзікое.**

§ 104. Хормы прыметнікаў мужчынскага, жаноцкага й ніякага роду розьняцца адны ад адных канчаткам. У мужчынскім родзе ёсьцека канчатак **-ы** або **-і**, прыкладам: **добр-ы, стар-ы, сін-і** і да г. п.; у жаноцкім родзе канчатак **-ая** або **-яя: добр-ая, стар-ая, дзік-ая, сін-яя** і да г. п.; у ніякім родзе канчатак **-ое** (не пад націскам **-ае)** або **-яе: добр-ае, стар-ое, дзік-ое, сін-яе** і да г.п.

§ 105. Прыметнік без спакменьніка ня ўжываецца, бо калі завём прымету, то трэба назваць і самую рэч, спакмень. Хорма прыметніка ў мужчынскім родзе ўжываецца із спакменьнікамі мужчынскага роду, прыкл.: **лесавы зьвер, дарагі камень, сіні цьвет** і да г. п.; прыметнікі ў жаноцкім родзе ўжываюцца із спакменьнікамі жаноцкага роду, прыкл.: **лесавая трава, дарагая папера, сіняя хварба** і да г. п.; а із спакменьнікамі роду ніякага бывае прыметнік у ніякім родзе, прыкл.: **лесавое дзерва, дарагое збожжа, сіняе палатно** і да г. п. Звычайна кажацца, што прыметнік згаджаецца ў родзе із спакменьнікам, ля якога стаіць.

Заданьне. Перапішэце паказаную вучыцелям чытанку, падчыркнеце ў ёй прыметнікі ды абазначце аднэй літараю ўверсе род прыметнікаў.

§ 106. Націск некаторых прыметнікаў.

Наступныя прыметнікі маюць націск на канчатку: бляды, буйны, гаркі, грубы, даўгі, драбны, дужы, дзянны, крупны, лягкі, малы, мяккі, мылкі, радкі, смачны, сівы, слабы, стары, шытны, шпаркі, таўсты, ціхі, цьвярды, часты, блізкі, вузкі, нізкі, цяжкі, паганкі, падаўкі, станаўкі, трывалкі, непаваратні, нявісны, дасьціпны, наступны, пераступны (год), прыступны, агняны, вадзяны, смаляны, сябраны, нутраны, дармавы, млынавы.

Заданьне. Напішэце проказі, у якіх былі-б гэтта менаваныя прыметнікі.

Націск на першым складзе маюць гэт'кія прыметнікі: морскі, ночны, просты, сьмешны.

Прыметнік **людзкі** мае націск на канчатку, калі значыць »належачы да людзёў«, прыкладам: **людзкое жыта добрае,** а на першым складзе, калі знача »добры, ветлы, умеючы абыйсьціся зь людзьмі«.

У прыметнікаў **зімовы,** ліповы націск на 2. складзе.

Прыметнікі, утвораныя ад спакменьнікаў на **-ень,** маюць націск на суфіксе **-ен:** ячмень - ячменны, камень - каменны, карэнь — карэнны, крэмень — краменны, рэмень — раменны, спак-

мень - спакменны. Таксама націск на суфіксе **-ен** ёсьць у прыметнікаў, утвораных ад спакменьнікаў IV. скланеньня. Прыклады: імя - іменны, плямя - пляменны, стрымя - стрыменны.

Заданьне. Напішы проказі, у якіх былі-б ужыты гэтта прыведзеныя прыметнікі.

§ 107. Адно н а два нн у прыметніках. Адно тыя прыметнікі маюць два **нн,** што ўтвораны ад спакменьнікаў, маючых **н** на канцы асновы: акно - аконны, вайна - ваенны, вапна - вапенны, дрэнь - дрэнны, камень - каменны, сані - санны, сьцяна-сьценны, стайня - стаенны, туман - туманны. Але там, дзе ў васнове спакменьніка няма **н,** прыметнік мае толькі адно **н:** зямля - земляны, дзерва - дзярвяны, нутр - нутраны, салома - саламяны, шкло - шкляны.

§ 108. Прыметнікі зьмяншальныя, павялічальныя й любасныя. Некаторыя якасьці спакмянёў ня бываюць заўсёды аднолькавай меры, але ў вадных спакмянёў якасьць можа быць звычайнай велічыні, у другіх тая самая якасьць можа быць у недастатнай меры, у трэйціх ізноў тая-ж якасьць можа быць у такой вялікай меры, што большай немагчыма. Гэтак, прыкладам, адно палатно можа быць **белае,** другое **бялявае,** трэйцяе **бялюсенькае.** Прыметнікі, абазначаючыя недастатную меру якасьці, завуцца **зьмяншальнымі,** а прыметнікі, абазначаючыя найпаўнейшую меру якасьці, завуцца **павялічальнымі.** Апрача таго нам можа якая якасьць спакменю падабацца, мы можам яе любіць і гэта выказуем прыметнікамі **любаснымі,** прыкладам: беленькі, чорненькі, маленькі, дарагенькі або даражэнькі і да г.п.

Прыметнікі зьмяншальныя маюць хорму на **-явы** (значыцца, **-авы** з папярэднім мяккім сугукам), прыкладам: белы - бялявы, чорны - чарнявы, або на **-лявы** (жоўты - жаўтлявы, харошы — харашлявы, малады — малажлявы), або на **-аваты, -яваты:** малы - малаваты, стары - стараваты, сіні - сіняваты. Не ад усіх прыметнікаў, што могуць выказаваць розную ўвелькі якасьць, можа быць утворана менаванымі спосабамі хорма зьмяншальная, прыкладам, такое хормы няма ад прыметніка **разумны.**

Прыметнікі павялічальныя творацца суфіксам **-юсенькі** (па цьвярдых **-усенькі),** якi дадаецца да асновы звычайнай хормы прыметніка, прыкладам: белы — бялюсенькі, сіні — сінюсенькі, малы — малюсенькі, поўны — паўнюсенькі, добры — дабрусенькі і да г. п. Мала ё прыметнікаў, ад каторых нельга было-б утварыць іх хормы павялічальнай. Павялічальная хорма прыметнікаў творыцца таксама даданьням да хормы звычайнай словаў **вельмі, дужа, надта;** заўсёды гэта бывае тады, калі нельга ўтварыць павялічальнай хормы суфіксам **-юсеньк-і (-усеньк-і).**

Прыкладам: вельмі малы, дужа гаркі, дужа глыбокі, надта вялікі, надта высокі і да г. п.

Прыметнікі любасныя творацца суфіксам **-еньк-і** (па зацьвярдзелых **-эньк-і**, а калі не пад націскам, дык **-аньк-і)** Прыклады: чорны — чорненькі, сіні — сіненькі, дурны — дурненькі, разумны — разумненькі, стары — старэнькі, шэры — шэранькі і да г. п. Ад кажнага прыметніка ёсьцека хорма любасная.

Зацемка. Прыметнікі із суфіксам **к** пры тварэньні павялічальнай а любаснай хормы трацяць гэты суфікс: блізкі — блізюсенькі, блізенькі; вузкі — вузюсенькі, вузенькі; нізкі — нізюсенькі, нізенькі.

Заданьне. Напішы як найбалей прыметнікаў, выказуючых розную ўвелькі якасьць, і падай іх хорму любасную ды зьмяншальную й павялічальную, калі таковыя ёсьцека; вось гэтак: добры — добранькі, дабраваты, дабрусенькі, нізкі — нізенькі, нізкаваты, нізюсенькі.

§ 109. Ступені прыраўнаньня прыметнікаў. Раўнуючы якуюколечы якасьць аднага спакменя да падобных якасьцяў іншых спакмянёў, бачым, што:

1) альбо раўнаваныя спакмяні маюць тую якасьць у ваднолькавай меры, у роўнай ступені, прыкл., услон такі высокі, як крэсла; **брат добры і сястра добрая** і да г. п.

2) альбо адзін із раўнаваных спакмянёў мае дадзеную якасьць у ступені большай, вышшай, чымся яна ёсьць у другога спакменя, прыкл.: **стол вышшы за ўслон; сястра лепшая за брата** і г. д.

3) альбо, наапошку, адзін із раўнаваных спакмянёў пераўвышшае ўсе іншыя спакмяні ступеняй дадзенай якасьці, прыкл.: дом Арсянёў найвышшы ў местачку. Наталя наймалодшая ў радзіме.

§ 110. З гэтага бачым, што прыметнікі, апрача зьмены подле радоў, лікаў і склонаў, маюць яшчэ зьмену подле ступеняў, якую завём ступеньмі прыраўнаньня прыметнікаў. Гэтак:

1. Ступень роўная або звычайная ёсьць звычайнай хормаю прыметніка. У назоўным склоне адз. л. яна мае канчаткі **-ы, -і; -ая, -яя; -ое (-ае), -яе.** Прыкладам: роўн-ы, стар-ы, сін-і; роўн-ая, стар-ая, сін-яя; роўн-ае, стар-ое, сін-яе.

2. Ступень вышшая розьніцца ад ступені роўнай тым, што да ейнай асновы дадаецца **-шы, -шая, -шае,** прыкладам: стар-шы, стар-шая, стар-шае; сін-шы, сін-шая, сін-шае, або дадаецца **-ейшы, -ейшая, -ейшае,** прыкл.: раўн-ейшы, раўн-ейшая, раўн-ейшае.

Вышшая ступень на -ейшы. Наступныя групы прыметнікаў твораць вышшую ступень суфіксам **-ейшы:**

а) маючыя на канцы асновы н з папярэднім сугукам, або паўсамагукам: вольны — вальнейшы, поўны — паўнейшы, роўны — раўнейшы, смачны — смачнейшы і г. д.

б) маючыя на канцы асновы **р** або **л** з папярэднім сугукам: быстры — быстрэйшы, хітры — хітрэйшы, мудры — мудрэйшы, шустры — шустрэйшы, кіслы — кісьлейшы і г. д.

в) наступныя прыметнікі: бойкі — байчэйшы, вагкі — вагчэйшы, гаркі — гарчэйшы, лягкі — лягчэйшы, мяккі — мякчэйшы, шыбкі — шыбчэйшы, шпаркі — шпарчэйшы, паганкі — паганчэйшы, падаўкі — падаўчэйшы, станаўкі — станаўчэйшы, борзды — баржджэйшы, даўгі — даўжэйшы, цьвярды — цьвярдзейшы. Але й з гэтых некаторыя могуць маць вышшую ступень на **-шы**, прыкл.: мякшы, шыбшы, доўжшы.

Вышшая ступень на -шы. Усе засталыя прыметнікі твораць вышшую ступень суфіксам **-шы.** Прыклады: багаты — багатшы, белы — бельшы, бляды — бледшы, гарачы — гарачшы, харошы — харошшы, хваравіты — хваравітшы, худы — худшы, хворы — хворшы, дарагі — дарожшы, дужы — дужшы, здаровы — здароўшы, зялёны — зялёншы, дзікі — дзікшы, жоўты — жоўтшы, ласкавы — ласкаўшы, лісьлівы — лісьліўшы, любовы — любоўшы, малады — малодшы, мілы — мільшы, новы — ноўшы, просты — простшы, сіні — сіншы, сыты — сытшы, скупы — скупшы, стары — старшы, сьвяты — сьвятшы, сьмелы — сьмельшы, сьпелы — сьпельшы, цяжкі — цяжшы, справядлівы — справядліўшы, танны — таншы, чырвоны — чырвоншы, шчасьлівы — шчасьліўшы, чысты — чыстшы і г. д.

Прыметнікі із суфіксам **-к-, -ок-, -ек-** трацяць гэтыя суфіксы ў вышшай ступені (з выняткам вышменаваных пад в), што маюць або могуць маць вышшую ступень на **-ейшы)**, блізкі — бліжшы, вузкі — вужшы, нізкі — ніжшы, ценкі — ценшы, брыдкі — брыдшы, гладкі — гладшы, крэпкі — крэпшы, крогкі — крогшы, высокі — вышшы, глыбокі — глыбшы, далёкі — дальшы, шырокі — шыршы, кароткі — каротшы.

Няправільна вышшую ступень твораць гэт'кія прыметнікі: благі — горшы, вялікі — вялікшы й большы[1]), добры — лепшы, малы — меншы.

3. Ступень найвышшая розьніцца ад ступені вышшай прыдадзенай на пачатку слова часткай **най-**: най-вальнейшы, найглыбшы, най-вялікшы або най-большы, най-горшы, най-меншы.

Заўвага: Ступень найвышшая тым розьніцца ад хормы павялічаль-

[1]) **Большы** ўжываецца ў значаньню простым, матар'яльным, а **вялікшы** ў значаньню пераносным, моральным. Прыклады: Сын вырас большы за айца. Усяслаў Вялікі Полацкі быў **вялікшы** гэрой за Алега Северскага.

най, што гэтая абазначае найпаўнейшую меру якасьці наагул (ня можа быць нічога бельшага за **бялюсенькі**), а найвышшая ступень абазначае адно найвышшую меру з паміж раўнаваных спакмянёў (палатно белае, вапна бельшая, а сьнег найбельшы).

Заданьне 1. Укладзі проказі, у якія ўходзілі-б прыметнікі вышшай а найвышшай ступені на **-ейшы**, — тыя, што тут прыведзеныя, і што сам прыпомніш.

Заданьне 2. Укладзі проказі, у якія ўходзілі-б прыметнікі вышшай а найвышшай ступені на **-шы**, — тыя, што тут прыведзеныя, і што сам прыпомніш.

Заданьне 3. Укладзі проказі, у якія ўходзілі-б вышшая а найвышшая ступені на **-шы** ад прыметнікаў із суфіксам **-к-**, **-ок-**, **-ек-**.

§ 111. Прыналежныя прыметнікі. Прыметнікі прыналежныя абазначаюць прыналежнасьць да якога спакменя і адказуюць на пытаньне **чый? чыя? чыё?** Прыкл.: бацькаў, Васілёў, матчын, сястрын, Хвядосін, братні, сыньні, авечы, Божы, воўчы, кабылі, карові, лісі і да г. п.

Заданьне. Перапішы й падчыркні прыналежныя прыметнікі. Воўчая косьць у лес цягне. Казінае малако сытнейшае за каровяе. З кабыляга малака робяць напітак кумыс. Сабака знайшоў лісія норы. Сабачая вернасьць ведамная. Пад страхой было ластаўчына гняздо. Гусінае пер'е дарожшае за курынае. Князь Брачыслаў быў сынам Ізяслававым, а ўнукам Рагнедзіным. Божай ласкі нам патрэба. Вялікі князь Ягайла быў сынам Альгердавым. На хвоі было вароняе гняздо.

§ 112. Суфіксам **-ов-** (не пад націскам **-ав-**), **-ев-** (пад націскам **-ёв**) творацца прыналежныя прыметнікі ад спакменьнікаў мужчынскіх: дом бацькаў (**в** на канцы слова пераходзе ў **ў**), хата Анісім-ав-а, дзіцё Максім-ов-а, голас Сярге-еў, гняздо вераб'-ёв-а. Суфіксам **-ін-**, **-ын-** творацца прыналежныя прыметнікі ад спакменьнікаў жаноцкіх: кажух жонч-ын, пасага нявешч-ын-а, дзіцё сястр-ын-о, кукаваньне зязюл-ін-а і да г. п. У прыметнікаў на **-ын**, утвораных ад жаноцкіх спакменьнікаў на **-ка**, **-га**, **-ха**, перад **-ын** пераходзе заўсёды **к** у **ч**, **г** у **ж**, **х** у **ш**: матка — матчын, жонка — жончын, дабрадзейка — дабрадзейчын, зязюлька — зязюльчын, Ганулька — Ганульчын, гаспадынька — гаспадыньчын, матулька — матульчын, вучыцелка — вучыцелчын, прыяцелка — прыяцелчын, дохтарка — дохтарчын, лекарка — лекарчын, акушэрка — акушэрчын і г. д. (а ня »маткін«, »жонкін« і г. д.; Пілінога, Булыга, Брага (мянушкі жанчын) — Піліножын, Булыжын, (а не »Пілінагін« і г. д.); муха — мушын, Пілюха — (мянушка жанчыны) — Пілюшын і г. д.

§ 113. Дачынныя прыметнікі. Прыметнікі дачынныя паказуюць дачыненьне рэчы, ад якой назову ўтвораны прыметнік,

да другое. Дачынныя прыметнікі або паказуюць матар'ял, зь якога зроблена рэч (зялезны прут, дзярвяны ложак, залаты пярсьцёнак, дубовы стол, асінавы кол, бярозавыя, альховыя дровы, гліняная такаўня, каменны памост, атласовая адзежа, ліповы цьвет), або паказуюць паходжаньне спакменя; шляхоцкі род, собскі дом, чужы конь, школьны будынак, судовы ліст, кляновае лісьце, яловы сук, лазовы куст, вярбовы дубец, садовы яблык, або яны абазначаюць месца й час: хатні, вулічны, сенажатны, гародні, селавы, мескі, веснавы, ранічны, восенскі, зімовы, дзянны, месячны, годні, вечны і да г. п., або ўказуюць на прызначаньне рэчы: шавецкія курсы, дарожны ліст.

Зацемка 1. У мове крывіцкай суфікс **-ов-**, **-ев-** можа быць толькі ў прыметнікаў прыналежных а дачынных, у іншых — не.

Зацемка 2. Прыналежныя й дачынныя прыметнікі выказуюць якасьць спакменя заўсёды аднолькавую (у ступені роўнай або звычайнай), дзеля таго яны ня маюць ступеняў прыраўнаньня і ўжываюцца ў мове заўсёды ў ступені звычайнай. Таксама прыналежныя й дачынныя прыметнікі ня маюць хормы зьмяншальнай ані павялічальнай. Але хорму любасную яны ня рэдка маюць (залаценькі, дубовенькі, кляновенькі, зялезьненькі і да г. пад.).

Скланеньне прыметнікаў.

§ 114. Кажны прыметнік, апрача асобнай хормы на мужчынскі, жаноцкі й ніякі род, мае яшчэ хормы на сем склонаў адзіночнага й множнага ліку, таксама як спакменьнікі.

Гэтыя розныя хормы прыметнікаў ужываюцца залежна ад хормы спакменьніка, ля каторага дадзены прыметнік стаіць. Гэтак, прыкладам, ля снадзіўнага склону адз. л. спакменьніка прыметнік мусіць маць хорму снадзіўнага склону адз. л. (**войстрым нажом**); ля дакладнага склону мн. ліку спакменьніка дадзены да яго прыметнік мусіць быць таксама ў дакладным скл. мн. л. (**войстрых нажоў**). Значыцца, пры скланеньню прыметнік залежа ад спакменьніка, або, як кажуць: прыметнік згаджаецца із сваім спакменьнікам у родзе, ліку й склоне.

Зразы скланеньня.

	а) Адзіночны лік.	Множны лік.
Н. (што?)	стары дом	старыя дамы
Д. (чаго?)	старога дому	старых дамоў
Прз. (чаму?)	старому дому	старым дамом
Прм. (што?)	стары дом	старыя дамы
Сн. (чым?)	старым домам	старымі дамамі
М. (у чым?)	старым доме	старых дамох
Кл.	стары доме!	старыя домы!

Н. (што?)	старая хата	старыя хаты
Д. (чаго?)	старое (-ой) хаты	старых хатаў
Прз. (чаму?)	старой хаце	старым хатам
Прм. (што?)	старую хату	старыя хаты
Сн. (чым?)	старой (-ою) хатаю (-ай)	старымі хатамі
М. (у чым?)	старой хаце	старых хатах

Н., Прм. (што?)	старое акно	старыя вокны
Д. (чаго?)	старога акна	старых вокнаў
Прз. (чаму?)	старому акну	старым вокнам
Сн. (чым?)	старым акном	старымі вокнамі
М. (на чым?)	старым акне	старых вокнах

Гэтта паказана скланеньне прыметніка зь цьвярдым канчаткам і з націскам на канчатку. Аснова ў праскланяным прыметніку **стар-**, а канчаткі гэт'кія: **-ы, -ая, -ое; -ога, -ое (-ой) -ога; -ому, -ой, -ому** і г. д.: **-ыя, -ых** і г. д.

	б) Адзіночны лік.	Множны лік.
Н. (хто?)	босы дзяцюк	босыя дзяцюкі
Д. (каго?)	босага дзяцюка	босых дзяцюкоў
Прз. (чаму?)	босаму дзяцюку	босым дзяцюком
Прм. (каго?)	босага дзяцюка	босых дзяцюкоў
Сн. (кім?)	босым дзяцюком	босымі дзяцюкамі
М. (аб кім?)	босым дзяцюку	босых дзяцюкох
Кл.	босы дзецюку!	босыя дзецюкі!

Н. (хто?)	босая дзеўка	босыя дзяўкі
Д. (каго?)	босае (-ай) дзеўкі	босых дзявок
Прз. (каму?)	босай дзеўцы	босым дзяўкам
Прм. (каго?)	босую дзеўку	босыя дз[redacted] дзяўкі
Сн. (кім?)	босай(-аю) дзеўкаю	босымі дзяўкамі
М. (аб кім?)	босай дзеўцы	босых дзяўках

Н. Прм. (хто?)	босае дзіцё	босыя дзеці
Д. (каго?)	босага дзіцяці	босых дзяцей
Прз. (каму?)	босаму дзіцяці	босым дзяцём
Сн. (кім?)	босым дзіцём	босымі дз[redacted] дзецьмі
М. (аб кім?)	босым дзіцяці	босых дзяцёх

Аснова тут **бос.** Самі адзначце канчаткі.

Гэтак скланяюцца прыметнікі зь цьвярдым канчаткам і з націскам на аснове. Таксама, як **босы**, скланяецца **Божы, чалавечы, воўчы** і ўсе іншыя прыналежныя з **дж, ж, ч, ш** на канцы асновы.

в)	Адзіночны лік.			Множны лік.
Н.	Божы	Божая	Божае	Божыя
Д.	Божага	Божае(-ай)	Божага	Божых
Прз.	Божаму	Божай	Божаму	Божым
Прм.	Як Н. або Д.	Божую	Божае	Як Н. або Д.
Сн.	Божым	Божай(-аю)	Божым	Божымі
М.	Божым	Божай	Божым	Божых

Тут аснова **Бож-**

ґ) Прыметнікі зь мяккімі канчаткамі гэтак скланяюцца:

Н.	карові	каровяя	каровяе	каровія
Д.	каровяга	каровяе(-яй)	каровяга	каровіх
Прз.	каровяму	каровяй	каровяму	каровім
Прм.	Як Н. або Д.	каровюю	каровяе	Як Н. або Д.
Сн.	каровім	каровяй(-яю)	каровім	каровімі
М.	каровім	каровяй	каровім	каровіх

Гэтак скланяюцца ўсе прыметнікі зь мяккімі канчаткамі, у тым ліку й прыналежныя (**варонi, жабі, кабылі, лісі, саколі, сыньні** і да г. п.).

§ 115. Зацемкі да асобных склонаў.

Наз. скл. адз. л. Прыметнікі, стаячыя ў ніякім родзе, маюць у назоўным скл. адз. л. канчатак **-ое**, які, будучы не пад націскам, з прычыны аканьня, пераходзе ў **-ая** (у мяккіх канчатках **-яя**), але пішацца **-ае, -яе** (кажацца **босая дзіцё, косая акно, сіняя неба, кабыляя малако**, а **пішацца босае, косае, сіняе, кабыляе** і г. д.).

Дакл. скл. адз. л. Прыметнікі мужчынскага й ніякага роду маюць канчатак **-ога (старога, гаваркога)**, а не пад націскам **-ага, -яга (атласовага, сіняга)**; прыметнікі жаноцкага роду маюць канчатак **-ое** (вымаўляецца **-оя)** або **-ой**, а не пад націскам пішацца **-ае, -яе (а** вымаўляецца **-ая, -яя)** або **-ай, яй**, значыцца, кажацца **няма старое кнігі, шаўковая хусты, сіняя паперы**, а пішацца гэтак: **няма старое кнігі, шаўковае хусты, сіняе паперы.**

Прызначальны склон адз. л. ў мужчынскім а ніякім родзе мае канчатак **-ому (старому, гаманкому)** а не пад націскам **-аму, яму (шаўковаму, лісяму)**; у жан. родзе прз. скл. канчаецца на **-ой (гаваркой)**, а не пад націскам на **-ай, -яй (шаўковай, лісяй).**

Прыймальны скл. адз. л. ў мужчынскім р. мае канчатак аднолькавы з назоўным або дакладным, бо гэтак ёсьць у спакменьнікаў, у жаноцкім родзе прм. склон мае канчатак **-ую (старую)**, што, будучы не пад націскам, вымаўляецца **-аю, -яю (новаю, сіняю)**, дарма што пішацца **-ую, -юю (новую, сінюю).**

Снадзіўны склон адз. л. ў жаноцкім родзе мае канчатак **-ой (старой)**, радзей **-ою**, а не пад націскам **-ай, -яй (новай, сіняй)**, радзей **-аю, -яю.**

Мясцовы склон адз. л. ў мужчынскім а ніякім родзе мае канчатак **-ым, ім (старым, нізкім, сінім),** а ў жан. родзе **-ой (старой),** не пад націскам **-ай, -яй (кашміровай, сіняй).**

Зацемка. Прыметнікі ў ніякім родзе, як і спакменьнікі ніякага роду, назоўны й прыймальны склон адз. л. маюць аднолькавыя.

У множным л. прыметнікі ўсіх трох радоў маюць канчаткі аднолькавыя. У назоўным склоне мн. л. ё канчаткі **-ыя, -ія (новыя дамы, хаты, вокны; сінія алавікі, істужкі, вочы).** Прыймальны склон мн. л. прыметнікаў, стаячых ля спакменьнікаў неасобовых, аднолькавы з назоўным **(палюю на шэрыя зайцы, пасу аромыя валы** і да г. п.).

Клічны склон прыметнікаў заўсёды аднолькавы з назоўным.

Зацемка. Вышшая й найвышшая ступені прыметнікаў ды прыметнікі зьмяншальныя, павялічальныя й любасныя скланяюцца, як прыметнікі звычайныя, значыцца, як вышпрыведзеныя зразы.

Заданьне 1. Праскланяй прыметнікі **войстры, глыбокі, мерны, нутраны** (націск на канцы), **п'яны** (націск на канцы), **косы, прыемны, траецкі, узаемны,** дадаўшы іх да спакменьнікаў усіх трох радоў.

Заданьне 2. Таксама праскланяй із спакменьнікамі прыметнікі **вароні, кабылі, малодшы, каротшы, салодшы.**

Прыметнікі кароткія.

§ 116. Дагэтуль былі разгледжаны прыметнікі, званыя **поўнымі,** (у навуццы, іх завуць **складанымі).** Але ёсьць яшчэ хормы прыметнікаў **кароткія** (у навуццы іх завуць **іменныя).** Прыкладам, поўныя хормы будуць **слаўны, -ая, ае; поўны, -ая, -ае; смутны, -ая, -ае,** а кароткія — **славен (Славен бубён за гарамі, а ў нас дык роўны з намі), слаўна, слаўна; повен (Плывець човен вады повен), поўна, поўна** (Поўна бочачка вінца, нідзе дзірачкі няма); **смуцен, смутна** і да г. п. Поўныя хормы прыметнікаў, прыкладам, будуць **здаровы, здаровая, здаровае; жывы, жывая, жывое; жадны, галодны,** а кароткія — **здароў (Здароў будзь, Ваша!), здарова, здарова; жыў, жыва; жадзён (Кавалка хлеба жадзён), галадзён.** Поўныя хормы будуць **жывыя, здаровыя,** а кароткія — **жывы, здаровы (Ці жывы? ці здаровы?).**

Заданьне. Перапішэце й падчыркнеце кароткія прыметнікі.

На конях аседланых (сядзяць) быстры сакалы. Бывайце здаровенькі вы, малойчыкі! Ой, ня кукуй, зязюленька, рана ды не кажы, што ночанька мала. Пагнала стара баба кураняткі пасьціць. Раздумаўся дзедка і ў далоні плешча: »Калі буду жыў -здароў — ажанюся ешча!« Бедна-ж мая й яй-ха-ха! бедна-ж

мая галава. Сорам, дзеўка, сорам, красна, позна зь вечара гуляць. Дзе ўзяўся сакол вясёл ды ўдырыў галубачку.

— Ой косю, мой косю, чаму-ж ты смуцен?
Ой, чаго-ж ты смуцен, галовачку спусьціў?
Чаму-ж ты ня весел, галоўку павесіў?
Ой, ці табе тугі шаўковы папругі?
— Ой-жа мне ня тугі шаўковы папругі,
Ой-жа мне ня цяжка сядло залатое,
Ой-жа мне ня цяжка дзіцё маладое.
А толькі мне цяжкі даўгія дарогі,
Частыя карчомкі, ветлыя шынкаркі.
Ты мяне прывяжаш сыру зямлю біці.

Кароткія прыметнікі ўжываюцца рэдка, найчасьцей у песьнях, прыказях ды адно толькі ў хорме назоўнага склону ўва ўсіх трох радох абодвых лікаў, у прыймальным скл. мужчынскага роду, калі ён аднолькавы з назоўным ды ў прм. скл. жаноцкага роду.

§ 117. Прыналежныя прыметнікі на -оў, еў, -ін. Звычайна ўжываюцца з кароткай хормаю прыметнікі прыналежныя із суфіксамі **-оў, -ова, -ова** (не пад націскам **-аў, -ава, -ава**), **-еў, -ева, -ева** (пад націскам **-ёў, -ёва, -ёва**), **-ін, -іна, -іно** (не пад націскам **-іна**), **-ын, -ына, -ыно** (не пад націскам **-ына**). Прыклады: гаспадароў конь, гаспадарова карова, гаспадарова парасё; Язук Сымонаў, Наста Сымонава, рабё Сымонава, дзеці Сымонавы; сабака Сяргееў, сьвіньня Сяргеева, шчанё Сяргеева; пярэчнік Пятрусёў, асадка Пятрусёва, пяро Пятрусёва; сын Сымонішын, дачка Сымонішына, дзіцё Сымонішына. Скланюцца яны гэтак:

Адзіночны лік.

Н. (хто тут?)	Язук Сымонаў	Настуля Сымонава	рабё Сымонава
Д. (каго няма?)	Язука Сымонавага	Настулі Сымонавае (-ай)	рабяці Сымонавага
Прз. (дам каму?)	Язуку Сымонаваму	Настулі Сымонавай	рабяці Сымонаваму
Прм. (бачу каго?)	Язука Сымонавага	Настулю Сымонаву	рабё Сымонава
Сн. (зь кім?)	Язуком Сымонавым	Настуляю Сымонавай	рабём Сымонавым
М. (аб кім?)	Язуку Сымонавым	Настулі Сымонавай	рабяці Сымонавым

Н.	Міхна Іванішын	Хода Іванішына	цялё Іванішына
Д.	Міхны Іванішынага	Ходы Іванішынае (-ай)	цяляці Іванішынага
Прз.	Міхне Іванішынаму	Ходзе Іванішынай	цяляці Іванішынаму
Прм.	Міхну Іванішынага	Ходу Іванішыну	цялё Іванішына
Сн.	Міхнам Іванішыным	Ходаю Іванішынай	цялём Іванішыным
М.	Міхну Іванішыным	Ходзе Іванішынай	цяляці Іванішыным

Значыцца, таксама кароткія хормы ё толькі ў назоўным склоне абодвых лікаў ды ў склоне прыймальным, калі ён не аднолькавы з дакладным.

Зацемка. Прыметнікі, паходзячыя ад собскіх імёнаў, пішуцца зь вялікай літары.

§ 118. Прозьвішчы на -оў (аў), -еў (ёў), -ін (ын). Менаваных прозьвішчаў спачатна ў Крывічаў ня было. Але цяпер іх ёсьцека ладне. Усе яны былі накіненыя Крывічам Маскалямі. Дзеля таго што спачатна Крывічы малі адно прозьвішчы спакменьнікавыя, дык і цяперашнія прозьвішчы прыметнікавыя на **-оў, -ін** і г. д. яны разумеюць, як спакменьнікі і скланяюць іх, як спакменьнікі. Тое самое ё з такімі прозьвішчамі чужнікоў. Менаваныя прозьвішчы скланяюцца гэтак:

	Адзіночны лік.		Множны лік.	
Н.	Іваноў	Ластаўчын	Івановы	Ластаўчыны
Д.	Іванова	Ластаўчына	Івановаў	Ластаўчынаў
Прз.	Іванову	Ластаўчыну	Івановам	Ластаўчынам
Прм.	Як Д.		Як Д.	
Сн.	Івановам	Ластаўчынам	Івановамі	Ластаўчынамі
М.	Іванову	Ластаўчыну	Івановах	Ластаўчынах

Жаноцкая хорма гэтых прозьвішчаў творыцца ад тых спакменьнікаў, ад каторых паўстала мужчынская хорма прозьвішча прыметнікавага. Гэтак, прыкладам, прозьвішчы **Іваноў, Сакалоў, Ластаўчын** паўсталі ад **Іван, Сакол, Ластаўка,** дык ад гэтых спакменьнікаў прозьвішчы замужчыны або жончыныя будуць **Іваніха, Сакаліха,** Ластаўчыха, а дзяўчыніны — **Іванішка, Сакалішка, Ластаўчышка,** або — **Іванянка, Сакалянка, Ластаўчанка.** Гэтак у прозьвішчаў Крывічаў. А ў прозьвішчаў чужнікоў на **-оў, -еў, -ін** або бывае таксама, як у Крывічаў, або жаноцкія хормы гэт'кіх прозьвішчаў іхніх не скланяюцца, або скланяюцца як спакменьнікі.

Зацемка. Расійскія прозьвішчы на **-ой (Талстой, Палявой)** скланяюцца, як крывіцкія спакменьнікі на **-ой (сувой, навой).**

§ 119. Прыметнікі із значаньням спакменьнікавым.

Е такія прыметнікі, што маюць значаньне спакменьнікавае. Гэтак, прыметнікі — **стары, старая, малады, -ая, дурны, -ая, сьляпы, -ая, нявісны, -ая** — ня толькі абазначаюць якасьць спакмену **(стары брыль, старая шапка, малады дубок, маладая ёлка, дурны асёл, дурная галава, сьляпы конь, сьляпая кабыла),** але й самі значаць спакменьнікі. Прыкладам: **Прыйшоў да нас стары. Старая ўжо ня ўздолее хадзіць. Старэнькая ледзь прыцягнулася дамоў. Маладыя паехалі да вянца. У гэтым доме жывуць дурныя. Нявіснога трэба вадзіць.** Прыметнікі — **араты,**

паночны (ночны вартаўнік), **прыганяты** (наглядчык пры рабоце), **паляўнічы, гараднічы, садаўнічы** — маюць толькі значаньне спакменьнікавае, значыцца, якасьці яны не абазначаюць.

§ 120. Спакменьнікі на -істы.

Е цэлы груд спакменьнікаў на **-істы, істая:** цымбалісты, цымбалістая; арганісты; соцыялісты, соцыялістая; комуністы, комуністая; артысты, артыстая; ідэялісты, ідэялістая і шмат іншых. Гэтыя спакменьнікі маюць хорму такую, як некаторыя прыметнікі **(прысадзісты, упорысты, вяцісты, сукрысты);** дзеля таго яны й скланяюцца, як прыметнікі, гэтак:

	Адзіночны лік.		Множны лік.
Н.	цымбалісты	цымбалістая	цымбалістыя
	соцыялісты	соцыялістая	соцыялістыя
Д.	цымбалістага	цымбалістае (-ай)	цымбалістых
	соцыялістага	соцыялістае (-ай)	соцыялістых
Прз.	цымбалістаму	цымбалістай	цымбалістым
	соцыялістаму	соцыялістай	соцыялістым
Прм.	цымбалістага	цымбалістую	цымбалістых
	соцыялістага	соцыялістую	соцыялістых
Сн.	цымбалістым	цымбалістай (-аю)	цымбалістымі
	соцыялістым	соцыялістай (-аю)	соцыялістымі
М.	цымбалістым	цымбалістай	цымбалістых
	соцыялістым	соцыялістай	соцыялістых

РАЗЬДЗЕЛ XXIII.

Лічнік.

§ 121. Лічнікамі або **лічнымі йменамі** завуцца словы, што абазначаюць **колькасьць** спакмянёў або паказуюць **каторы спакмень за парадкам,** прыкладам у загадцы: **два** ляжаць, **два** стаяць, **пяты** ходзе, **шосты** водзе (дзьверы й чалавек).

Лічнікі, што абазначаюць **колькасьць,** завуцца **колькаснымі,** яны адказуюць на пытаньне **колькі?**

Лічнікі, абазначаючыя **каторы спакмень за парадкам,** завуцца **парадкавымі,** яны адказуюць на пытаньне **каторы? каторая? каторае?**

Заданьне. Перапішы й падчыркні колькасныя лічнікі простай рысаю, а парадкавыя хвалькамі.

У пары дваццаць чатыры гадзіны, у тыдні сем дзён (пораў), у месяцы чатыры тыдні, а ў годзе дванаццаць месяцаў. Пад адным брылём чатыры браты (стол). Аднаго бацькі, аднае маткі ня роўныя бываюць дзіцяткі. Адно кажа — зіма, другое — лета, а трэйцяе — а мне ўсё роўна (сані, калёсы, конь). Максім Багда-

новіч нарадзіўся ў Менску ў тысяча асьмісот дзевяцьдзясят другім годзе. У гадзіне шасьцьдзясят часінаў. Слонь можа насіць пяцьдзясят, шасьцьдзясят і нават сто пудоў цяжару. Усяслаў Вялікі Полацкі гаспадарстваваў з тысяча сорак чацьвертага да тысяча сто першага году. Вітаўт Вялікі памер у тысяча чатырыста трыццатым годзе.

§ 122. Табліца лічнікаў.

Кольkасныя:	Парадкавыя:
1. адзін, адна, адно	Першы, -ая, -ае
2. два, дзьве, два	другі, „ „
3. тры	трэйці, „ „
4. чатыры	чацьверты, „ „
5. пяць	пяты, „ „
6. шэсьць	шосты, „ „
7. сем	сёмы, „ „
8. восьмі	восьмы, „ „
9. дзевяць	дзявяты, „ „
10. дзесяць	дзясяты, „ „
11. адзінанцаць	адзінанцаты, -ая, -ае
12. двананцаць	двананцаты, „ „
13. трынанцаць	трынанцаты, „ „
14. чатырнанцаць	чатырнанцаты, „ „
15. пятнанцаць	пятнанцаты, „ „
16. шаснанцаць	шаснанцаты, „ „
17. сямнанцаць	сямнанцаты, „ „
18. асьмінанцаць	асьмінанцаты, „ „
19. дзевятнанцаць	дзевятнанцаты, „ „
20. дваццаць	дваццаты, „ „
21. дваццаць адно	дваццаць першы, „ „
30. трыццаць	трыццаты, „ „
31. трыццаць адно	трыццаць першы, „ „
40. сорак	саракавы, „ „
50. пяцьдзясят	пяцьдзясяты, „ „
60. шасьцьдзясят	шасьцьдзясяты, „ „
70. семдзясят	семдзясяты, „ „
80. асьмідзясят	асьмідзясяты, „ „
90. дзевяцьдзясят	дзевяцьдзясяты, „ „
100. сто	сотны, „ „
101. сто адно	сто першы, „ „
200. дзьвесьце	двусотны, „ „
300. трыста	трысотны, „ „
400. чатырыста	чатырасотны, „ „
500. пяцьсот	пяцьсотны, „ „
600. шэсьцьсот	шэсьцьсотны, „ „

700. **семсот**	семсотны,	,,	,,
800. **асьмісот**	асьмісотны,	,,	,,
900. **дзевяцьсот**	дзевяцьсотны,	,,	,,
1000. **тысяча**	тысячны,	,,	,,
1001. **тысяча адно**	тысяча першы,	,,	,,
2000. **дзьве тысячы**	двутысячны,	,,	,,
1.000.000. **мілён**	мілённы,	,,	,,

Зацемка. Калі пры лічэньню не падаюць спакменю, дык лік 1 ставіцца ў ніякім родзе (**адно, дваццаць адно, трыццаць адно** і г. д.).

Перапішы табліцу лічнікаў.

§ **123. Націск** у парадкавых лічніках — **шосты, сёмы, восьмы** — на **-о-, -ё-**. У колькасных лічніках — **адзінанцаць, чатырнанцаць** — і парадкавых — **адзінанцаты**, чатырнанцаты — націск на **-на-**. У колькасных лічнікаў — **пяцьдзясят, шасьцьдзясят, семдзясят**, асьмідзясят, дзевяцьдзясят — і парадкавых — **пяцьдзясяты, шасьцьдзясяты, семдзясяты, асьмідзясяты, дзевяцьдзясяты** націск на **-ся-**.

Зацемка. Зьвярнеце ўвагу на хорму гэт'кіх лічнікаў: **восьмі, асьмінанцаць, асьмідзясят, асьмісот, асьмінанцаты, асьмідзясяты, асьмісотны, трэйці.**

§ **124. Лічнікі зборныя й драбовыя.**

Гэт'кія лічнікі, як: **абодва, абедзьве, абое, двое, трое, колькананцаць, колькадзясят, чацьвёра, пяцёра, шасьцёра, сямёра, асьмёра, дзевяцёра, дзесяцёра, удваіх, утраіх** і да г. п. завуцца **зборнымі.** Прыклады: прывяла авечка двое ягнят, у сьвіньні пяцёра парасят, у хаце трое дзьвярэй, іх чацьвёра ў радзіме.

Гэт'кія лічнікі, як: паўтара, паўтары, паўтраця, паўтраці, паўчацьвярта, паўчацьвярты, дзьве трэйціх, чатыры пятых, восьмі дзясятых і да г. п. — завуцца **драбовыя.**

Лічнікі зборныя й драбовыя належаць да лічнікаў колькасных.

§ **125. Лічнікі агульныя й колькаразовыя.**

Гэт'кія лічнікі, як **адзін, тры, пяць, дзесяць...** абазначаюць дакладны лік спакмянёў; але ё й такія лічнікі, што азначаюць лік толькі агульна або блізка чаго, прыкладам: **шмат, досыць, даволі, мала, крыху, троха, пара, колькі, толькі, гэтулькі, гэнулькі.** Гэт'кія лічнікі завуць **агульнымі** або **неазначанымі.**

Гэткія лічнікі, як: **дваякі**, -ая, -ае; **траякі**, -ая, -ае; **падвойны, патройны, удвая, утрая** (балей, меней, гарэй, ляпей) — завуцца **колькаразовымі.**

Зьмяняньне лічнікаў.

§ **126.** Усе лічнікі зьмяняюцца подле склонаў. Гэт'кія лічнікі колькасныя зьмяняюцца подле лікаў: **адзін — адны, дзеся-**

ток — дзесяткі, сотня — сотні, тысяча — тысячы, мілён — мілёны. Два лічнікі колькасныя маюць розныя хормы для трох радоў: **адзін Бог, адна бацькаўшчына, адно жыцьцё; два сыны, дзьве сястрэ** (або сястры), **два акне** (або **акны)**; яны згаджаюцца ў родзе із спакменьнікам, ля каторага стаяць.

Усе парадкавыя лічнікі скланяюцца, як прыметнікі, яны зьмяняюцца подле лікаў, радоў і склонаў ды таксама, як прыметнікі, згаджаюцца із спакменьнікам у родзе, ліку й склоне, прыкл.: першы дзень, першая гадзіна, паршае пытаньне; трэйці тыдзень, трэйцяя кляса; у пятай гасподзе, у тысяча дзевяцьсот асьмінанцатым годзе, за двананцацьма замкамі і г. д. У лічнікаў парадкавых ад **дваццаць першы — дваццаць дзяваты, трыццаць першы — трыццаць дзяваты** і г. д., **сто першы — сто дзяваты** і г. д. пры скланеньню зьмяняюцца толькі адзінкі, прыкладам: няма сто асьмідзясят восьмага чалавека.

Першы мае найвышшую ступень — **найпершы.**

§ 127. Адзін, адна, адно.

	Адзіночны лік.			Множны лік.
Н.	адзін	адна	адно	адны
Д.	аднаго	аднае	аднаго	адных
Прз.	аднаму	аднэй	аднаму	адным
Прм.	Як Н. або Д.	адну	адно	Як Н. або Д.
Сн.	адным	аднэй	адным	аднымі
М.	адным	аднэй	адным	адных

Дакладны склон адз. л. для мужчынскага й ніякага роду мае яшчэ хорму **аднага.**

Заміж **адна, адно, адну, адны**, бывае, скажуць **адная, адное, адную, адныя**; бывае гэта тады, калі побач ужываецца лічнік **другая, другое, другія.** Прыкладам: Адная прыйшла, а другая засталася. Адную абачыў, а другое ня згледзіў. Адныя тут, а другія там.

Лічнік **адзіны, -ая, -ае** скланяецца зусім так, як прыметнікі.

§ 128. Два (мужч. й ніякі р.), **дзьве** (жан. р.).

Н.	два	дзьве
Д.	двух	дзьвюх
Прз.	двум	дзьвюм
Прм.	Як назоўны	або дакл.
Сн.	двума	дзьвюма
М.	двух	дзьвюх

§ 129. Абодва (мужч. й ніякі род), абедзьве (жан. р.).

Н.	абодва	абедзьве
Д.	абодвых	абедзьвіх
Прз.	абодвым	абедзьвім
Прм.	Як назоўны	або дакл.
Сн.	абодвымі	абедзьвімі
М.	абодвых	абедзьвіх

Значыцца, скланяюцца як прыметнікі.

§ 130. Абое, двое, трое.

Н.	абое	двое	трое
Д.	абаіх	дваіх	траіх
Прз.	абаім	дваім	траім
Прм.	Як назоўны	або дакл.	
Сн.	абаіма	дваіма	траіма
М.	абаіх	дваіх	траіх

Абодва ўжываецца, калі два спакмяні толькі мужчынскага або толькі ніякага роду (**абодва сталы, абодва акны**); **абедзьве** — калі два спакмяні жаноцкага роду (**абедзьве дачкі**); **абое** — калі рады памяшаныя, знач., мужчынскі й ніякі, мужчынскі й жаноцкі, жаноцкі й ніякі (абое-рабое; кабыла лысая, жарабё рабое, ізьеў воўк абое).

Перапісаць усе дагэтулешнія зразы скланеньня лічнікаў.

§ 131. Тры, чатыры.

Н.	тры	чатыры
Д.	трох	чатырох
Прз.	тром	чатыром
Прм.	Як назоўны	або дакл.
Сн.	трыма	чатырма
М.	трох	чатырох

§ 132. Пачынаючы ад **пяцёх** і да трыццацёх, лічнікі скланяюцца гэтак:

Н.	пяць	сем	восьмі
Д.	пяцёх	сямёх	асьмёх
Прз.	пяцём	сямём	асьмём
Прм.	Як назоўны	або дакл.	
Сн.	пяцьма	сяма	асьма
М.	пяцёх	сямёх	асьмёх

Н.	дзесяць	двананцаць	трыццаць
Д.	дзесяцёх	двананцацёх	трыццацёх
Прз.	дзесяцём	двананцацём	трыццацём

Прм.	Як назоўны	або дакл.	
Сн .	дзесяцьма	двананцацьма	трыццацьма
М.	дзесяцёх	двананцацёх	трыццацёх

Пачынаючы ад **пяцьдзясят** да **дзевяцьдзясят** лічнікі з роўнымі дзесяткамі звычайна зусім не зьмяняюцца (з усімі шасцьдзясят работнікамі, усім дзевяцьдзясят вучаньнікам, з усіх асьмідзясят снапоў і г. д.), а рэдчас скланяюцца, як **пяць**.

У колькасных лічніках, што складаюцца зь дзесяткоў і адзінак, скланяюцца толькі адзінкі, прыкл.: ад асьмідзясят чатырох год, без дзевяцьдзясят пяцёх снапоў, з трыццаць сяма дзяцьмі і г. д.

Заціемка. Адказуючы на пытаньне **колькі?** датыкаючае асобаў, лічнік ставяць у дакладным склоне. Прыкл.: — Колькі вучаньнікаў? — Двух, трох, пяцёх, сямёх, шаснанцацёх, дваццацёх і да г. п. (але — адзін вучаньнік).

§ 133. Сорак, сто.

Н.	сорак	сто
Д.	сараку	сту
Прз.	сараку	сту
Прм.	Як назоўны	
Сн.	саракма	стома
М.	сараку	сту

Лічнікі 200, 300, 400, 500 і г. д. зусім не зьмяняюцца. Калі ў колькасных лічніках ёсьць сотні з адзінкамі або сотні зь дзесяткамі й адзінкамі, дык зьмяняюцца толькі адзінкі, прыкл.: аддаў доўг без чатырыста дзевяцьдзясят двух чырванцоў.

Заданьне. Перапішы дагэтуль надрукаваныя зразы лічнікаў, пачынаючы з § 131.

§ **134.** Лічнік **тысяча** ў вадзіночным ліку зусім не зьмяняецца, калі пры ім няма лічніка **адна.** Прыклады: Тысяча чалавекаў прыйшло. Валей мець аднаго прыяцеля, як тысяча непрыяцеляў. Мілён большы за тысяча. Аддаў доўг бяз тысяча залатнікоў. Даў па тысяча рублёў. А калі ля **тысяча** стаіць лічнік **адна**, дык **тысяча** скланяецца, як **мяжа.**

У множным ліку **тысяча** скланяецца гэтак:

Н.	тысячы
Д.	тысячаў
Прз.	тысячам
Прм.	Як назоўны
Сн.	тысячмі або тысячамі
М.	на тысячах

Драбовыя лічнікі складзеныя з **паў-**, прыкладам: паўтара рубля, паўтара рэшата бобу, паўтары ігрушы, паўтраця, паўтраці, паўпята, паўпяты і г. д. — не зьмяняюцца.

Заданьне. Прасклаияй: тры яблыкі, чатыры ігрушы, шэсьць куранят, дваццаць дзевяць птушанят, тысяча чырванцоў.

РАЗЬДЗЕЛ XXIV.

Займёны.

§ 135. Займёны гэта словы, ужываныя заміж назову асобы або рэчы, наагул заміж назову спакменю, заміж назову прыметы альбо якасьці, або заміж назову ліку. Значыцца, займёны заступаюць у мове спакменьнікі, прыметнікі й лічнікі, ці -накш**імя** спакменнае, прыметнае й лічнае; дзеля таго яны й завуцца **за-ймёны.**

Вось, пркл., заміж паўтараць слова: пярэчнік ляжыць у прыстолку, падай мне **пярэчнік,** можна ўжыць іншага слова: пярэчнік ляжыць у прыстолку, падай мне **яго;** дыкжэ слова **яго,** ужытае заміж спакменьніка **пярэчнік** — ё займя.

Іншыя прыклады: я сустрэў Алехну і гаманіў з Алехнам — я сустрэў Алехну і гаманіў зь **ім;** я ўзяў крэйду, **крэйдаю** я пачаў пісаць — я ўзяў крэйду, **каторай** пачаў пісаць; Івась рашчыніў кніжку **Івасёву** — Івась рашчыніў **сваю** кніжку.

У прыведзеных прыкладах маем гэт'кія займёны: **зь ім, каторай, сваю.**

Разьдзел займёнаў.

§ 136. Падзеля значаньня займёны бываюць:

1. **Асобавыя;** выказуюць яны асобу, што гавора: **я,** а ў ліку множным **мы;** асобу, да каторай кажацца: **ты,** у мн. ліку **вы;** асобу, аб каторай кажацца: **ён, яна яно,** у мн. л. **яны.**

Дык, значыцца, займя: **я** абазначае асобу гамонячую або **першую асобу; мы** абазначае дзьве або балей асобаў, калі сярод іх ёсьць асоба першая (гамонячая); займя: **ты, вы** абазначае асобу або асобы, да каторых кажацца, або **другую асобу;** займя: **ён, яна, яно, яны** абазначае асобу або асобы, аб каторых кажацца, або **трэйцюю асобу.**

Зацемка. Пры ветлых зьвярненьнях, дзеля выказаньня пашаны, заміж **ты,** кажацца **Ваша** (да мужчыны й жанчыны) або **Вашаць** (да мужчыны), **Вашэця** (да жанчыны), а пры меншай пашане — **самі, сам, сама. Вы** заміж **ты** ня кажацца.

2. **Асобава-зваротнае: сябе, ся, сабе, сабою;** выказуе яно асобу або рэч, на якую зьвернена собская дзейнасьць ейная, прыкладам: я бяру гэта **сабе,** я апранаю**ся,** я мыю**ся;** ты мыеш**ся;**

Ігналь працуе над **сабою;** дзяцюкі зрабілі **сабе** ірты і г. д., заміж паўтараць тое самое слова: я бяру гэта **мне,** я апранаю мяне, мыю **мяне; ты мыеш цябе;** Ігналь працуе над **Ігналём;** дзяцюкі зрабілі **дзяцюком** ірты і г. д.

Гэтае займя ўжываецца для ўсіх трох асобаў, бяз розьніцы радоў а лікаў.

3. **Прыналежныя:** мой, твой, свой; ягоны, ейны, іхны; нашы або наш, вашы або ваш; наські, Вашэцёў, Вашэцін. Прыналежныя займёны паказуюць чыя рэч, да каго яна належа, пркл.: **мой** нож, **твая** папера, **мае** браты, **твае** пёры, **наш** вучыцель, **вашая** вучыцелка, **нашыя** політы, **вашыя** алавікі, **ягоны** тата, **ягоная** маці, **ейны** пояс, **іхныя** бацькі, **наськія** людзі, дачка **Вашэцева,** сын **Вашэцін.**

Для 1. асобы адз. л. ўжываюць займені: **мой, мая, маё** (або **мае);** для 2. ас. адз. л.: **твой, твая, тваё** (або **твае);** для 2. ас. мужчынскай адз. л. пры ветлым зьвярненьню: **Вашэцеў, Вашэцева, Вашэцева;** для 2. ас. жаноцкай адз. л. пры ветлым зьвярненьню: **Вашэцін, Вашэціна, Вашэціна;** для 3. ас. мужчынскай адз. л.: **ягоны, ягоная, ягонае;** для 3. ас. жаноцкай адз. л.: **ейны, ейная, ейнае;** для 1. ас. мн. л.: **нашы** (або **наш), нашая (наша), нашае (наша); наські, наськая, наськае;** для 2. ас. мн. л.: **вашы (ваш), вашая (ваша), вашае (ваша);** для 3. ас. мн. л.: **іхны, іхная, іхнае.**

Апрача менаванага значаньня, займя **нашы** абазначае засталую часьць свае радзімы, а **вашы** — засталую часьць чужое радзімы, пркл.: нашы едуць, вашы йдуць, нашы вашых падвязуць.

4. **Паказальныя:** тый (або той), тая тое; гэты, гэтая, гэтае; гэны, гэная, гэнае; такі, гэт'кі, гэн'кі, таковы. Пры помачы займёнаў паказальных паказуем спакмяні балей або меней далёкія ад нас ды спакмяні, аб якіх была гаворка ўперад. Прыкладам: Ой, у полю, полю бяроза стаяла; ой, на **тэй** бярозе зязюля кукавала.

Займёны — **гэты, -ая, ае, гэт'кі, -ая, -ае** — ужываюцца ў дачыненьню да таго, што блізка, а **гэны, -ая, -ае, гэнкі, -ая, -ае** — у дачыненьню да таго, што далёка або, прынамся, далей супроць першых; **тый, тая, тое, такі, -ая, -ое, таковы, -ая, -ае** ўжываюцца, калі выразьліва не паказуецца, але кажацца агульна. Прыклады: мы сядзім ля гэтага стала, а яны ля гэнага; хто мяняе, у таго хамут гуляе; гэт'кія нашы дзеці; за гэнкі дом із гніль ля дзер ты грош апошні; які цялеш, такі клін, які бацька, такі сын; хто пад'еў ракоў — такоў, хто ня еў ракоў — такоў.

5. **Пытальныя:** хто? што?, каторы? -ая? -ае? які? -ая? -ое? чый? чыя? чыё? (або чые?) яковы? -ая? -ае? колькі?

Пры помачы займёнаў пытальных пытаемся пра спакмяні

а іхнія якасьці, пркл.; хто тут? што гэта? каторы сёлета год? колькі гадзінаў? чыя шапка?

6. **Дачынныя,** сваёй хормаю яны ня розьняцца ад пытальных, аднак з помачай іх мы ня выказуем пытаньня, але ўжываем іх заміж слова кага-дзе (толькі што) сказанага ў папярэдняй проказі. Дзеля таго пры іх ужываньню трэба ўважаць на род а лік слова, ужытага ў папярэдняй проказі, пркл.: гасподнік, **што** ў нас жыў, выехаў; колас, **што** зярнят ня мае, дагары лоб задзірае; **што** каму на ўме, тый тое даўбе; **што** душа мае, тым і прыймае; **якая** птушка, такія і песьні; **колькі** прасілі, толькі заплаціў; **чые** грошы, таго й тавар.

7. **Неазначаныя;** ужываем іх тады, калі не дакладна, але толькі агульна абазначаем спакмень, якасьць, колькасьць. Яны гэт'кія: хтось, штось, якісь чыйсь; хто-колечы, што-колечы, які-колечы, чый-колечы; хто-небудзь, што-небудзь; нехта, нешта, неякі (нейкі), некаторы, нечый; абыхто, абышто, абыякі; колькі.

З пасярод неазначаных займёнаў вылучаюць дзьве апрычоныя групы — **неазначана -адмоўную:** ніхто, нішто, нічый, ніякі, ніводзін (ніводны), нікагусенькі, нічагусенькі, а **неазначана - цьвердзячую:** увесь, усякі, усялякі, кажны, шмат хто, шмат што, мала хто, мала што, шмат якія. **Мала хто, мала што** маюць значаньне працілежнае да **шмат хто, шмат што;** усі чатыры гэтыя займёны заступаюць спакменьнікі, а прыметнікі заступае займя **шмат якія,** прыкладам: шмат хто ў іх быў (шмат што ў іх было); гаманілі пра шмат каго (пра шмат што); далі шмат каму; прыйшлі із шмат кім (із шмат чым) і г. д.; мала хто ў іх быў (мала што ў іх было); мала каго (мала чаго) ў іх ня было; мала зь кім (з чым) прыйшлі і г. д.; на выстаўцы былі шмат якія абразы; кніжка была із шмат якімі абразкамі; не ставала шмат якіх маляроў. Як бачым, займя **шмат якія** ўжываецца пры спакменьніку, заступаючы якасьць спакменю, або, накш кажучы, заступае прыметнік.

Перапішы, падчыркні кажнае займя і абазнач уверсе якое яно.

Тая зязюля, але ня так кукуе. Прылажэце руку да левага боку вашае грудзіны і вы пачуеце, як б'ецца вашае сэрца: гэта сэрца разганяе кроў па ўсім нашым целе. І я Ваша, і ты Ваша, хто-ж нам хлеба напаша? Сядайце, Вашаць. Як-жа ў Вашэцi ўнукі гадуюцца? Ішоў тота каля плота, пытаецца ў Засі, ці дома вашы? Панясу нашым вады на поле. Гэта наські чалавек. Якая плата, такая й работа. Чужая болька нікому не баліць. Ня ўвесь сьвет, што ў ваконцы. Ня пытай ні ў кога, дзе к шчасьцю дарога. На што нам тыя пісталеты, калі мы страляць ня ўмеем? З добрых думак, што мы кінем на сваім дзірване, будзе ўнукам нашым жніво — доля - панаваньне.

Зьмяняньне займёнаў.

Займёны зьмяняюцца подле склонаў, а з малымі выняткамі і подле лікаў; бальшыня займёнаў мае апрычоную хорму на кажны з трох радоў.

Зразы скланеньня займёнаў.

§ 137. Займёны 1. й 2. асобы і асобава-зваротнае.

Адзіночны лік.

Н.	я	ты	—
Д.	мяне	цябе	сябе
Прз.	мне	табе	сабе
Прм.	мяне	цябе	сябе
Сн.	мною(-й)	табою (-й)	сабою (-й)
М.	мне	на табе	на сабе

Множны лік.

Н.	мы	вы	
Д.	нас	вас	
Прз.	нам	вам	Як у вадз. л.
Прм.	нас	вас	
Сн.	намі	вамі	
М.	на нас	на вас	

У прызначальным склоне адз. л. ад займені другое асобы рэдчас ужываецца скарочаная хорма **тэ,** пркл.: **я тэ пакажу! я тэ дам! я тэ не дарую!** У прыймальным склоне адз. л. займені першае асобы рэдчас ужываецца хорма **мя,** пркл.: Ой, у садзе вішня, чаму-ж не чарэшня? Любіліся, кахаліся, чаму-ж не бярэш мя?

Зваротнае **ся** ўжываецца толькі ў злучэньню зь дзеясловамі (**мыюся, хвалішся** і да г. п.).

§ 138. Займя трэйцяе асобы.

	Адзіночны лік.			Множны лік.
Н.	ён	яна	яно	яны
Д.	яго	яе	яго	іх
Прз.	яму	ёй	яму	ім
Прм.	яго	яе	яго	іх
Сн.	ім	ёю (ёй)	ім	імі
М.	у ім	у ёй	у ім	у іх

У дакл. а прыйм. скл. адз. л. побач із **яго** ўжываецца яшчэ хорма **яга.** На пачатку гэтага займені ніколі ня бывае сугуку н (**у яго, у яе, у іх, зь ім, зь ёю, зь імі, пры ім, пры ёй, ля яго, ля іх, на ім, на** іх і г. д.).

§ 139. Мой, твой, свой, чый.

	Адзіночны лік.			Множны лік.
Н.	мой	мая	маё (мае)	мае
Д.	майго	мае	майго	маіх
Прз.	майму	маёй	майму	маім
Прм.	Як наз. або д.	маю	маё (мае)	Як наз. або д.
Сн.	маім	маёю (-ёй)	маім	маймі
М.	у маім	у маёй	маім	маіх
Н.	чый	чыя	чыё (чые)	чые
Д.	чыйго	чые	чыйго	чыіх
Прз.	чыйму	чыёй	чыйму	чыім
Прм.	Як наз. або д.	чыю	чыё (чые)	Як наз. або д.
Сн.	чым	чыёю (-ёй)	чыім	чыймі
М.	у чыім	у чыёй	у чыім	у чыіх

Як **мой,** таксама скланяюцца **твой, свой.** У ніякім родзе адз. л. побач із **маё, тваё, сваё, чыё** ўжываецца яшчэ хорма зь **-е** на канцы **(мае, твае, свае, чые).**

У дакл. склоне адз. л. побач із хормаю **майго, твайго, свайго, чыйго** ўжываецца хорма **майга, твайга, свайга, чыйга.**

У множным л. ўсі рады маюць аднолькавыя хормы.

Як **чый, чыя, чые,** таксама скланяецца **нічый, нічыя, нічые; чыйсь, чыясь, чыесь,** адно што ў першым дадаецца **ні** на пачатку **(нічыйго, нічые, нічыйму** і г. д.), а ў другім **-сь** на канцы **(чыйгось, чыесь, чыймусь, з чыімсь** і г. д.).

§ 140. Тый, тая, тое; сам, сама, само; увесь, уся, усе.

	Адзіночны лік.			Множны лік.
Н.	тый (той)	тая	тое	тыя
Д.	таго	тае	таго	тых
Прз.	таму	тэй	таму	тым
Прм.	Як наз. або д.	тую	тое	Як наз. або д.
Сн.	тым	тэю (тэй)	тым	тымі
М.	у тым	у тэй	у тым	у тых
Н.	сам	сама	само	самы
Д.	самога	самое	самога	самых
Прз.	самому	самой	самому	самым
Прм.	самога	самую	само	самых
Сн.	самым	самою (-ой)	самым	самымі
М.	самым	самой	самым	самых

Н.	увесь	уся	усё (усе)	усі (усе)
Д.	усяго	усяе	усяго	усіх
Прз.	усяму	усёй	усяму	усім
Прм.	Як Н. або Д.	усю	усё (усе)	Як Н. або Д.
Сн.	усім	усёю (усёй)	усім	усімі
М.	усім	усёй	усім	усіх

У ніякім родзе адз. л. побач із хормаю **усё** ёсьць **усе.**

Ад **увесь** у наз. склоне мн. л. ёсьць **усі,** але можа ўжывацца і **ўсе.**

У дакладным скл. адз. л. побач **таго, сяго, усяго** ўжываецца й **тага, сяга, усяга.**

§ 141. Хто, што, ніхто, нішто.

Н.	хто	што	ніхто	нішто
Д.	каго	чаго	нікога	нічога
Прз.	каму	чаму	нікому	нічому
Прм.	каго	што	нікога	нішто
Сн.	кім	чым	нікім	нічым
М.	у кім	чым	нікім	нічым

Зьвярнеце ўвагу, што ў скланеньню паміж **хто, што,** з аднага боку, а **ніхто, нішто,** з другога, у дакл. а прызн. склонах ё розьніца ў націску.

Як **хто, што,** таксама скланяюцца **хтось, штось,** адно, што ў іх дадаецца на канцы **-сь (кагось, чагось, камусь, чамусь з кімсь, з чымсь** і г. д.).

У **шмат хто, шмат што, мала хто, мала што,** скланяецца адно хто, што (**шмат каго, шмат чаго, шмат каму, шмат чаму, із шмат кім, із шмат чым; мала каму, мала зь кім, мала з чым** і г.д.).

§ 142. Ваша, Вашаць, Вашэця паходзяць ад »Ваша міласьць«, зьяўляюцца спакменьнікамі, але дзеля таго што ўжываюцца заміж займені **ты** (пры ветлых зьвярненьнях), дык разглядаем іх тутка.

	Адзіночны лік. Муж. род:	Адзіночны лік. жан. род:	Множны лік. абодва рады:
Н.	Ваша, Вашаць	Ваша, Вашэця	Вашэці
Д.	Вашэці	Вашэці	Вашэцяў
Прз.	Вашэці	Вашэці	Вашэцям
Прм.	Вашэцю	Вашэцю	Вашэцяў
Сн.	Вашэцям	Вашэцяю(-яй)	Вашэцьмі
М.	Вашэцю	Вашэці	Вашэцях

Вашэцеў, -ева, -ева; Вашэцін, -іна, -іна, ужываныя пры вет-

лых зьвярненьнях, заміж **твой, твая,** зьяўляюцца прыналежнымі прыметнікамі і скланяюцца як таковыя.

§ 143. Зацемкі да скланеньня засталых займёнаў.

Займя **сёй** скланяецца, як **тый,** але ў сучаснай мове яно ўжываецца адно ў пары з **тый** або **той,** даючы разам адценьне неазначанасьці, пркл.: **сёй-той гавора, сёе-тое возьмем із сабою** і пад.

Таксама займя **сякі** ўжываецца адно ў пары з **такі,** даючы разам адценьне неазначанасьці, пркл.: **возьмем сякія-такія рэчы; маю сякую-такую адзежу.**

Займёны — ягоны, ягоная, ягонае; ейны, ейная, ейнае; іхны, іхная, іхнае; нашы, нашая, нашае; вашы, вашая, вашае; наські, наськая, наськае; гэты, гэтая, гэтае; гэны, гэная, гэнае; гэт'кі, гэт'кая, гэт'кае; гэн'кі, гэн'кая, гэн'кае; сякі, такі, таковы, яковы; усялякі, кажны, ніякі — скланяюцца, як прыметнікі; ува ўсіх іх дакладны скл. адз. л. ў жаноцкім родзе канчаецца на **-ае (няма ягонае, ейнае, нашае, вашае, гэтае** і г. д. **кнігі** і пад.).

Побач із поўнымі хормамі — **нашы, нашая, нашае, нашую, нашыя; вашы, вашая, вашае, вашую, вашыя; гэтая, гэтае, гэтую;** гэная, гэнае, гэную — ужываюцца й хормы скарочаныя — наш, наша, наша, нашу, нашы; ваш, ваша, ваша, вашу, вашы; гэта, гэту; гэна, гэну.

Якісь скланяецца, як **які,** адно з даданьням **-сь** на канцы **(якогась, якоесь, якомусь, якойсь, якімсь** і г. д.).

У шмат якія скланяецца адно **якія** (у множным ліку) — **шмат якіх, шмат якім, шмат якімі** і г. д.

РАЗЬДЗЕЛ XXV.

Будоўля словаў.

§ 144. Аснова й канчатак. Возьмем якія-колечы словы, прыкладам **араты, сук,** і пачнём іх зьмяняць: араты, аратага, аратаму, з аратым, аратыя, аратых і г. д., сук, сука, суку, суком, на суку, сукі, сукоў, суком, сукамі, на сукох. Бачым, што ў кажным слове пры скланеньню ці наагул зьмяняньню адна часьць застаецца нязьменнай, а другая часьць мяняецца: **арат-ы, арат-ага, арат-аму, з арат-ым** і г. д., **сук-а, сук-у, сук-ом** і г. д. Зьменная часьць слова стаіць на канцы і завецца **канчаткам.** Адлучыўшы канчатак, адзержым **аснову.** У прыведзеных словах асновамі будуць **арат-** а **сук-.**

Зьмены ў васнове слова. Звычайна аснова слова не мяняецца, але рэдчас (часамі) бываюць у ёй невялічкія зьмены.

У тым самым складзе пад націскам ёсьць **о, е,** а не пад націскам **а (я),** прыкл.: **стол, столу, сталу, сталом; сьцяна, сьцены.**

Д, т, калі апынуцца перад **е, і,** пераходзяць у **дз, ц (сад — у садзе, мята — на мяце).**

Пры скланеньню **к, г, х,** апынуўшыся перад **е,** пераходзяць у **ц, з, с (дачк-а, наг-а, сах-а — дачц-э, наз-е, сас-е).**

Бывае, што самагук у васнове выпадае **(палец, купец, садок — палца, купца, садка), е** пераходзе ў **о (несь-ці — нёс)** а інш.

§ 145. Карэнь слова.

дуб	сад	веда
дуб-ок	сад-ок	вед-аць
дуб-іна	сад-овы	вед-аньне
дуб-нік	сад-овіна	да-вед-ка
дуб-овы	сад-аўнічы	вед-амны
дуб-рова	па сад	вед-амка

У кажным стаўпцу словы **свае** ці, накш, блізкія значаньням. Ад чаго паходзе іхняя свайня? Якая часьць супольная ў кажным стаўпцу словаў? Ад гэных супольных часьцяў і паходзе іхняя свйня і іхняе галоўнае значаньне. Ці можна супольную часьць яшчэ падзяліць, каб часьці штось значылі? Такая непадзельная й супольная ў сваіх словах часьць завецца **каранём.** Ад караня творацца блізкія або свае міжсобку словы.

Зьмены ў караню. У гуках караня могуць быць некаторыя зьмены, прыкладам, ненацісьненыя **о, е** пераходзяць у **а (я)** (ног-і — наг-а), **г** рэдчас пераходзе ў **ж** (наг-а — **нож-ка), к** — у **ч (рук-а — руч-ка), х** — у **ш (сах-а — сош-ка), д** — у **дз** і **дж (хад-а — хадз-іць — хадж-у)** а інш. Ад гэтых зьменаў адзін карэнь дзеліцца на колькі **сваіх** або **побачных** (стаячых побач) каранёў, прыкл.: рук-а, руч-ка, руч-нік; наг-а, ног-і, нож-ны, наж-ніцы; бр-аць, бяр-у, зь-бір-аць, з-бор. Тут свае карані рук-, руч-; другія свае карані **наг-, ног-, нож-;** трэйція — **бр-, бяр-, бір-, бор.**

Перапісуючы адлучы рыскаю карані, словы із сваймі (побачнымі) каранямі напішы асобнымі стаўпцамі.

Воўк, ваўчыца, ваўкаўня; чэсьць, частаваць, пачостка; хада, хадзіць, пахадня, ходацца, заход, усход, даходны; воз, перавоз, перавозьнік, везьці, вазок, вазіць, завоз; гаспадар, гаспадарка, гаспадарыня, гаспадарства, гаспадыня, гаспода, господнік; золата, залатнік, залатоўка; дам, даваць, прыдатак, задатак, падачкі; каса, касіць, касьба, касьбіт, перакос, пракос; арба, араць, аромы, араты, аральля, аральбіт; слаць, сланец, стол, столь, настольнік, сталіца.

Рэдчас карэнь бывае асобным словам, прыкл.: **вол, кол, стол, столь, бор, лес, дом.** Часта слова складаецца з караня й канчатку, прыкл.: **стол-у, стол-і, вал-а, дом-у.**

§ 146. Афіксы. У перапісаных словах адлучы часьць, што стаіць паміж каранём і канчаткам. Гэт'кая часьць слова завецца **суфікс** або **наростак.** Наростак у слове можа быць адзін або колькі **(гаспад-ар-к-а).** Наросткамі ад каранёў твораціца словы.

У прыведзеных у гэтым разьдзеле словах адлучы часьць, стаячую перад каранём. Гэткая часьць слова завецца **прэфіксам** або **прыросткам.** Прэфіксамі таксама твораціца новыя словы, прыкл.: **воз, пера-воз, за-воз; сад, пры-сада, па-сад; піс-аць, за-пісаць** і да г. п. Слова можа мець колькі прэфіксаў **(па-ня-дзе-лак.** Суфіксы й прэфіксы завуцца адным словам **афіксы.**

Такім парадкам слова можа складацца з аднаго караня **(стол),** з караня й канчатку **(стол-у),** з караня й суфіксу **(стол-ік),** з караня, суфіксу й канчатку **(стол-ік-а),** з прыростку й караня **(ус-ход),** з прыростку, караня й канчатку **(ус-ход-у, пры-сад-а),** з прыростку, караня й наростку **(пры-стол-ак, на-столь-нік),** з прыростку, караня, наростку й канчатку **(пры-стол-к-у).**

§ 147. Перанос слова. Цяпер, калі мы пазнаёміліся з будоўляю слова, можам паглыбіць сваё веданьне пра перанос слова з аднаго радка ў другі. Да сказанага на бач. 8 у § 6. трэба дадаць наступное:

Прыростак пры пераносе слова ня можна дзяліць, а трэба яго ўвесь пакінуць у старым радку, прыкладам, трэба пера-несьці **пера-воз,** а не **пе-равоз.** Калі ў слова ё два прыросткі, дык адзін можа быць пакінены ў старым радку, а другі перане-сены ў новы радок, прыкладам, **панядзелак** можна перанесьці гэт'кімі чатырма спосабамі: **па-ня-дзе-лак.**

Калі паміж самагукаў ёсьць адзін сугук, дык блізу заўсёды яго пераносяць у новы радок **(ма-ці, дзя-жа).** Вынятак бывае адно тады, калі сугук паміж самагукамі належа да прыростку, тады ён мусіць быць пакінены ў старым радку, пркл. **роз-ум** (бо **роз-** прыростак, **а-ум** карэнь). Цяжэй бывае тады, калі паміж самагукаў ё два ці балей сугукі, або паўсамагук із сугукам ці сугукамі, тады трэба глядзець, каб пры пераносе не разрываць складовых часьцяў слова, значыцца, каб не разрываць гукаў караня і каб не разрываць гукаў наростку. Прыкладам, гэтак трэба перанесьці: дач-ка, кась-ба, сяў-ба, кол-ца, яй-цо, воль-ны, поў-ны, пер-шы, ма-лод-шы, цяж-шы, вуз-кі, мор-скі, чэ-скі, мно-ства, кру-цел-ства, ка-вал-ства а інш. Стаячых за каранём **-ск-а-ств** ніколі ня дзеляць, бо гэта наросткі.

§ 148. Значаньне суфіксаў.

Афіксы, а зь іх асабліва суфіксы (наросткі), маюць вялікае значаньне ў мове, зь іх помачай твораціца новыя словы.

У словатворсьцьве афіксы маюць падвойнае значаньне:

1. У вадных прыпадках яны не мяняюць асноўнага значань-

ня слова, але толькі дадаюць яму новае адценьне. Прыкладам: **дом — дамок, галава — галованька, чорны — чарнюсенькі, чытаць — пачытаць.**

2. У другіх прыпадках яны зусім мяняюць асноўнае значаньне слова, ствараючы сваім прыдаткавым значаньням чыста новае паймо. Пркл.: **страва — страўня, ляжаць — ложак, ноч — начулішча, сьпець — засьпець.**

Адныя суфіксы бываюць у спакменьнікаў, іншыя ў прыметнікаў, яшчэ іншыя ў дзеясловаў.

§ 149. Суфіксы спакменьнікавыя.

З паміж наросткаў найбалей ёсьцека спакменьнікавых, знач. такіх, што, даданыя да асновы, твораць спакменьнікі. Наросткі адначасна азначаюць род спакменьнікаў; адныя бываюць у спакменьнікаў мужчынскага роду, другія ў спакменьнікаў жаноцкіх, іншыя ў ніякіх.

Вось некаторыя наросткі **спакменьнікаў мужчынскіх: -ар:** чыт-ар, стал-яр, піс-ар, дуд-ар, ганч-ар, мук-ар, махл-яр, знах-ар, валад-ар, гаспад-ар, спад-ар, гадзіньнік-ар; **-ыр:** паст-ыр, павад-ыр, правад-ыр; **-іт:** сяўб-іт, малацьб-іт, касьб-іт, аральб-іт, даўжб-іт; **-цель:** вучы-цель, прыя-цель, ствары-цель, узгадава-цель, кармі-цель; **-ач:** сяк-ач (што сячэ лес), ткач; **-ец (-эц):** страл-ец, куп-ец, тр-эц, гул-ец, ігр-эц, крав-ец, шав-ец.

Усе шэсьць менаваных наросткаў абазначаюць дзеючую асобу, але з наросткам **-ыр** ёсьць спакменьнікі й накшага значаньня, пркл. **вадыр** (скула з вадкім возалкам), спакменьнікі на **-ач** і **-ец** абазначаюць таксама снадзівы — сяк-ач, скар-ач, вал-ец, пал-ец.

Апошнія 4 суфіксы дадаюцца да асноваў, абазначаючых дзеяньне.

Назовы дзеючых асобаў творацца таксама наросткам **-ік** (ад прыметнікаў — **верн-ік, грэшн-ік)** і **-нік** (возь-нік, работ-нік, крыўд-нік).

Наростак **-анін** (націск на **-нін)** абазначае жыхараў якой мясцовасьці, рэдчас назовы народаў, вернікаў: Палач-анін, Смальн-янін, мешч-анін, двар-анін, Крывіч-анін, хрысьц-янін, мусульм-анін і інш.

Значаньне паходжаньня маюць наросткі **-іч, -овіч, -евіч:** Смол-іч, Савін-іч, Пятр-овіч, Міцк-евіч, Сянк-евіч.

Наросткам **-анок, -янок** (або **-онак, -ёнак)** творацца назовы сыноў, а зь іх прозьвішчы: кавал-янок, Чарн-янок, Кас-янок, Тур-анок, Зубоўшч-анак, Іваноўшч-анак.

Назовы сыноў творацца таксама наросткамі **-ік, ык:** Пяткевіч-ык.

З наросткаў жаноцкіх спакменьнікаў адцемім **-іха** (па за-

цьвярдзелых **-ыха)**, з помачай якога творацца ад назоваў мужчынаў назовы жанок. Прыкл.: брат — **брац-іха** (братняя жонка), Антон — Антон-іха, Сідаровіч — Сідаровічыха. Даўней гэтак тварыліся назовы кажнае жонкі (жанчыны), а цяпер адно замужкі, а назовы дзяўчат творацца наросткам **-ішка, -ышка** (Антон-ішка, Сідаровіч-ышка, Зубоўшч-ышка), або **-анка, -янка** (Якуб-янка, Карал-янка, Сідаровіч-анка, Зубоўшч-анка (ад Зубоўскі). Назоў на **-ішка, -ышка** можа быць ужыты і ў дачыненьню да замужкі, калі маюць наўвеце ейнае дзявоцкае паходжаньне, прыкл.: **Наста Сідаровіч-анка (-ышка) Гаўрыловіч-ыха,** г. зн., што Наста жонка Гаўрыловічава, ■ дачка Сідаровічава.

Ветлых зьвярненьняў па бацьку, як расійскае **Іван Іванавіч, Мархва Іванаўна** і да г. п., у крывіцкай мове нямашака.

-ба (сяў-ба, малаць-ба, садзь-ба, ар-ба, вараж-ба), абазначае дзеяньне, але з часам некаторыя словы з гэтым наросткам прыймаюць значаньне рэчы, прыкл.: **садзьба** значыць яшчэ тое, што садзіцца (бульба, буракі і пад., што садзяць), **сяўба** (збожжа і іншае сеіць), **ганьба.**

Е вялікая група спакменьнікаў жаноцкага роду на **-іня** (па зацьвярдзелых сугуках на **-ыня)** з націскам на канцы ў вадз. ліку: астрыня, ямчыня, бальшыня, быстрыня, блізіня, брыдчыня, велічыня, вышыня, вузіня, гарачыня, глыбіня, гусьціня, дабрыня, даражыня, далячыня, даўжыня, дзічыня (у значаньню абстрактным, а ў значаньню »мяса дзікіх птушкаў« — дзічына), лягчыня, макрыня, мацніня, мякчыня, меншыня, нізіня, прасьціня, пяршыня (прыкладам: Гэта мне не пяршыня), саладзіня, сыціня, шыбчыня, шырыня, таўсьціня, таўшчыня, харашыня, цьвярдзіня, ціхіня, цішыня, чысьціня а інш. Усі гэтыя спакменьнікі разумовыя (абстрактныя). Зь неабстрактных із гэтымжа суфіксам і націскам ё **старшыня,** а із суфіксам **-ыня — пустыня.** Побач із менаванымі ё спакменьнікі чуцьцявыя (значыцца, абазначаючыя спакмяні, што мы пазнаём нашымі чуцьцямі) на **-іна:** раўніна, даліна́, нізіна, лагчына, дубіна, пярына, пяршына (першы раз робленае поле), — усі з націскам на канцы ў вадз. ліку.

Націск на канцы ў вадз. ліку маюць таксама **навіна, старына, дурніна.**

Вельмі шмат ё жаноцкіх спакменьнікаў на **-іна,** абазначаючых адзінку, адзінасьць: аглабліна, галіна, збажына, жардзіна, каніна, лазіна, ліпіна, ляйчына, лясіна, людзіна (чалавек, як мужчына, так і жанчына, бяз розьніцы), палатніна, рызіна, судзіна, сьцябліна, сяніна, шраціна, тканіна, травіна, трысьніна, трысьціна, тычына і інш. — з націскам на канцы ў вадз. ліку. Меней ё словаў гэтае-ж хормы й значаньня з націскам на асно-

ве: бульбіна, бярэзіна, жывёліна, рыбіна, саломіна, хамуціна, чароціна а інш.

З наросткаў **спакменьнікаў ніякіх** адцемім **-ішча,** што абазначае месца, дзе штось ёсьць, або было: вогнішча, дворышча, гумнішча, гліньнішча, аўсяньнішча, аржышча, ляньнішча і да г. п.[1]).

§ 150. Суфіксы прыметнікавыя. Пералічым некаторыя зь іх: к, ок, р, л, н, ов, ав, ів, ат, ск, ан (ян), (мяк-к-і, шыр-ок-і, доб-р-ы, кіс-л-ы, вет-л-ы, грэш-н-ы, люб-ов-ы, ласк-ав-ы, любів-ы, міласьц-ів-ы, зуб-ат-ы, гаспадар-ск-і, шкл-ян-ы, саламян-ы[1]).

§ 151. Складаныя словы. У крывіцкай мове ёсьць ладне складаных словаў, знач. словаў, маючых два карані. Вось колькі зь іх: Усяслаў, Брачыслаў, скалазуб, сухастой, Сухалет (прозьвішча), прайдзісьвет, крутадух, дабранач, Вялікдзень, баранавалок, другадзень (аўторак), узьвей-вецер, пакаці-гарошак, душаемца, спадкаемца, кураводка, даўганогі, дабрародны, чужапольны, чужаземны.

Зацемка. Калі першай часьцю складанага слова ё лічнікі **два, тры, пяць** і г. д., дык яны маюць хорму **дву-, тры-, пяці-**шаемца, спадкаемца, кураводка, даўганові, дабрародны, чужапольны, чужаземны.

---

[1]) Наросткі зьмяншальных а любасных спакменьнікаў разгледжаны ў § 73 (»Хормы зьмяншальных а любасных спакменьнікаў«), а зьмяншальных, павялічальных а любасных прыметнікаў у § 108 (»Прыметнікі зьмяншальныя, павялічальныя й любасныя«). Некаторыя наросткі разгледжаныя ў § 74 (»Некаторыя асаблівасьці спакменьнікаў«).

ЗЬМЕСТ

Часьць I. — Склады, гукі й літары.

Бач.

Кірылічная абэцада 4
Гукі й літары 5
Кірылічная абэцада з парадку 5
Лацінічная абэцада з парадку 6
Гукі **дз** й **дж** 6

Гукі й склады.

Склады, гукі 7
Перанос слова . . . . 8 й 119
Цьвярдыя й мяккія сугукі 9
Мяккі **ь** 10
Сугукі перад **і, я, е, ё, ю** 10
Склады ja, je, jo, jу, ji 11
Гукі **і, й; у, ў** 12
Мяккі знак **ь** а значок ’ уверсе 13

Часьць II. — Навука аб гуках і правапіс.

Калі пісаць вялікія літары 16
Знакі прыпынку 17
Сугалосныя й безгалосыя сугукі 19
П — б (20), т —д (21), х — г (23), с — з (24), ш — ж (25), сь — зь (26), ц — дз (27), ць — дзь (27)
Цеканьне й дзеканьне 29
Зацьвярдзелыя сугукі 31
Зацьвярдзелае **р** (31); сугукі **дж, ж, ч, ш** (31); цьвярдое **ц**(32)

Аканьне.

Націск (32); пераход ненац. **о ў а** 33
Пераход ненац. **э ў а** па цьвярдых сугуках . . . 33
Пераход ненац. **е ў я** 34
Вусьняныя сугукі б, п, м перад ј а на канцы складу 37
Зьмякчэньне сугукаў перад мяккімі сугукамі а перад ј 38
Зьмякчэньне **з, с** перад мяккімі сугукамі а перад ј (38); **ц** перад мяккім сугукам (39); падвойныя мяккія сугукі (40)
Зьмены паміж словаў і на пачатку словаў
Прыстаўное **в** перад **о** 40
Прыстаўное **в** перад **а** 41
Прыстаўное **в** перад **у** 42
Прыстаўное **ј** перад **і** 43
У а **ў** стаячыя асобна й на пачатку слова . . . 43
Пераход **і ў й** 44
Прыстаўное **і** 45

Часьць III. — Скланеньні.

Бач.

Спакмень 48
Спакмяні чуцьцявыя. 49
Спакмяні разумовыя 50
Собскія ймёны 51
Рады спакменьнікаў 51
Спакменьнікі зьменшаныя й любасныя 53
Хормы зьменшаных а любасных спакменьнікаў . . 55
Некаторыя асаблівасьці спакменьнікаў 58
Лікі спакменьнікаў 58
Склоны спакменьнікаў 60

Скланеньне I.

А. **Спакменьнікі мужчынскага роду** 62
Пробкі I. скланеньня спакменьнікаў мужчынскага роду 62
Зацемкі да асобных склонаў 64
Зацемкі да розных склонаў 68
Скланеньне спакменьнікаў **абраз, галуб, сакол, цыган** 70
Скланеньне спакменьнікаў **ацец** і **маладзец** . . . 70
Скланеньне спакменьнікаў **лоб, лён, леў, мох, назоў, рот, лёд, роў** 71
Скланеньне спакменьнікаў **грэбень, камень, карэнь, крэмень, рэмень** 72
Скланеньне спакменьнікаў на **-ец** із папярэднім **-л-** (палец і пад.) 72
Скланеньне спакменьнікаў на **-вец, -лец, -рэц** із папярэднім сугукам **(круглец, мудрэц** і пад.) . . 73
Скланеньне спакменьнікаў на **-рок** із папярэднім сугукам **(мудрок)** 74
Спакменьнікі на **-анін (хрысьцянін** і пад.) . . . 74
Б. **Спакменьнікі ніякага роду** 75
Зацемкі да канчаткаў розных склонаў 75
Скланеньне спакменьнікаў **вока, вуха, плячо, неба, чуда;** спакм. на **-цо, -ца (памялцо, колца),** на **-ство; -ства (круцелства)** 77
Парны лік. 77
Зборныя спакменьнікі на **-е, -ё, -о(-а)** 77

Скланеньне II.

Зразы скланеньня спакм. жан. роду II. скланеньня 81
Агульныя зацемкі аб некаторых спакм. II. скланеньня 83
Зацемкі аб канчатках розных склонаў спакм. II. склан. 84
Парны лік. 85
Належачыя да II. скл. спакм. мужч. роду 86

Скланеньне III.

Агульныя зацемкі 88
Зацемкі да канчаткаў розных склонаў 89
Чацьвертае скланеньне спакменных імёнаў . . . 91
V. скланеньне спакменных імёнаў 91

Прыметнік.

Род прыметнікаў 93
Нацiск некаторых прыметнікаў 94
Адно **н** а два **нн** у прыметніках 95
Прыметнікі зьмяншальныя, павялічальныя й любасныя 95

Бач.
Ступені прыраўнаньня прыметнікаў 96
Прыналежныя прыметнікі 98
Дачынныя прыметнікі 98
Скланеньне прыметнікаў 99
Зацемкі да асобных склонаў 101
Прыметнікі кароткія 102
Прыналежныя прыметнікі на -оў, -еў, -ін . . . 103
Прозьвішчы на -оў (-аў), -еў (-ёў), -ін (ын) . . . 104
Прыметнікі із значаньням спакменьнікавым . . 104
Спакменьнікі на -істы 105
Лічнік.
Табліца лічнікаў 106
Націск лічнікаў 107
Лічнікі зборныя й драбовыя, агуль. й кольказразовыя 107
Скланеньне лічнікаў 107
Адзін, адна, адно; два, дзьве 108
Абодва, абедзьве; абое, двое; тры, чатыры . . . 109
Пяць — трыццаць 109
Сорак, сто; тысяча 110
Займёны.
Разьдзел займёнаў 111
Скланеньне займёнаў 114
„ я, ты, сябе; ён 114
„ мой, твой, свой, чый; тый, сам; увесь . . 115
„ хто, што; ніхто, нішто; Ваша, Вашаць, Вашэця 116
Зацемкі да скланеньня засталых займёнаў . . . 117
Будоўля словаў.
Аснова й канчатак 117
Карэнь слова 118
Афіксы (прэфіксы й суфіксы) 119
Значаньне суфіксаў 119
Суфіксы спакменьнікавыя й прыметнікавыя . . 120
Складаныя словы 122

ІНШЫЯ КНІЖКІ ТАГО-Ж АУТАРА:

Апытаньнік да зьбіраньня дыялектычных і некаторых агульных асабліваcьцяў беларускага (крывіцкага) языка. Вільня 1935.

Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёґічны і прыказкаў ды прывітаньні, зычэньні і інш. Менск 1944.

Родная мова № 1—2, 3—4, 5, 6. Вільня 1930.

Нашто й як зьбіраці ґеоґрафічныя й асобавыя назовы беларускія. Вільня 1931.

Вонкашная гісторыя крывіцкае мовы. Вільня 1938.

Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацініцаю. Менск 1943.

Лемантар пераходны з лацініцы на кірыліцу. Менск 1941.

Падручнік крывіцкае (беларускае) мовы, граматыка, правапіс, укладаньні, прытарнаваныя вучыцца ў школе й дома. Часьць IV—V. (гатовы да друку).

Алькітаб Крывіцкага музэю Йвана Луцкевіча ў Вільні, т. І. тэкст; т. II. **ґраматычны разгляд мовы** (гатовыя да друку).

Крывіцка-маскоўскі слоўнік (гатуецца да друку).